Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 50 (4493) 12 снежня 2008 г.

У нумары:

Дбаць пра дзяцей

Пашыранае пасяджэнне праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі — імпульс адчувальны.

Стар. 3

Добрая школа для пісьменнікаў

Ці будзе адноўлена Бюро прапаганды мастацкай літаратуры?

Стар. 4

Мара пра бессмяротнасць

Знаёмцеся: лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры ў 2008 годзе француз Ж-М. Г. Леклезіо.

Стар. 12

Уладзімір Караткевіч і Беларускае радыё

Звыш 50-і мастацкіх і дакументальных радыёпраграм!

Стар. 13

Зорка з Жабінкі

Чарговы выпуск рубрыкі «Суайчыннікі ў свеце».

Стар. 15

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 7390 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 9580 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 4950 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі:
1 месяц — 7500 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

У рознагалоссі колішняй савецкай эстрады яго аксамітны барытон вылучаўся асаблівай душэўнай глыбінёй, непаўторнымі маляўнічымі абертонамі, у якіх адчуваліся мужнасць і моц, пяшчота і шчырасць. Голас Віктара Вуячыча ведалі, слухалі, любілі далёка за межамі Беларусі. Для многіх тысяч аматараў песні гэты артыст, чыё зямное жыццё спынілася на парозе новага стагоддзя, быў сапраўдным кумірам... Быў? Не, пра спеўны дар Віктара Вуячыча нельга казаць у мінулым часе, бо гэты голас арганічна жыве ў музычным асяроддзі нашых дзён, упрыгожвае радыёэфір і нават натхняе на новыя творчыя праекты.

Голас памятнага часу

Музыканты Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча на чале з маэстра Міхасём Казінцом наладзілі на мінулым тыдні незвычайную вечарыну. Гэта быў яскравы канцэрт-успамін пра народнага артыста Беларусі Віктара Вуячыча, песні з рэпертуару якога гучалі ў выкананні прызнаных майстроў айчыннай эстрады і маладых салістаў. Дарэчы, радок адной з такіх вядомых песень стаўся назвай усёй праграмы: "Я прыйду...".

Усіх удзельнікаў канцэрта цяжка пералічыць: Ірына Дарафеева, Анатоль Ярмоленка, Якаў Навуменка, Алег Сямёнаў, Нэлі Багуслаўская, многія іншыя выканаўцы, з якімі Віктар Вуячыч сябраваў, супрацоўнічаў, якіх у свой час падтрымаў сваім аўтарытэтным словам. Выйсці ў той вечар на сцэну Беларускай дзяржаўнай філармоніі рыхтаваўся і знакаміты госць — народны артыст СССР Іосіф Кабзон. Мала хто ведае, што ён ужо нават прыляцеў з Масквы, але з-за неспрыяльнага надвор'я самалёту адмовілі ў пасадцы. Вярнуўшыся ў Шарамецьева, спявак яшчэ доўгі час не пакідаў аэрапорт у чаканні наступнага рэйсу на Мінск, але ўрэшце візіт давялося адмяніць. Дакладней, перанесці на іншы час, бо Іосіф Кабзон мае намер выступіць у Мінску з канцэртам памяці свайго калегі і сябра.

А калісьці ж яны былі і сапернікамі! У 1966 годзе абодва ўдзельнічалі ва Усесаюзным конкурсе на лепшае выкананне савецкай песні, які праходзіў у Маскве, і пераможцам стаў Віктар Вуячыч. Праз год беларускі барытон атрымаў 2-ю прэмію на Міжнародным конкурсе эстраднай песні "Залаты Арфей" у Балгарыі. Вялікі спецыяльны прыз Міжнароднага фестывалю сучаснай эстраднай песні прывёз Віктар Лук'янавіч у 1973 годзе з Токіо — за выкананне "Спадчыны" Ігара Лучанка на верш Янкі Купалы...

Колькі яшчэ яркіх фактаў можна ўспомніць, распавядаючы пра творчую біяграфію Віктара Вуячыча! Абвяргаючы, здавалася б, неаспрэчную думку пра "кароткі век" спевакоў на эстрадзе, ён амаль да апошніх дзён, змагаючыся з цяжкай хваробай, не пакідаў сцэну. Спяваў толькі "жывым гукам". Трымаўся з годнасцю. Патрабавальны да сябе, строгі ў выбары рэпертуару, элегантны артыст з бескампрамісным мастацкім густам. Майстар беларускай эстрады, чый голас увабраў у сябе гучанне мінулага і непаўторнага часу — часу высокіх стандартаў у песеннай творчасці...

Лана ІВАНОВА

На здымку: успамінамі пра Віктара Вуячыча падзяліўся народны артыст СССР кампазітар Ігар Лучанок.

Фота Кастуся Дробава

125-гадовы юбілей адзначае шклозавод "Нёман" — адно з самых вядомых мастацкіх прадпрыемстваў Беларусі. З гэтай нагоды ў Мінску ўпершыню праходзіць выстава прадукцыі, што была выраблена на заводзе майстрамі-гутнікамі за апошнія восем дзесяцігоддзяў.

Таямніцы мастацкага шкла

Вытворчасцю вырабаў са шкла чалавецтва займаецца вось ужо больш як пяць тысяч гадоў, аднак і сёння гэты матэрыял утойвае ў сабе мноства загадак. Навукоўцы з усяго свету дагэтуль не могуць зразумець, якім чынам шкляныя матэрыялы фізічна пераходзяць ад расплаўленага стану да цвёрдага, а хімікі наогул адносяць шкло да разраду вадкасцяў. Пагаворваюць нават, што разгадка таямніцы шкла "цягне" на Нобелеўскую прэмію.

Аднак акрамя посуду і іншых прадметаў побыту са шкла можна вырабляць дзівосныя па прыгажосці творы мастацтва. Са шматлікімі шэдэўрамі, створанымі майстрамі-гутнікамі, мінчане і госці сталіцы знаёмяцца на выставе "Свет шкла", прымеркаванай да 125-й гадавіны з часу заснавання шклозавода "Нёман" у мястэчку Бярозаўка на Гродзеншчыне.

Гэтая выстава разгарнулася ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі і ўключае ў сябе каля 300 экспанатаў, створаных майстрамі з Бярозаўкі. Супрацоўнікі завода шкадуюць, што не давялося паказаць у сталіцы поўную калекцыю цудоўных вырабаў, якая захоўваецца ў заводскім музеі і налічвае больш як тры тысячы асобнікаў — прадметаў з каляровага і бясколернага шкла і крышталю, якія дзякуючы творчаму падыходу мастакоў і майстроў з завода "Нёман" здатныя перадаваць думкі, жаданні, пачуцці... У Мінску выстаўлены найбольш прыгожыя аўтарскія кампазіцыі, створаныя на заводзе ў перыяд з 1930 года па сённяшні дзень.

Асаблівасці матэрыялу дазваляюць майстрам у непаўторным стылі рэалізоўваць свае задумкі, якія ў іншых відах мастацтва рэалізаваць проста немагчыма. Адзін з мэтраў гутнай справы, мастак Васіль Самахвалаў падчас цырымоніі адкрыцця выставы звярнуў увагу на унікальнасць гутніцтва: менавіта тут дзіўным чынам пераплецены тэхналогія і мастацтва. Акрамя таго, не абысціся без уменя працаваць у камандзе, бо для паспяховага выканання праекта неабходна поўнае паразуменне паміж мастаком, у галаве якога гэты праект зараджаецца, і майстрам-гутнікам — непасрэдным выканаўцам задумак мастака.

Наведнікі выставы да 10 студзеня могуць падзівіцца на самыя адметныя вырабы з калекцыі мастацкай лабараторыі завода: крышталь ныя і шкляныя расліны, фігуркі жывёл, вазы, кубкі, куфлі... Генеральны дырэктар ААТ "Нёман" Ігар Бацян паабяцаў, што ўсе гэтыя экспанаты застануцца ва ўласнасці Нацыянальнага мастацкага музея.

Алег МАЛЕВІЧ

Фота Кастуся Дробава

Пункцірам

* * *

Адзіны інфармацыйны цэнтр па вывучэнні спадчыны роду Радзівілаў будзе створаны ў нашай краіне. Аб гэтым дамовіліся архівісты і бібліятэкары з Беларусі, Фінляндыі, Літвы, Польшчы, Германіі, Украіны і Расіі на сумеснай сустрэчы. У лічбавым выглядзе будуць прадстаўлены дакументы і кнігі, якія датычацца роду Радзівілаў. Рэалізацыя падобнага праекта дасць магчымасць вялікай колькасці гісторыкаў атрымаць доступ да архіваў Масквы, Санкт-Пецярбурга, Хельсінкі, Варшавы...

* * *

8 снежня ў Кіеве ў нацыянальным палацы "Украіна" адбыўся канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі. Канцэрт прайшоў у рамках грамадска-культурнай акцыі "Мы — беларусы!". Сярод удзельнікаў былі тэатр песні Ірыны Дарафеевай, Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, Пётр Ялфімаў, Ксенія Сітнік, Андрэй Кунец, ансамблі "Харошкі", "Песняры", "Сябры", гурт "Палац" і іншыя.

Канцэрт ва Украіне стаў завяршаючым акордам акцыі, якая распачалася сёлета ў сакавіку. За гэты час прайшлі дзесяткі канцэртаў па ўсёй краіне і за яе межамі. У рамках акцыі адбыліся таксама выставы, гастролі тэатральных калектываў.

* * *

На працягу наступнага года павінна быць падрыхтавана дасье для ўнясення Гомельскага палаца-паркавага ансамбля Румянцавых-Паскевічаў у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Перадаць дасье ў гэтую ўстанову плануецца ў пачатку 2010 года.

Гомельскі палаца-паркавы ансамбль з'яўляецца помнікам архітэктуры і мастацтва канца XVIII — другой паловы XIX стагоддзяў. У 2004 годзе была завершана поўная рэстаўрацыя палаца. Наступным аб'ектам ансамбля для рэстаўрацыі выбраны магільны склеп княжацкай сям'і Паскевічаў. На чарзе яшчэ знаходзіцца сабор святых Пятра і Паўла і набярэжная.

* * *

У сталічным Палацы мастацтва прайшло штогадовае ўручэнне прэміі "Залаты апостраф". Прэмія заснавана ў 2003 годзе літаратурна-мастацкім часопісам "Дзеяслоў".

Сёлетнімі лаўрэатамі сталі: у намінацыі "Дэбют" — паэтка Ірына Бельская, "Паэзія" — Андрэй Хадановіч, "Проза" — Кастусь Тарасаў. Сярод сёлетніх намінантаў былі таксама Альгерд Бахарэвіч, Юры Станкевіч, Людміла Сільнова, Сяржук Сыс, Дар'я Ліс, Наталля Харытанюк. Трэба адзначыць, што пры вылучэнні лаўрэатаў "Залатога апострафа" стаўка робіцца на неадзначаных раней іншымі літаратурнымі прэміямі. Так, за пяць гадоў прэміяй былі адзначаны Усевалад Сцебурака, Леанід Дранько-Майсюк, Вольга Іпатава, Алесь Пісьмянкоў, Алесь Бадак і іншыя.

* * *

Еўракамісія заснавала прэмію Еўрапейскага Саюза ў галіне сучаснай літаратуры. Мэта прэміі — засяродзіць увагу на разнастайнасці і творчым багацці сённяшняй еўрапейскай літаратуры.

Першая прэмія разам з прэміяй маладым талентам будзе ўручана восенню 2009 года. Акрамя гэтага, штогадова з ліку вядомых літаратараў будзе выбірацца еўрапейскі літаратурны пасол. Выбіраць кандыдатаў і арганізоўваць цырымонію ўзнагароджвання будзе кансорцыум, у які ўвайшлі Еўрапейская федэрацыя кнігагандлю, Еўрапейскі кангрэс пісьменнікаў, Федэрацыя еўрапейскіх выдаўцоў.

Падрыхтаваў Павел РАДЫНА

Выстаўкі

У Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі прайшла выстаўка "Пётр Ільіч Чайкоўскі. Выбраныя старонкі жыцця і творчасці".

Нагадалі пра Чайкоўскага

Пра выдатнага класіка музычнага мастацтва нагадала экспазіцыя рэліквій з фондаў Дзяржаўнага дома-музея П. Чайкоўскага ў горадзе Клін (Расія). У Мінск прыбылі унікальныя экспанаты. Сярод іх — кнігі, ноты з бібліятэкі кампазітара, фрагменты яго рукапісаў, фатаграфіі, з якіх найбольш каштоўным лічыцца здымак, зроблены ў апошні год жыцця П. Чайкоўскага. Шырока былі прадстаўлены яго асабістыя рэчы: цыліндр, набыты ў Лондане, французскія пальчаткі, дырыжорская палачка, дарожны куфар ды інш. Сапраўдным рарытэтам лічацца Біблія на французскай і Новы запавет на стараслав'янскай ды рускай мовах — кнігі, якія належалі маці кампазітара. Экспазіцыя ўключала ў сябе таксама эскізы дэкарацый і касцюмаў да опер і балетаў П. Чайкоўскага.

Ілона КУПРЭЙЧЫК
Фота Віктара Кавалёва

Сапраўды — спадарожнік

У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылося адкрыццё новай выставы "Спадарожнікі дзяцінства". Падрыхтавала выставу супрацоўнік музея Наталля Настасіч і мастак Генадзь Чысціч.

У невялікай зале панавала весялосць і радасць. Тут былі маленькія чытачы дзіцячых выданняў — газеты "Зорька", часопісаў "Вясёлка", "Бярозка" і інш. Гледачоў прывітала дырэктар музея Л. Макарэвіч, яна распавяла пра тое, як ствараласа выстава і як збіраліся матэрыялы для яе. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Валянцін Лукша сказаў, што па сутнасці амаль усе пісьменнікі "родам" з дзіцячай прэсы, там пачыналі свой творчы шлях. Паважаны госць са скрухай прыгадаў ранейшыя тыражы дзіцячых кніг, яны былі ў дзесяткі і сотні разоў вышэй за сённяшнія. Напрыканцы Валянцін Лукша прачытаў адзін са сваіх вершаў і пажадаў, каб дзеці не забывалі беларускія выданні і беларускую культуру.

Адказны сакратар газеты "Зорька" Вольга Аляксандрава павяла гаворку пра гісторыю свайго выдання, якое ў 2010 годзе адзначыць 65-годдзе.

Супрацоўніца музея Наталля Настасіч "ажывіла" героя кніжкі Уладзіміра Ліпскага "Прыгоды Нуліка" Міколку, а з яе дапамогай маленькія гледачы — самога Нуліка. Дзеці былі вельмі задаволены гульнёй, а таксама самой выставай, дзе было шмат цікавостак. Напрыклад, старыя мадэлі тэлевізараў, цацкі, патэфон з дзіцячымі кружэлкамі, даўнія нумары беларускіх часопісаў "Зоркі", "Лучынка", "Беларускі піянер". Ёсць на выставе і сучасныя беларускія дзіцячыя газеты і часопісы, а таксама асабістыя рэчы і рукапісы Васіля Віткі, Алеся Якімовіча і Алеся Пальчэўскага.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Сустрэчы

Апладзіраваў «Атлант»

Запомнілася супрацоўнікам Мінскага завода халадзільнікаў ЗАТ "Атлант" нядаўняя творчая сустрэча з народным артыстам Рэспублікі Беларусь, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта краіны ў галіне тэатральнага мастацтва, майстрам сцэны і кіно Генадзем Гарбукам.

Менавіта з яго ролей у кіно і тэатры пачыналася для многіх атлантаўцаў знаёмства з шэдэўрамі беларускай класічнай літаратуры XX стагоддзя. Успомніць хоць бы знакавую ролю Васіля Дзятліка, якую Генадзь Гарбук выканаў у тэлевізійным спектаклі паводле рамана І. Мележа "Людзі на балоце". Дарэчы, менавіта за гэты вобраз у 1966 годзе Генадзь Міхайлавіч быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР.

Пра родную старонку артыста — вёску Глыбочка Ушацкага раёна Віцебскай вобласці, пра цяжкія гады дзяцінства ў Браславе, пра вучобу ў школе і першыя сцэнічныя вопыты, вучобу ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце і цікавыя факты з багатага творчага жыцця Генадзя Міхайлавіча даведаліся прысутныя на сустрэчы ў заводскім клубе. Але акцэнт у сваім расповедзе Г. Гарбук зрабіў на гадах ваеннага ліхалецця, патлумачыўшы: "Вайна пакінула вельмі балючы след у Беларусі і памяць пра тыя ваенныя гады будзе жыць сярод народа яшчэ доўга. І нам забываць урокі мінулай вайны нельга!" Ён выканаў некалькі песень ваенных гадоў. Асабліва душэўна прагучала знакамітая "Враги сожгли родную хату". Акампанавалі артысту цудоўныя інструменталісты: штатны сурацоўнік клуба МЗХ С. Баевіч разам з гасцямі Г. Вішняковым, Л. Клунным, Ю. Хілаўцом.

Старшыня прафкама МЗХ ЗАТ "Атлант" Валерый Нікаленка выказаў Генадзю Гарбуку шчырыя словы падзякі за цудоўныя спевы, за душу, якую ўкладвае артыст у сваю творчасць, за талент, які столькі гадоў служыць беларускаму народу. "Віцебскія — хлопцы някепскія!" — нагадаў Валерый Аляксандравіч народную прымаўку, слушнасць якой "пацвердзілі" апладысменты атлантаўцаў.

Генадзь Міхайлавіч яшчэ даволі доўга адказваў на разнастайныя пытанні завадчан, даваў аўтографы аматарам тэатральнага мастацтва з Мінскага завода халадзільнікаў...

Антоль МЯЛЬГУЙ
Фота аўтара

Вечарыны

У Доме дружбы прайшоў юбілейны вечар празаіка, перакладчыка, журналіста, дзяржаўнага дзеяча Анатоля Бутэвіча пад назвай "60 гадоў пад небам беларускага слова".

Пад небам беларускага слова

Павіншаваць пісьменніка прыйшло шмат вядомых людзей — літаратары, артысты, навукоўцы, дырэктары музеяў, былыя і дзеючыя прадстаўнікі міністэрстваў і пасольстваў, усе тыя, дзякуючы каму, паводле А. Бутэвіча, ён дасягнуў сённяшніх вышыняў.

"Я нарадзіўся сярод поля, сярод сапраўднага мора з жыта і валошак... — распачаў А. Бутэвіч экскурс у мінулае. Прыгадваў пісьменнік паступленне на філфак БДУ і пакой у інтэрнаце на Паркавай, у якім жыў разам з Мар'янам Дуксам і дзе ўвесь час збіраліся творцы ды за "кубкам гарбаты" вялі гарачыя спрэчкі пра літаратуру, прыгадваў бліскучы склад выкладчыкаў — Алесь Адамовіч, Ніл Гілевіч, Алег Лойка, Дзмітрый Бугаёў, Міхась Ларчанка, дзякуючы якім філфак быў сапраўднай літаратурнай школай. А пасля — размеркаванне ў інфармацыйнае агенцтва БелТА, праца ў рэдакцыі газеты "Чырвоная змена", у ЦК КПБ.

Усе выступоўцы — паэты Леанід Дранько-Майсюк, Генадзь Бураўкін, навукоўца Адам Мальдзіс, Надзвычайны Паўнамоцны Пасол Украіны ў Беларусі Дзмітры Ліхавы — адзначалі шматаблічнасць героя вечара, які здолеў раскрыцца ў многіх ролях — пісьменніка, чыноўніка, краязнаўцы, дыпламата, міністра, дырэктара выдавецтва, журналіста.

Намеснік міністра інфармацыі Ігар Лапцёнак згадаў: "Калі А. Бутэвіч узначальваў Міністэрства культуры і друку, то нам пашчасціла быць аднымі з першых стваральнікаў нацыянальнага падручніка для сярэдняй школы". І. Лапцёнак уручыў юбіляру грамату Міністэрства інфармацыі краіны з падзякай "за значны ўклад у развіццё беларускага кнігавыдання і плённую літаратурную дзейнасць".

Ад Беларускага саюза журналістаў А. Бутэвіч атрымаў пасведчанне аб прысваенні ганаровага звання "Заслужаны журналіст БСЖ".

Саша ДОРСКАЯ

Сувязі

Непадуладнае часу

Адкрываць невядомыя імёны — заўсёды цікава і карысна. Неацэнную дапамогу ў гэтым аказвае Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. На гэты раз сустрэча ў Доме дружбы была прысвечаная класіку малдаўскай літаратуры Васіле Аляксандры.

Ушанаваць памяць вядомага паэта сабралася не толькі малдаўская дыяспара, але і многія беларусы — прыхільнікі творчасці класіка. Адкрыў імпрэзу Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Малдова ў Беларусі Іван Філімон. Прысутныя даведаліся пра многія пакручастыя пуцявіны лёсу малдаўскага паэта, малавядомыя рысы яго неардынарнай асобы. Памяць пра Васіле Аляксандры ўшаноўваецца ў Малдове шырока: яго імем названыя школы, тэатры, а каля Нацыянальнай бібліятэкі ў Кішынёве ўсталяваны помнік класіку.

Следам за дыпламатам выступіў паэт і перакладчык Уладзімір Скарынкін, які з'яўляецца старшынёй таварыства "Беларусь—Малдова". Ён павёў гаворку пра гісторыю беларуска-малдаўскіх культурных зносін. Як вядома, за савецкім часам, многія малдаўскія пісьменнікі наведвалі нашу краіну. Паміж творцамі завязваліся сяброўскія сувязі і кантакты. Пазней на беларускай мове была выдадзеная грунтоўная "Анталогія малдаўскай паэзіі", куды, зразумела, увайшлі і творы Васіле Аляксандры. У. Скарынкін прачытаў адзін з уласных перакладаў вялікага малдаўскага паэта.

Адказны сакратар таварыства "Беларусь—Малдова" Таццяна Ласіцкая правяла невялікую літаратурна-музычную кампазіцыю, прысвечаную Васіле Аляксандры. Аповед пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка перамяжоўваўся з мастацкім чытаннем ягоных твораў, а таксама з яркімі малдаўскімі танцамі дуэта "Дружба" Жэнеты Дмітрыеску і Чэслава Глорыя. Беларускі бок адказаў выступленнем народнага ансамбля "Весялосць", які парадаваў беларусаў і малдаван архаічнымі палескімі спевамі пад акампанемент дудароў Вадзіма Дземідовіча і Аляксандра Рыцікава.

Імпрэза завяршылася мастацкім чытаннем твораў Васіле Аляксандры ў арыгінале — на малдаўскай мове.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Дбаць пра дзяцей – клапаціцца пра будучыню

Дзіцячая літаратура выступае арганічнай часткай літаратуры ўвогуле. Але яна мае і свае асаблівасці ды спецыфіку. Акрамя, як лічаць многія, забаўляльнасці, кнігі для маленькіх чытачоў павінны быць сродкам фарміравання асобы дзіцяці, яго асабістых якасцей, выхоўваць павагу і любоў, сумленне і патрыятызм.

Менавіта дзіцячая літаратура была абрана тэмай пашыранага пасяджэння праўлення грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі", якое нядаўна адбылося ў сталічным Доме літаратара. Сярод яго ўдзельнікаў — прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук, міністэрстваў інфармацыі і адукацыі нашай краіны, грамадскіх арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў, бібліятэк, СМІ і, канечне ж, самі пісьменнікі.

А распачалося мерапрыемства з прыемнага сюрпрызу: перад прысутнымі выступілі дырэктар фестывалю сучаснай хрысціянскай культуры "Благовест" Вячаслаў Бабкоў і пастаянны ўдзельнік і лаўрэат гэтага фестывалю — хор "Анима" філіяла мінскай дзіцячай музычнай школы № 19 для дзяцей з праблемамі зроку.

Ва ўступным слове старшыня СПБ Мікалай Чаргінец зазначыў: *"Пытанні, якія трэба разгледзець, — адны з важнейшых у развіцці дзяржавы і выхаванні падрастаючага пакалення"*.

Мікалай Іванавіч падкрэсліў, што пазбегнуць адмоўных паводзін у падлеткаў у дачыненні да грамадства можна толькі агульнымі намаганнямі — пісьменнікаў, грамадства, Праваслаўнай Царквы...

Старшыня секцыі дзіцячай літаратуры СПБ Валянцін Лукша адзначыў, што самае дарагое, што сёння мае цывілізаванае чалавецтва, — гэта дзеці. Клапаціцца і дбаць пра дзяцінства — значыць клапаціцца пра свой заўтрашні дзень, пра сваю будучыню. Творцы, раталі на ніве прыгожага пісьменства, ахвяруюць дзецям агонь уласных сэрцаў, плён сваіх пошукаў, цікавыя і захапляючыя кнігі. Кнігі, якія вучаць дабрыні, працавітасці, адданасці сваёй Бацькаўшчыне. Валянцін Антонавіч зрабіў экскурс у гісторыю станаўлення беларускай дзіцячай літаратуры, узгадваючы шматлікіх аўтараў, яркія і займальныя, гістарычныя і краязнаўчыя творы для юнацтва.

У сваім выступленні намеснік міністра адукацыі Беларусі Казімір Фарыно зрабіў акцэнт на тым, што выхаванне грамадзяніна ў сучаснай Беларусі, ад якога залежыць аўтарытэт нашай краіны ў свеце, немагчыма без яго эстэтычнай і маральнай адукацыі. Асабліва значнай бачыцца роля мастацкага слова ў нацыянальнай сістэме адукацыі і выхавання.

Вось чаму так важна супрацоўніцтва Міністэрства адукацыі і Саюза пісьменнікаў Беларусі. І гэта супрацоўніцтва з кожным годам умацоўваецца і пашыраецца.

Беларуская літаратура як вучэбны прадмет забяспечвае гарманічнае развіццё вучня на ўсіх ступенях школьнай адукацыі, фарміруе чалавека з глыбокімі маральна-этычнымі перакананнямі, дакладнай грамадзянскай пазіцыяй, творчым патэнцыялам. Таму вельмі важна, на якіх літаратурных творах адбываецца станаўленне асобы сённяшняга беларускага школьніка.

Намеснік міністра адукацыі К. Фарыно адзначыў, што апошнім часам распрацавана праграма дадатковых мер па пашырэнні выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі, якой прадугледжана адкрыццё беларускамоўных аддзяленняў, вучэбных груп у гуманітарных і тэхнічных ВНУ.

Галоўны рэдактар часопіса "Маладосць" Раіса Баравікова расказала пра беларускую дзіцячую літаратуру на літаратурнай карце свету, пісьменнік Алесь Савіцкі засяродзіўся на выхаванні патрыятызму праз творы для дзяцей, а галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка" Уладзімір Ліпскі акрэсліў ачольваемае ім выданне як творчую крыніцу для маленькіх чытачоў.

У сваю чаргу намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльна-культурнай сферы Савета Міністраў Беларусі Наталля Голубева распавяла пра перавыданне серыі "Школьная бібліятэка", дацэнт БДУКіМ Станіслаў Саладоўнікаў — пра дзіцячую літаратуру і асаблівасці фарміравання асобы, загадчык рэдакцыі літаратуры для дзяцей выдавецтва "Мастацкая літаратура" Алена Масла — пра ролю казкі ў выхаванні дзяцей.

Загадчык сектара літаратурнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Ірына Шаўлякова-Барзенка засяродзіла ўвагу прысутных на асаблівасцях літаратурнай адукацыі ў агульнаадукацыйных установах нашай краіны, а прадстаўнік Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк горада Мінска Анжаліка Карзанава выказалася пра больш цеснае супрацоўніцтва з пісьменнікамі. Таксама прапанаваў падпісаць дамову пра супрацоўніцтва Праваслаўнай Царквы і СПБ выканаўчы дырэктар Выдавецтва Беларускага Экзархата Уладзімір Грозаў.

Старшыні Віцебскага абласнога і Мінскага гарадскога аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Тамара Гусачэнка і Міхась Пазнякоў падзяліліся вопытам работы з маладымі аўтарамі па прапагандзе літаратуры для дзяцей і падлеткаў...

Быў абмеркаваны праект пастановы, у якім у прыватнасці адзначаецца: стварыць пры СПБ савет мастакоў дзіцячай кнігі, хадайнічаць перад Міністэрствам інфармацыі Беларусі аб аднаўленні выдання альманаха перакладной дзіцячай літаратуры "Ветразь", заснаваць прэмію СПБ імя Янкі Маўра за лепшую дзіцячую кнігу, РВУ "Літаратура і Мастацтва" сумесна з Міністэрствам адукацыі ўмацоўваць і пашыраць падпіску агульнаадукацыйных устаноў на літаратурна-мастацкія выданні...

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымках: падчас пашыранага пасяджэння Праўлення СПБ.

Фота Кастуся Дробава

Зразумела, што на працягу аднаго дня, калі адбывалася пашыранае пасяджэнне праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, дыскусія па тэме развіцця, традыцый беларускай літаратуры не вычарпалася. Карэспандэнты "ЛіМа" пацікавіліся, што ўсё ж найбольш хвалюе пісьменнікаў, творцаў, прадстаўнікоў дзяржаўных устаноў, міністэрстваў і ведамстваў краіны.

Ігар ЛАПЦЁНАК, намеснік міністра інфармацыі Беларусі:

— Суб'ектаў гаспадарання, якія займаюцца выпускам літаратуры, стала нібыта і больш, а кніг для дзяцей, на жаль, апошнім часам друкуецца менш. Калі раней існавала 10 дзяржаўных выдавецтваў, якія ў той ці іншай ступені займаліся выпускам дзіцячай літаратуры, то гэта істотна адчувалася. Адно толькі выдавецтва "Юнацтва" выдавала прыкладна 100—120 назваў кніг штогод агульным накладам да 100 000 экземпляраў. Але пасля 2000 года выдавецтва "Юнацтва" спыніла сваю дзейнасць.

Выдавецтва "Мастацкая літаратура", дзе працуе рэдакцыя дзіцячай літаратуры, сёння выдае 20-40 назваў у год, але тыраж кожнага выдання як правіла не перавышае трох тысяч экземпляраў.

Гаварыць пра аднаўленне выдавецтва"Юнацтва" — такая прапанова гучала на пасяджэнні — няпроста, бо трэба мець вялізныя абаротныя сродкі. Калі раней нашым рынкам быў літаральна ўвесь свет, нам заказвалі друкаванне літаратуры краіны Усходняй Еўропы, арабскія краіны (у Беларусі друкаваліся казкі на арабскай мове), то можна было неяк трымацца, павялічваць тыражы. Цяпер мы вымушаны самі забяспечваць сваю дзейнасць, разлічваць на свае сілы. Заказаў на ўвесь быльы Саюз у нас няма. А без пашыранага попыту немагчыма забяспечыць дзейнасць выдавецтваў.

Ёсць вялікая патрэба ў друкаванні серыі "Школьная бібліятэка". І мы рупімся, каб павялічваць заказы на тую літаратуру, якая ёсць. Але і тут свае праблемы. Да прыкладу, да 2003 года "Школьная бібліятэка" друкавалася па заяўках Міністэрства адукацыі Беларусі за сродкі дзяржбюджэту, і накіроўвалася ў школы, то сёння ўсё робіцца пераважна за кошт выдавецтва. Дзяржава толькі ўключае такія выданні ў спіс сацыяльна значнай літаратуры.

Ідэя выпуску дзіцячай літаратуры недзяржаўнымі выдавецтвамі, хаця б па адной кнізе ў год, неблагая: сёння ў нас 700 зарэгістраваных суб'ектаў гаспадарання, якія заняты выпускам літаратуры. Але не ўсе яны могуць выпускаць мастацкую літаратуру. Неабходна, каб яны выконвалі пэўныя патрабаванні: па афармленні кнігі, паліграфічным выкананні, інш.

Бясспрэчна адно: трэба, каб мы ўсе разам узяліся за гэту справу і па меры магчымасці спрыялі выхаду дзіцячай літаратуры ў свет.

Наталля ГОЛУБЕВА, намеснік начальніка Упраўлення сацыяльна-культурнай сферы Савета Міністраў Беларусі:

— Вывучаць літаратуру — гэта значыць не толькі атрымліваць эстэтычную асалоду, але і спасцігаць складаныя законы мастацкай творчасці. А гэта патрабуе ведаў і навыкаў, без якіх немагчыма ўспрыманне ўсіх каштоўнасцяў, якія закладзены ў творы. У нашай краіне ёсць вялікі творчы патэнцыял — гэта пісьменнікі. Іх трэба і неабходна ўключаць у актыўнае жыццё грамадства.

Што тычыцца выдання твораў літаратуры, то дзяржава выдзеліла на будучы год 2,6 мільярда рублёў на выданне сацыяльна-значнай літаратуры, а таксама 2,8 мільярда рублёў — на перавыданне твораў, якія праходзяць па графе "Школьная бібліятэка".

Дарэчы, нядаўняя праверка стану забеспячэння літаратурай школьных і масавых (гарадскіх і сельскіх) бібліятэк, дазволіла зрабіць адпаведныя вывады, у прыватнасці, неабходна карэнным чынам змяніць адносіны да забеспячэння культурна-асветных устаноў дзіцячай літаратурай. Менавіта таму мы і ўскладаем вялікую надзею на выданне кніг, у тым ліку ў серыі "Школьная бібліятэка".

Разам з тым, мы хочам, каб беларускіх празаікаў, паэтаў часцей задзейнічалі пры правядзенні рэспубліканскіх дзён культуры і мастацтва, каб яны былі ўсё больш частымі гасцямі ў школах, бібліятэках, а іх творы хутчэй распаўсюджваліся сярод чытачоў.

У сваю чаргу, праўленню Саюза пісьменнікаў Беларусі неабходна распрацаваць і прадаставіць у Савет Міністраў краіны дакументы для прыняцця закона аб напрамках фінансавай і матэрыяльнай падтрымкі беларускіх пісьменнікаў.

Андрэй АЛЕШКА — загадчык юрыдычнай службы Беларускай Праваслаўнай Царквы, рэферэнт Мітрапаліта Філарэта:

— Роля дзіцячага чытання заўсёды была высокаю. А ў перыяд абвастрэння маральных праблем — неацэнная. Што і казаць, часам сучасным бацькам не стае часу і сіл, каб выхоўваць дзяцей, і за іх гэта робіць кніга. Клапатлівыя бацькі заўсёды знойдуць магчымасць паказаць дзіцяці новае цікавае выданне. Але магу сказаць з асабістага вопыту: часам знайсці кнігу, каб яна была і добрая, і разумная, і талковая, і прыгожа афармлена — не так і проста. Глядзіш на паліцы — іх нібыта і шмат, а выбраць няма чаго.

Таму Беларуская Праваслаўная Царква невыпадкова выйшла з ініцыятывай аб утварэнні разам з СПБ грамадскага савета па пытаннях маральнасці.

Формы ўзаемадзейнічання царквы і пісьменнікаў могуць быць досыць разнастайныя. На сумесных форумах мы абменьваемся досведам. А будучы грамадскі савет па пытаннях маральнасці задумваецца як нешта зусім новае. Ён не будзе мець ніякіх уладных паўнамоцтваў, не стане падмяняць сабою дзяржаўныя і не дубліраваць існуючыя ўстановы. Яго задача — звяртаць увагу на выразныя, балючыя праблемы ў сферы маральнасці і выхавання моладзі. Іх шмат. І важна прапаноўваць канструктыўныя варыянты іх рашэння. У склад савета, як мяркуецца, увойдуць знаныя пісьменнікі, мастакі, музыканты, прадстаўнікі навуковых колаў, педагагічнай грамадскасці. Ён будзе складацца з духоўнай эліты грамадства. Слова — прамоўленае, напісанае, пачутае ці прачытанае — будзе мець сілу не дзякуючы ўладным паўнамоцтвам, а дзякуючы надзвычайнаму аўтарытэту гэтых людзей. Таму, спадзяёмся, голас такога савета будзе пачуты ўсімі інстытутамі грамадства.

Алена МАСЛА, пісьменніца, загадчык рэдакцыі дзіцячай літаратуры выдавецтва "Мастацкая літаратура":

— Мяне вельмі радуе тое, што апошнім часам павялічваецца цікавасць да дзіцячай кнігі — у выдавецтваў, а гэта значыць, і ў грамадства, таму што выдавецтва рэагуе найперш на патрэбы грамадства. Быў такі перыяд заняпаду, калі беларуская дзіцячая кніга заставалася незапатрабаванай. Аднак апошнім часам і ад бібліятэкараў, і ад настаўнікаў усё часцей чуеш, што патрэбны дзіцячыя кнігі, створаныя менавіта беларускімі пісьменнікамі, на беларускай мове. У выдавецтве "Мастацкая літаратура" мы намагаемся павялічваць колькасць найменняў дзіцячай літаратуры. У нас з'явіліся цікавыя серыі "Казкі XXI стагоддзя", "Скарбы роднай прыроды", мы працягваем раней распачатыя серыі. Вельмі цешыць тое, што і нашы калегі з РВУ "Літаратура і Мастацтва" прапаноўваюць чытачу даволі прыгожыя і змястоўныя кнігі, дай Бог, каб мы разам плённа працавалі на агульную справу. Бо калі мы давяраем выхаванне дзяцей літаратурам іншых краін, гэта ўсё адно, што мы аддаём іх на выхаванне ў чужую сям'ю.

Падрыхтавалі Ірына Тулупава, Валянцін БАРЫСЕВІЧ, Жанна КАПУСТА

№ 50 12 снежня 2008 г. Літ

Як наша слова адгукаецца?

Гадоў дваццаць таму, едучы ў аўтобусе, разгаварыўся з маладой настаўніцай пра беларускую паэзію. Узгадалі імя Алеся Разанава. Настаўніца ўскінула вочы і раптам з гонарам паведаміла: "Я яго бачыла, ён прыязджаў да нас у школу". "Як гэта прыязджаў? Няўжо такое магчыма?" — я глядзеў на дзяўчыну, верыў і не верыў. Паэт, якога ведаў па кнігах і публікацыях, уяўляўся мне недасягальным, амаль жыхаром нябёс. Здавалася неверагодным, што вядомы паэт мог "жыўцом" прыехаць у сельскую школу. Мая зайздрасць да маладой настаўніцы зашкальвала: яна была асабіста знаёма з паэтам, якога я ведаў толькі па творах. Аказваецца, існавала цэлая арганізацыя, якая займалася наладжваннем падобных сустрэч.

Парапанова спараджаецца попытам. Напісаў, скажам, паэт верш — якім будзе яго наступны крок? Найперш — знойдзе слухача і прачытае. Чамусьці творцу неабходна адчуць зваротную сувязь. Станоўчая (як і негатыўная, крытычная) рэакцыя стымулюе творчасць, з'яўляецца генератарам самога працэсу.

Раней пры Саюзе пісьменнікаў існавала цэлае падраздзяленне, якое выводзіла пісьменніка да слухачоў: "Бюро прапаганды мастацкай літаратуры". Гэтую ўстанову з грувасткай назвай ведалі ўсе. Але, на вялікі жаль, з аб'ектыўных прычын (і суб'ектыўных пазіцый некаторых кіраўнікоў) бюро спыніла існаванне гадоў пятнаццаць таму. Маладзейшае пакаленне літаратараў цяпер ужо нічога не ведае пра бюро. А яно стваралася з мэтай прапаганды мастацкай літаратуры, несла жывое слова людзям, арганізоўвала літаратурныя сустрэчы пісьменнікаў і паэтаў з чытачамі. Бюро мела сваю бухгалтэрыю, справаздачнасць. Структурная будова была такой: на кожную вобласць рэспублікі выдзяляліся два адказныя карэспандэнты-арганізатары, шэсць абласцей — гэта дванаццаць чалавек, і два-тры арганізатары па Мінску. Пятнаццаць арганізатараў! На пачатку дзевяностых і мне пашчасціла тры гады працаваць у бюро карэспандэнтам-арганізатарам. Лічы, штотыдзень у кожную вобласць выязджала асобная пісьменніцкая брыгада, кожны дзень па рэспубліцы ў розных месцах выязнымі пісьменніцкімі брыгадамі праводзілася больш за дваццаць літаратурных сустрэч, прэзентацый, вечарын. Статыстыка простая: раз на год кожны раён (а ўсяго іх было 117!) цэлы тыдзень прымаў у сябе пісьменнікаў. Большасць літаратараў стаяла ў чарзе на выезд у творчыя камандзіроўкі. Сустрэчы з чытачамі самі па сабе выключны стымул для творчасці, у дадатак — камандзіроўкі яшчэ і аплачваліся. І за савецкім часам рэдка хто з пісьменнікаў пачываў на лаўрах, усе дзе-небудзь працавалі, але за тыднёвую паездку пісьменнік атрымліваў ганарар.

Дарэчы, пра грошы. Калісьці Ніл Гілевіч у сваю дэпутацкую бытнасць на маё запрашэнне на сустрэчу з чытачамі, адказаў так: "Я не бяру грошай за тое, што чытаю вершы". Выдатная пазіцыя, годная павагі! "А ганарары за надрукаванае вы атрымліваеце? — спытаўся я. — Лермантаў, напрыклад, увогуле адмаўляўся". "Гэта зусім іншае", — адказаў Ніл Сымонавіч.

Я не пагадзіўся ні тады, ні сёння. Аплата сустрэчы з чытачамі і ганарар за надрукаваны твор — тое ж самае! Плата за працу. Толькі плаціцца з розных кішэняў. Сустрэча з чытачамі — аплата непасрэдная, без казуістыкі. Калі не спадабаецца — могуць і не плаціць. А то і ў вочы плюнуць. Падсвядома некаторыя творцы баяцца такіх стасункаў і адмаўляюцца ад сустрэч. Слухачоў цяжка падмануць. Сапраўдныя паэты заўсёды ўспрымаюцца, як цуд. Неаднойчы быў сведкам, як слухалі людзі вершы Анатоля Сыса. Зачараваная аўдыторыя прагна лавіла кожнае слова. І бачыў, як няўважліва, напаўвуха слухаюць тыя ж самыя людзі надзьмутых аўтарытэтаў. Вельмі павучальнае назіранне.

У мяне ёсць некалькі знаёмых, якія і цяпер жывуць за кошт таго, што з большым ці меншым поспехам арганізоўваюць літаратурныя сустрэчы. Многія паэты вельмі шмат выступаюць. Дык чаму не аднавіць добрую ідэю і не паставіць на прафесійную аснову, на справе даказваючы, чаго варта мастацкае слова.

Хадзілі чуткі, што плануецца стварэнне бюро прапаганды мастацкай літаратуры. Я дзвюма рукамі "за". Гавораць, нібыта Міхась Башлакоў цяпер займаецца бюро, але яго пазіцыя мяне здзівіла: "Мы выступаем толькі бясплатна. Гэта прынцыпова. Трэба падымаць прэстыж пісьменніцкай працы..." Падымаць прэстыж? Бясплатным бывае толькі сыр у мышалоўцы, і толькі для другой па ліку мышкі, бо для першай — гэта апошняя трапеза.

Людзі здольныя адчуваць сапраўдную паэзію, разумеюць і цудоўна ўспрымаюць мастацкае слова. Людзі прагнуць прыгожага пісьменства (сапраўды, не хлебам адзіным), і сустрэча з пісьменнікамі для іх заўсёды свята. Чытацкай аўдыторыяй пісьменнік, як камертонам, вывярае сваю вартасць. Жывыя слухачы — не папера, якая ніколі не чырванее і ўсё сцерпіць.

Для рэалізацыі ідэі "мастацкае слова ў масы" патрэбна не так і шмат: асобны пакой, некалькі нумароў тэлефонаў, аргтэхніка і дзесятак інцыятыўных людзей. Можна шырока выкарыстоўваць і няштатных супрацоўнікаў, тых жа студэнтаў. Не патрэбен раздзьмуты штат. Толькі трэба надаць такому бюро максімум свабоды дзеянняў. Не абмяжоўваць ініцыятыву чыноўніцкімі інструкцыямі: "дзе, калі, з кім выступаць, і за якія грошы" — няхай тое вырашаюць самі арганізатары, яны лепш адчуваюць сітуацыю. Адна з галоўных умоў развіцця ідэі — не перашкаджайце працаваць! І праз два-тры гады бюро будзе падтрымліваць фінансава не толькі пісьменнікаў, у тым ліку, і выданне іхніх кніг, але, магчыма, і агульнарэспубліканскія праекты. За ўсё трэба плаціць. Як вядома, усё новае — добра забытае старое. Бюро прапаганды мастацкай літаратуры — вялікая справа, якую трэба было б аднавіць!

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Добрая школа для пісьменнікаў

Учора надарыўся шчаслівы дзень: мяне, а таксама паэтаў Ніну Шкляраву і Міхася Болсуна запрасілі да сябе навучэнцы Гомельскага абласнога ліцэя. Калі рыхтаваўся да гэтай сустрэчы, нагарнуліся шчымлівыя ўспаміны...

У першыню выступіў перад шырокай аўдыторыяй год дваццаць пяць таму, калі ў наш горад прыехалі пісьменнікі са сталіцы па пуцёўках Бюро прапаганды мастацкай літаратуры. На той час абласная пісьменніцкая арганізацыя налічвала ўсяго некалькі празаікаў і паэтаў, якія мелі білеты членаў СП. Гэта — Міхась Даніленка, ён і сёння, дзякаваць Богу, нягледзячы на свой паважаны ўзрост, піша і друкуецца. Аднак на кантакт з арганізатарамі творчых сустрэч ішоў неахвотна, спасылаўся на занятасць за пісьмовым сталом. Яго разумелі. Уладзімір Верамейчык жыў у Ведрычы Рэчыцкага раёна, Мікола Янчанка ў Рагачове, а кіраўнік пісьменніцкай арганізацыі "паўставачнік" Іван Сяркоў працаваў галоўным рэдактарам на абласным тэлебачанні, адкуль вырвацца было яму няпроста. Таму абаяльная і клапатлівая Б. Касьяненка, якая працавала карэспандэнтам-арганізатарам Бюро прапаганды мастацкай літаратуры па Гомельскай вобласці, пачынала патроху далучаць да такіх выступленняў і нас, пачынаючых літаратараў. Так і я тады трапіў на першую сваю сустрэчу з чытачамі. Як цяпер помню, у прафесійна-тэхнічнае вучылішча будаўнікоў № 67. На той час у мяне меліся ўжо набыткі ў літаратуры, выдаў кнігу апавяданняў для дзяцей, пачаў актыўна, на мой погляд, друкавацца ў часопісах і газетах, чакаўся выхад кнігі прозы ў "Мастацкай літаратуры", меркаваліся першыя прэм'еры ў тэатрах. Адным словам, замахнуўся я на тым сваім першым выступленні не на жарт, хацелася сказаць шмат пра што. Памяркоўны і разважлівы Мікола Чарняўскі пасля таго майго выступлення зрабіў "разбор палётаў". Урок, які атрымаў, запомніўся на ўсё жыццё. Не адразу, скажу шчыра, навучыўся валодаць аўдыторыяй, але сёння раблю гэта, здаецца, някепска, бо там, дзе адбудзецца са мной сустрэча, абавязкова просяць прыйсці яшчэ. Іду. Чытаю гумар, расказваю жыццёвыя гісторыі, адказваю на пытанні. У многім творчыя сустрэчы з чытачамі падштурхнулі да таго, што тры гады на абласным тэлебачанні вёў аўтарскую перадачу "На прызбе з Васілём", запісана іх было ажно сто! З тэлеэкрана мы прапагандавалі, наколькі гэта магчыма, нашу літаратуру.

Глыбока пераканаць: творчыя сустрэчы з чытачамі самых розных узростаў і прафесій сталі добрай школай для ўсіх пісьменнікаў. Я меў шчасце прайсці яе. Дзякуй лёсу. Калгаснікі, рабочыя і школьнікі іншы раз задавалі такія неспадзявана калючыя пытанні, на якія няпроста было адказаць. Хвалілі творцаў і выказваліся негатыўна, востра пра той ці іншы твор выступоўцы. Аказваецца, людзі не толькі завуцца чытачамі — яны чытаюць. І не любяць хлусні. Не любяць цягамоціны. Пра гэта ды іншае выказваюцца смела на сустрэчах. Атрымлівай, класік, пад завязку! Каб ведаў надалей, што і як пісаць. За табой сочыць пільнае вока чытача. Май на ўвазе.

Было, было і такое.

Калі я ўжо працаваў старшынёй абласной пісьменніцкай арганізацыі, а бюро прапаганды перастала існаваць, то ў мяне награвуся тэлефон: прышліце, калі ласка, нам пісьменніка. У нас — свята кнігі, у нас тыдзень дзіцячай літаратуры, у нас... Ды прычын, каб сустрэцца з пісьменнікамі, было шмат. Гэта выдатна. Даводзілася мне быць дыпламатам, каб, напрыклад, угаварыць паэтэсу М. Паэтэсу выдатную, былую выкладчыцу беларускай мовы і літаратуры. А яна страляе ў мой бок пытаннем: "А хто мне аплаціць праезд у гарадскім транспарце? Сёння я на пенсіі, жыву адна, пенсія, вядома якая, таму кожная капейка на ўліку. А каб праехаць з Сельмаша ў Навабеліцу на сустрэчу з дзецьмі ў Доме творчасці, патрэбна дабірацца з перасадкай..." Я не ведаў, што адказаць. Нямеў. І ўспамінаў тыя шчаслівыя часы, калі мы самі прасіліся, каб нас накіравалі куды-небудзь выступіць. Хоць у іншую вобласць. Няважна. Мы ведалі: за намі — Бюро прапаганды мастацкай літаратуры, яно не толькі аплаціць праезд і гасцініцу (з нашых, вядома ж, заробленых грошай), але і падтрымае сям'ю пісьменніка.

Ну, дый годзе: калі яшчэ ў нашым абласным цэнтры пісьменнік павагаецца-павагаецца, ды і махне рукой — куды, значыць, ехаць трэба, дзе мяне чакаюць? — то як можа сустрэцца хоць бы той школьнік з Брагіна ці Акцябрскага з сапраўдным пісьменнікам? А ніяк! Гэта значыць, што там і меней прыхільнікаў нашай творчасці, менш падпісчыкаў і чытачоў беларускіх літаратурна-мастацкіх выданняў.

Такі вось ланцужок.

Не скажу, што ўсе пісьменнікі пакідалі пасля сябе добрае ўражанне. Было ўсялякае. "Не прысылайце нам больш паэтэсу К. Чаму? Ды нашы студэнты тэхнікума разумнейшыя за яе, больш чытаюць і ведаюць". Такія прыклады можна прыводзіць яшчэ. Таму не ўсім трэба лезці ў аўдыторыі на сустрэчы з чытачамі. Стварыць негатыў надта лёгка. Цяжэй потым вярнуць добрую згадку пра сябе.

Мне падараваў лёс разам выступаць (і не толькі на Гомельшчыне, але і на Магілёўшчыне, дзякуючы карэспандэнту-арганізатару Васілю Карпечанку, на жаль, ужо нябожчыку) з такімі творцамі, як Генадзь Бураўкін, Уладзімір Ліпскі, Леанід Дайнека, Міхась Пазнякоў, Павел Місько, Алесь Шашкоў, Мікола Маляўка, Ізяслаў Катляроў, Яўген Каршукоў, Кастусь Тарасаў, Анатоль Зэкаў, Міхась Башлакоў, Таіса Мельчанка, Анатоль Бароўскі, Алег Салтук, Кастусь Жук, з незабыўнымі Петрусём Макалём, Аляксандрам Капусціным, Міколам Янчанкам, Уладзімірам Верамейчыкам, Валянцінам Мысліўцом, Алесем Ставерам, Уладзімірам Машковым, Феліксам Мысліцкім, Уладзімірам Дзюбай і многімі іншымі. І ў кожнага з іх нечаму патрохі вучыўся, больш за ўсё, зразумела ж, жыццёвай мудрасці. Ведаў, што гэта лішнім не будзе.

Таму сустрэчы і сумесныя выступленні з такімі пісьменнікамі — несумненна, добрая школа для кожнага — і не толькі маладога! — літаратара.

Зыходзячы з уласнага вопыту, скажу адно: без Бюро прапаганды мастацкай літаратуры не можа існаваць Саюз пісьменнікаў. Нам, толькі нам, літаратарам, трэба прапагандаваць свае творы. За нас гэта ніхто не зробіць.

...Што ж да ўчарашняй сустрэчы ў абласным ліцэі, то яна прайшла на самым добрым узроўні. Было шмат пытанняў. Запомнілася найбольш адно з іх — дзе можна набыць вашы кнігі?

А каб не завіталі мы да іх, ліцэістаў, не было б і гэтага пытання.

Васіль ТКАЧОЎ

Каментарый сакратара Саюза пісьменнікаў Беларусі Георгія Марчука

Вярнуцца да старой сістэмы працы Бюро прапаганды немагчыма. Змяніўся час, змяніліся ўмовы існавання грамадскіх арганізацый і адносіны да творцаў. Усё цалкам памянялася. Калі раней дапамагалі пісьменнікам, бо ідэалогію камунізму, якую праводзіла партыя, патрэбна было падмацоўваць аўтарытэтам пісьменнікаў, то цяпер надышоў іншы час, рыначны — пісьменнікі пакінуты на саміх сябе і вымушаны выжываць у складаных умовах. Трэба прайсці перыяд адаптацыі. Улады ідуць нам насустрач і гэта абнадзейвае.

Але, нягледзячы на негатыўныя змены, апошнія паўтара-два гады пісьменнікі пайшлі ў калектывы. Праца ў накірунку прапаганды мастацкай літаратуры ажывілася. Як вы, магчыма, заўважылі, наноў створана сама структура бюро. Яна пакуль у зародкавым стане і як след не разгарнулася. Ранейшае "Бюро прапаганды мастацкай літаратуры" спыніла сваю дзейнасць гадоў трынаццаць таму. За гэты час амаль нічога не рабілася. Неабходна напрацаваць матэрыяльную базу, а выступаць ёсць каму.

Добрыя зрухі заўважаюцца ў абласных аддзяленнях СПБ — па Віцебскай і Гомельскай абласцях. Плённа працуе Мінскае гарадское аддзяленне СПБ пад кіраўніцтвам Міхася Пазнякова, шмат сустрэч арганізоўваецца і праводзіцца Міхасём Башлаковым. За апошні год з удзелам гарадскога аддзялення створана пяць паэтычных студый. Наладжваюцца сустрэчы ў публічных і дзіцячых бібліятэках, у працоўных калектывах.

З нядаўніх мерапрыемстваў хачу ўзгадаць вялікі пісьменніцкі дэсант на Піншчыну, з нагоды 60-годдзя Яўгеніі Янішчыц. Пісьменнікі выступалі бясплатна, але ж нейкі мільён-другі на дарогу патрэбна было знайсці. У ДК імя Дзяржынскага ў мінулым годзе прайшоў вечар паэзіі дзвюх сясцёр, Зоі Падліпскай і Таісы Трафімавай, у якім актыўна ўдзельнічалі артысты. Шырока прайшла ўрачыстасць з нагоды юбілею нашага слыннага сатырыка і парадыста — Георгія Юрчанкі. Трэба сказаць, што пакуль мерапрыемствы ў асноўным носяць прыкмету юбілейных або рыхтуюцца з нагоды выхаду выданняў, маюць прэзентацыйны характар.

Наладжваюцца сувязі з калектывамі. Платных літаратурных сустрэч пакуль не праводзіцца. Але ўсё лепшае, што было ў ранейшай структуры Бюро прапаганды, мы пастараемся аднавіць і выкарыстоўваць у новых умовах.

Катэгарычна, але па сутнасці

Наш спецыяльны карэспандэнт сустрэўся з начальнікам аддзела культуры Быхаўскага райвыканкама Надзеяй Анатольеўнай ЗАЖЫГІНАЙ.



— Надзея Анатольеўна, хацелася б даведацца пра штосьці адметнае ў сферы культуры вашага раёна...

— На сённяшні дзень у нашым раёне налічваецца 75 устаноў культуры і мастацтва, дзе працуе 319 чалавек. У бягучым годзе ў цэнтральную клубную і бібліятэчную сістэмы, дзіцячыя школы мастацтваў і рамёстваў улілося яшчэ дзевяць маладых спецыялістаў.

Асноўнымі ж культурнымі цэнтрамі ў стылыя восеньскія і зімовыя дні ў раёне з'яўляюцца масавыя бібліятэкі, вакол якіх і гуртуюцца аднадумцы, праводзяць у рамках клубаў, аб'яднанняў, гурткоў па інтарэсах цікавыя вечары адпачынку. У прыватнасці, з ахвотай і зацікаўленасцю ўдзельнічаюць чытачы ў такіх масавых мерапрыемствах, як "Залаты ўзрост", "Знаўцы прыроды", "Гадылёўскія краязнаўцы", якія цяпер праводзяцца ў Быхаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы, Варанiноўскай і Гадылёўскай сельскіх бібліятэках.

Зразумела ж, адраджэнне і захаванне нацыянальнай культуры, гістарычна-культурнай спадчыны, прапаганда беларускай класічнай літаратуры — гэта прыярытэтныя напрамкі дзейнасці бібліятэк раёна. Але работа вядзецца і па іншых накірунках. Сярод іх — экалагічная асвета і выхаванне, прапаганда здаровага ладу жыцця, краязнаўства, ваенна-патрыятычнае і духоўнае выхаванне моладзі.

— У вашым раёне робіцца акцэнт як на ўдасканаленне стацыянарнай кінасеткі, так і на развіццё мабільных форм абслугоўвання сельскага жыхара. Што гэта — вяртанне ў мінулае, да кінаперасовак?

— Не, гэта не зусім так. Мы проста хочам наблізіць людзей, якія жывуць далёка ад райцэнтра, да кінамастацтва. І добра, што ёсць гэтая магчымасць. Сучасная кіна-відэаапаратура, якая ў нас установлена на грузапасажырскім аўтамабілі "Рэно", дазваляе якасна дэманстраваць кіна- і відэафільмы ў сельскіх клубах і Дамах культуры, дзе няма стацыянарных установак, а таксама ў аддаленых школах і дзіцячых садках. І ўжо, дарэчы, ёсць добры прыклад супрацоўніцтва, напрыклад, з Грудзінаўскім цэнтрам культуры і адпачынку, дзе на прагляд кінафільмаў збіраецца па некалькі дзесяткаў гледачоў, з улікам іх пажаданняў вызначаецца і будучы рэпертуар паказу мастацкіх стужак. Але гэта толькі пачатак. Кіраўніцтва нашай кіна-відэасеткі плануе арганізаваць дэманстрацыю кіно, пракат DVD-дыскаў, відэакасет і ў шэрагу іншых аграгарадкоў раёна. Адным словам, час пакажа. Нездарма ж у народзе кажуць, калі пчала гудзе, то яна збірае мёд, а калі маўчыць, то думае пра мёд. Так што ацэнку ставіць рана.

— Быхаўшчына здаўна славілася таленавітымі майстрамі, якія ў свой вольны час, не патрабуючы ўзнагароджання за сваю працу, ствараліі цудоўныя ткацкія вырабы, вырабы з гліны і лазы, іншыя работы і творы. Што робіцца ў гэтым накірунку цяпер?

— Ёсць у нас нямала майстроў вышыўкі, аплікацыі і інкрустацыі саломкай, пляцення з саломы і лазы, сапраўдных народных майстроў і цяпер. Дарэчы, бягучы год у Магілёўскай вобласці аб'яўлены годам рамёстваў. Дык вось, за дзевяць месяцаў у нашым раёне было арганізавана 115 выставак твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Хоць народныя промыслы і рамёствы апошнім часам перасталі быць масавым заняткам, але, думаецца, што гэтая лічба гаворыць сама за сябе. Найбольш адметныя кампазіцыі былі прадстаўлены дырэктарам Варанiноўскага сельскага Дома культуры Людмілай Вароніч на міжнародным фестывалі "Вянок дружбы", які праходзіў у горадзе Бабруйску. На сённяшні дзень метадыстам раённага цэнтра культуры і адпачынку Аленай Цыгановай створана досыць падрабязная картатэка майстроў народных промыслаў і рамёстваў, якія пражываюць у раёне.

— Як вядома, важная асветніцкая роля адводзіцца краязнаўчым музеям. Калі ласка, Надзея Анатольеўна, колькі слоў пра Быхаўскі гісторыка-краязнаўчы музей.

— Як дрэва не можа жыць без каранёў, так і народ не можа існаваць без сваёй гісторыі, культуры, без уласцівых толькі яму сімвалаў памяці. У сучасным грамадстве, як вы правільна падкрэслілі, пастаянна ўзрастае сацыяльная роля музеяў, дзе ў экспазіцыі павінны прысутнічаць не толькі мастацкасць і дынамізм, але, у першую чаргу, актуальнасць і навуковасць. Невялікі калектыў супрацоўнікаў пад кіраўніцтвам Любові Буштак праводзіць актыўную работу не толькі па прапагандзе гісторыка-культурнай спадчыны краю, зборы, набыцці і ўліку матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей (дарэчы, вялікую дапамогу ў зборы рарытэтных рэчаў аказваюць ім мясцовыя краязнаўцы Галіна Шульга, Ганна і Віктар Куляшовы, Яўген Сідорын ды іншыя, дзякуючы якім фонды музея толькі ў гэтым годзе папоўніліся 145 экспанатамі), але і аднаўленнем экспазіцыйных залаў, наладжваннем выстаў, правядзенням лекцый на тэмы далёкага і блізкага мінулага, падмацаваных архіўнымі дакументамі і фотаматэрыяламі з выявамі архітэктурных помнікаў Быхава і навакольных вёсак, прадметамі і адзенням культавага прызначэння. Толькі ў бягучым годзе дырэктар раённага гісторыка-краязнаўчага музея Любоў Буштак з супрацоўніцамі Ліляй Спірыдонавай і Ірынай Міхайлавай правялі 224 музейныя заняткі са школьнікамі на тэмы: "Дзецям пра ікону", "Беларускі ручнік", "Чароўны куфэрак", "Беражыце прыроду" і іншыя. Арганізавалі таксама некалькі тэматычных выстаў: "Тут каранi, адсюль вытокі", "Народжаныя абаранять", "Няхай не будзе вайны ніколі", "Імёны Перамогі..."

Вялікае значэнне супрацоўнікі музея надаюць патрыятычнаму выхаванню моладзі. Тым больш, што на Быхаўшчыне столькі свяшчэнных гераічных мясцін! Напрыклад, далёка за межамі раёна вядомы мемарыял Воінскай Славы непадалёку ад вёскі Лудчыцы. Тут, на "Вышыні 150,9" палягло шмат нашых воінаў розных нацыянальнасцей былога Савецкага Саюза, васьмі з якіх было прысвоена вялікае званне Героя Савецкага Саюза.

Увогуле я заўсёды з удзячнасцю адзначаю працу калектыву работнікаў культуры раёна. Выкажу мо катэгарычнае меркаванне, але яно — па сутнасці: без іхняй працы немагчыма выхаваць ні надзейнага абаронцу Айчыны, ні таленавітую асобу, ні дбайнага сем'яніна.

Гутарыў
Валянцін БАРЫСЕВІЧ

Прызванне

Неяк у размове з бібліятэкарамі давялося пачуць, што раўнадушных людзей у іх асяродку не бывае. З гэтай прафесіяй звязвае сваё жыццё той, хто любіць людзей, любіць кнігу, шануе і прапагандуе яе.

Даўно пачутае прыгадаў нядаўна, калі гутарыў з загадчыцай Ніканавіцкай сельскай бібліятэкі, што ў Быхаўскім раёне, Валянцінай Яшчанкай. У 1986 годзе яна скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум і засталася ў вёсцы на ўсё астатняе жыццё, хоць у той пазначаны чарнобыльскай трагедыяй год многія кінулі абжытыя мясціны, з'ехалі ў так званыя чыстыя зоны. А яна — засталася і нікольі пра гэта не шкадуе.

Чытачы сваю Валянціну, як часам яны называюць бібліятэкарку паміж сабою, любяць. Іх чатыры сотні чалавек рознага ўзросту. Юных чытачоў 85, а прыхільнікаў мастацкай літаратуры сярод пенсіянераў — 35. І да кожнага з іх ёсць індывідуальны падыход.

"Чаму пайшла вучыцца на бібліятэкара? — пачынае расказваць Валянціна Ільінічна. —Як толькі пачала добра чытаць, а гэтаму мяне хутка навучыла мая першая настаўніца пачатковых класаў Ганна Тарасаўна Крывалапава, адразу пайшла ў бібліятэку. А там на мяне нуль увагі. Сама бяры, глядзі тую ці іншую кніжку, выбірай. А што я магла тады выбраць, дзіця неразумнае? Каб мне нешта параілі, крыху расказалі... А раіць, тым болей расказваць, ніхто не хацеў. Аб гэтым і прыгадала, калі прыйшоў час выбіраць прафесію".

Сёння Валянціна Яшчанка ведае густ кожнага чытача. Яна прачытала сама шмат кніжак і цяпер чытае ў асноўным новыя творы беларускіх пісьменнікаў, раіць іх чытачам.

Раней, калі бібліятэка месцілася ў сельскім Доме культуры, Валянціна Яшчанка працавала на 0,5 стаўкі і ў школьнай бібліятэцы. Па сутнасці, так бы мовіць. Але нязручна было. Цяпер — іншая справа. Сельская бібліятэка аб'ядналася са школьнай, што арганічна ўпісалася ў звыклае вясковае жыццё. Кніжны фонд аб'яднанай бібліятэкі складае больш чатырнаццаці тысяч экземпляраў. Каля трох тысяч кніг, якія ад доўгага карыстання прыйшлі ў непрыгоднасць, давялося спісаць. Але і гэтага фонду хапае, каб вясковец мог узяць патрэбны яму літаратурны твор.

Не трэба думаць, што Валянціна Яшчанка толькі і займаецца тым, што выдае кнігі чытачам і прымае ад іх прачытаныя творы. Індывідуальна, а таксама разам з настаўнікамі мясцовай школы яна афармляе кніжныя выстаўкі, рыхтуе розныя мерапрыемствы. Увагу наведвальнікаў прыцягваюць цяпер краязнаўчы куток, разгорнутая экспазіцыя "Здаровы лад жыцця". Дарэчы, па гэтай тэматыцы нядаўна прайшлі заняткі з сямікласнікамі. Падобныя ўрокі наладжваюцца таксама па творчасці беларускіх пісьменнікаў-юбіляраў. Цяпер бібліятэкар Валянціна Яшчанка думае над тым, як найбольш змястоўна правесці разам з настаўнікамі і вучнямі шэраг мерапрыемстваў па творчасці народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова, якому ў лютым наступнага года спаўняецца 95 гадоў з дня нараджэння.

Мікола ЛЕЎЧАНКА

«Мая вуліца — самая, самая...»

Гаварыць пра сельскую бібліятэку вёскі Якімава Слабада, што на Светлагоршчыне, лёгка і прыемна. Спорна ідзе тут справа. Ды і сама бібліятэкарка Алена ШКІРМАН — маладая, вельмі абаяльная жанчына, заўсёды шчырая і ветлівая. Паважаюць яе аднавяскоўцы. Сама бібліятэка знаходзіцца ў адным памяшканні з сельскім Домам культуры і паштовым аддзяленнем сувязі.

Менавіта сюды прыходзяць сталыя вяскоўцы, каб атрымаць пенсію ды і бібліятэку адначасова наведаць, бо тут можна і кнігі памяняць, і свежую газету пачытаць, і паразмаўляць пра жыццё-быццё з Аленай Пятроўнай. У бібліятэцы вельмі ўтульна, светла. Стварае гэту амаль што хатнюю ўтульнасць з густам афармлены этнаграфічны куток "Слабадскі падворак". Кожны наведвальнік бібліятэкі быццам бы трапляе ў беларускую хатку першай паловы дваццатага стагоддзя. Безумоўна, любоў да роднага краю, веданне яго гісторыі — гэта спрыяльная глеба для выхавання юнага грамадзяніна. З гэтай нагоды аддзелам бібліятэчнага маркетынгу і рэкламы Светлагорскай РЦБС быў распрацаваны доўгатэрміновы краязнаўчы праект "Мая вуліца — самая, самая..." Прадугледжваецца таксама стварэнне інфармацыйных бібліятэчных рэсурсаў, якія стануць асновай краязнаўчай электроннай базы даных Якімаваслабадской сельскай бібліятэкі.

Алена Пятроўна наладзіла добрыя зносіны з адміністрацыяй Баравікоўскага сельскага савета, настаўнікамі і выхавацелямі мясцовай школы, грамадскасцю вёскі. Да ўдзелу ў праекце яна далучыла юных чытачоў з дзіцячага клуба "Усмешка", які плённа працуе ў бібліятэцы ўжо некалькі гадоў. Хлопчыкі і дзяўчынкі наведваюць старажылаў сваёй вёскі, каб паслухаць і запісаць іх успаміны. Дзякуючы аднаму з іх яны даведаліся, што бібліятэка знаходзіцца на тым месцы, дзе раней стаяла Мікалаеўская драўляная царква, якая была пабудавана памешчыкам Іванам Адамовічам у 1854 годзе. Тут жа ў свой час быў пахаваны і мясцовы святар. І сапраўды, у 2005 годзе, падчас капітальнага рамонту, у будынку былі знойдзены яго астанкі і перазахаваны на мясцовых могілках.

З гутарак з аднавяскоўцамі школьнікі даведаліся таксама аб тым, што на сучаснай Цэнтральнай вуліцы Якімавай Слабады некалі пражываў памешчык Пляханаў, які пасадзіў незвычайны на той час парк, у якім раслі грэцкія арэхі, каштаны, розныя віды таполяў, ліпы, бярозы. Цяпер засталіся толькі некаторыя з іх.

Карэнны жыхар вёскі, Павел Савельевіч распавёў юным слухачам аб сваім дзяцінстве, якое прыйшлося на гады Вялікай Айчыннай вайны. Яго і падлеткаў-аднавяскоўцаў сілаю сагналі ў суседнюю вёску Шацілкі, дзе ў спецыялізаваным падраздзяленні за калючым дротам рыхтавалі з хлапчукоў будучых карнікаў. Толькі прыход Савецкай Арміі пазбавіў падлеткаў ад жудаснага палону. Цяпер гэтыя ўспаміны запісаны на дыктафон і настаўнікі іх выкарыстоўваюць на ўроках гісторыі.

Жыхарка вёскі Эма Іванаўна Вазнюк прынесла ў бібліятэку фотаздымак сваёй бабулі— графіні Станіславы Яноўскай, зроблены на пачатку дваццатага стагоддзя. Нашчадкі беражліва захоўваюць памяць пра сваіх продкаў. Каб знаёміць аднавяскоўцаў з такімі гістарычнымі фактамі, Алена Пятроўна арганізавала "музей на стале" "Позірк з даўніны". Звесткі пра мінулае змешчаны ў архіякалендары "Вёска і яе жыхары ў люстэрку часу".

Добрае сяброўства з самабытным мастаком Сяргеем Кавалём перарасло ў плённае супрацоўніцтва. Улетку 2007 года ў дзень свята вёскі ў бібліятэцы адбылася прэзентацыя выставы мастака, які працуе ў стылі прымітывізму. Цяпер С. Каваль кіруе заняткамі створанай у бібліятэцы творчай майстэрні "Збаночак". Ён вучыць якімаваслабадскіх хлопчыкаў і дзяўчынак мастацтву лепкі з гліны. Увесь творчы працэс адпавядае сапраўднай тэхналогіі: і пошук гліны, і падрыхтоўка яе да лепкі, і сушэнне, абпальванне вырабаў і іх фарбаванне. У выніку атрымліваюцца вельмі прывабныя фігуркі людзей, казачных герояў, жывёл, раслін, цацак і розных хатніх дробязей. Частка гліняных вырабаў дэманструецца на бібліятэчнай выставе "Пяе гліна ў дзіцячых руках".

Актывісты бібліятэкі пачалі распрацоўку карты пражывання старажылаў, прымаюць удзел у віншавальных акцыях да каляндарных святаў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, збіраюць матэрыялы для тэматычных папак "Бабуліны рэцэпты", "Мясцовыя песні, абрады, замовы і малітвы".

Каб данесці да насельніцтва краязнаўчую інфармацыю, якая цяпер назапашана ў бібліятэцы, арганізаваны валанцёрскі рух, удзельнікамі якога сталі юныя чытачы. Добраахвотнікі ўжо зрабілі першыя крокі, і цыкл паэтычных чытанняў "Вёсачка мая любімая" прагучаў ужо ў дзіцячым садку. Цяпер валанцёры рыхтуюцца да выступлення на мясцовай фабрыцы гародніны з гутаркай "Якімава Слабада ў гады Вялікай Айчыннай", прысвечанай 65-годдзю вызвалення Светлагорскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Хутка ідзе час, а разам з ім перагортваюцца жыццёвыя старонкі лёсаў вёскі Якімава Слабада і яе жыхароў. Праз некалькі дзесяцігоддзяў наша сучаснасць будзе ўжо гісторыяй. А гісторыю неабходна захоўваць. Значыць, справа пад назвай "Краязнаўчы праект "Мая вуліца — самая, самая...", рэалізацыяй якога займаецца Якімаваслабадская сельская бібліятэка, вельмі важная і значная. Можна быць упэўненымі — гісторыя вескі Якімава Слабада будзе захоўвацца і перадавацца наступным пакаленням.

Іна РУДЗЯНОК,
метадыст Светлагорскай раённай цэнтральнай бібліятэкі

Ужо сталася добрай традыцыяй у "ЛіМе" рабіць штомесячныя агляды мастацкіх і літаратурна-крытычных публікацый часопісаў "Полымя", "Маладосць", "Нёман". Праўда, у тым выпадку, калі твор патрабуе больш грунтоўнага асэнсавання, межы агляду становяцца надта вузкімі. З мэтай кампенсаваць гэты недахоп "ЛіМ" прапануе вашай увазе новую рубрыку "Акцэнты", у якой будуць змяшчацца артыкулы, прысвечаныя самым значным публікацыям месяца. Распачынаецца яна акцэнтам на новым рамане Алены Брава "Менада і яе сатыры", што друкаваўся ў № 9—10 часопіса "Маладосць" за 2008 год.

На іншай хвалі

Акцэнты


ПРОЗА

Алена БРАВА

МЕНАДА І ЯЕ САТЫРЫ

Раман

Мой мозг, як школьны клас, у якім — куды: настаўнік-паганяч лупе несупынна, за тарможкі хапучыся ўскалёпам, пра ўсе нас памкнулі (шах!) — шкада, не грамацічна, бо так, як я, ніхто не мог у астранамічным класе з пяцідзесяці прыродных чуцяў дзіксуючы сэнс падаць славянай фразе! ...Убачыў. За вокнам на слядах нясуцца шкілеты і стогнуць цэмяна, у вінчыках экспанентаў слязах, як зёлкаў вялізных батэнкі, ад ветру ў небе ўсе ліхтары. «Мае дзеці тут! Ма іх — таго вінаваце!» Куды сховаці іх? Не я, ніхто не вінаваціць! Ах, калі б стаяну пячаткі! (На сторонах крывіць, на ручак...) Са школьнай дошкі сыграў бы афіцэр жанцаў свай — як той анучкі ўмах сучасным абліхаем фрэу!

Частка першая.
ВЫДАТНІЦА

1

У школе яе дражнілі за почырк: западта вытачаны, з бутонападобнымі «т» і завостранымі хвастамі, які нагадваў выводзіць у сшытку, — не «т», што так гатовая выбухнуць пупышка, абшпала шалёнае несцякальнае цвіценне, адным на школьнай клумбе веткам прадпісалася расці не вышэй за скразняковую лінію. Зрошты, на ўсім астатнім настаўніні былі бо цалкам задавальненне, чаго нельга сказаць пра адзнакаспісаўку з дзевятага «Б»: менадзіта ў гэты «дружны калектыў» яна, нідзе і ні ў чым не раставальны асадак восьмага «Б» (выпускнікоў, які актыўна растуў, нібы цукар, у масе гарадскіх СІТІВ), прыйшла са сваім распухлым, як труп тапельца, дэрматынавым партфелем першага

МЕНАДА І ЯЕ САТЫРЫ

закручвала ў старочную фігулю на макаўцы (альбо заплятала ў касіцы з белымі бантам бабаўкінкая, з «Дзіцячага свету», калготкі, што збіраліся ў складкі на каленах, як іх падкатай, і з гарадаю адвернулся.

— Але што там — капготкі! Горш за ўсё быў выраз вачэй новенькай: нейкага пяткі нага сумі і самаадданай гатоўнасці *експлаціраваць дарэшты*. Вочы ў яе, мяк іншым, бы колеру нясмелага агрысту, з густымі жэмі і рухавайтымі павекамі, заўжды прыпухлыя нібыта пасля слёз, а сярэдзіна сярэдзіны блакітных жалкі, як так рачная сетка новенькай контурнай карце па геаграфіі. Але ніхто не спяшаўся скарваць сваю вестр да гэтага пятнацыцігадовага мацерка, яшчэ не адкрытага і не навесцінага на кар Юля — так звалі гарэтніцу — з усяе моцы намагалася засцерабіць клавіцімбалам сцяну прыгажуні Зоі Мардасавай, непераўзыдзеній спецыялістві ў галі апрацах імпартных дзеў, на перапынках бегала ў шклозводскую купінарыю па прозныя для Зоі ды цыгарэты для Сашы Сомава на мянушкі «Сэмо, які, дарэчы, склаў ў бягунню верцішк:

Наша Юля хоча ўсіх скакаці,
А бі настаміці яна баіць!

Што і казаць, выкладвалася яна заналта.

Некаторыя ўжо чулі, што ў дванаццаць год выдатніца, не ўмеючы плаваць, скочыла вышэй ў басейн, адкуль не вылавіў бягром настаўнік фізкультуры, — гэты «подзіпіс» я здзейсніла з-за любові да «англічанін», усім вядомай закулы, якую праязлі Афелі за бясконцыя цытаты з Шэкспіра ды газавыя шаліку, што змяліся за ёю па школьні калідорах разам са шлейфам метнага лезавага пяку.

Падумаць толькі — з-за любові!

2

Сумная (альбо вясёлая — як паглядзець) гэтая гісторыя адбылася ў правінцыйнім горадзе, дзе кожны дзень і нават год настолькі падобныя адзін да аднаго, што ў абар генаў можаш ўзяць адвуканне вязаага сну, выхаракацца з якога можна толькі пеў самотнасці ў іншы сон, — і нідзе нічога агаласіць, тэлефанаваць альбо раскрыць сэрцаў каханні, каму што больш дыспадобы. З дзіўчынкай — прататыпам галоўнай гераіні я Уварцішкі сустрэлася на гарадскій алімпіядзе па родным мове, дзе мы прадстаўлялі кожна сваю школу. У канцы «мерапрыемства» быў канцэрт, на якім чыталіся вершы у асноўным дэкламавалі савецкіх тагачасных класікаў. Юля (маўчыла, у не было ім ім) адзінай з усіх выступала з вершам уласнага сачынення. У памяці запаў радок:

Как высокі дзень, забіваюць зоркі.
Не забіваі мяне абалбатываюць!
І іншых:
Жыццё і Смерць жывуць адзін і той жа твар.
Штодня ко бою перад сабою...

Нешта там было яшчэ пра востры сгрэбень дрот, нашчупты на бездапню, па ягоняа цёе да каханага, «ружаўны ў яроў бесам ступні». Верш называўся «Шчасці

і менавіта таму не можа ні з кім паразумецца. Яе голас нячутны, бо ўсе, да каго яна звяртаецца, запраграмаваныя на іншую "хвалю". Яна імкнецца знайсці духоўную гармонію, але ў сітуацыі псеўдакультурнага смецця, у якой ёй даводзіцца самасцвярджацца, мае сэнс весці гаворку толькі пра адносную раўнавагу.

У рамане няма паслядоўна разгорнутага сюжэта. Аднак уражанне цэльнасці ўзнікае, дзякуючы адзінству змрочных думак галоўнай гераіні і змрочнасці навакольля. Хаця другое, безумоўна, вынікае з першага. Можна ўвогуле сказаць, што гэта раман-рэфлексія. Прачытаўшы палову твора, разумееш, што роля дзеяння ў ім умоўная, галоўнае — у думках і разважаннях Юлі, якая не столькі перажывае тое, што з ёй адбываецца, колькі асэнсоўвае гэта: *"Яна хацела кахаць, як цвейгаўская Незнаёмка, і свайго дабілася: яна так і засталася нераспазнанай для ўсіх тых увішных кар'ерыстаў, спадчынных алкаголікаў, інфальтыльных мамачкіных сынкоў — так ужо атрымалася, што яе творчы размах разгарнуўся на нягодным матэрыяле правінцыйнага горада"*. Сапраўдная гераіня ў віртуальным свеце. Гэтак яна бачыць самую сябе. А прычына яе адзіноты акурат у тым, што на самай справе ўсё наадварот: свет сапраўдны, такі, які ёсць, асяроддзе звычайнае і пазнавальнае. Проста Юля ў гэтае асяроддзе *не ўпісваецца*, яна ходзіць па вулках правінцыйнага горада як сярод кардонных дэкарацый, і не адчувае асуджанасці сваёй ролі. Асяроддзе адштурхоўвае Юлю ці, у лепшым выпадку, толькі карыстаецца яе ўзнёслай шчырасцю. Яна ўпарта не хоча заўважаць сваёй — відавочнай для ўсіх астатніх — недарэчнасці, і праз гэта дазваляе разгледзець узведзеную ў ранг рытуалу недарэчнасць ладу жыцця большасці сваіх знаёмых.

На першы погляд, хаатычны і няспынны самааналіз, якім займаецца галоўная гераіня рамана, выглядае ненатуральна. Ды і тое, што яна бясконца і нібыта наўмысна знаходзіць для сябе такія жыццёвыя сітуацыі, самае лепшае выйсце з якіх — самагубства, таксама падаецца неверагодным і *несустракальным* у рэальным жыцці. (Сапраўды, пачынаеш пагаджацца са "здзіўленнем" аўтаркі: *"Я шчыра дзіўлюся таму, што Юля дагэтуль не апынулася ў сценах жоўтага дома"*). Аднак — колькі пазнавальных характарыстык, знаёмых адчуванняў — і разумееш, што гэта звычайны лёс чалавека спустошанай душы. Для некага — толькі непрацяглы перыяд, пераадолены стан, а для некага (і, мабыць, кожны з нас прынамсі аднаго такога чалавека ведае) — нязменнае напаўненне самотных дзён і тыдняў. Вельмі важна ў рамане А. Брава менавіта тое, што гэта твор і пра тых, хто побач з намі, і пра нас саміх адначасова.

У рамане няшмат фарбаў, і амаль усе цёмныя, нават брудныя. Чым больш пачварная карціна, тым больш дэталёва яна апісаная. А.Брава бязлітасна прымушае гераіню апускацца на самае донца сваіх патаемных жаданняў і страхаў, гэтак жа бязлітасна яна змывае яркія фарбы з дэкарацый штодзённасці правінцыйнага горада, часам даводзячы ступень натуралістычнасці да абсурду. Аднак жа...

Зразумела, для пісьменніка няма прапісных ісцін. Часта ўражвае і запамінаецца менавіта тое, што выклікае нязгоду ці нават абурэнне. Пісьменнік — стваральнік тэксту і гаспадар у ім. Аднак некаторыя месцы ў рамане падаюцца ўсё ж лішнімі ці, больш дакладна, па-мастацку неапраўданымі. Напрыклад, раздзел "L-мутанты", у якім апісваецца працяканне венерычных захворванняў, ці развагі гераіні ў раздзеле "Страшныя здагадкі" наконт таго, што да *"ажыццяўлення запаветнае мары ёй не хапіла... усяго толькі чатырохсот грамаў жалезістай тканкі, з якой складаецца малочная залоза"*. На фоне шматлікіх рэфлексій Юлі з нагоды сваёй знешнасці гэта выглядае ўжо нездаровым перабольшаннем і стварае непрыемнае ўражанне зацыкленасці на адным комплексе.

І ўсё ж — гэта не самамэтныя практыкаванні ў майстэрстве антыэстэтыкі, а спроба прабіць абыякавасць звыклага ўспрымання, калі нічога ўжо не ўражвае і не прымушае задумацца. У рамане А.Брава акурат-такі багата што выклікае роздум — не над адвечнымі філасофскімі пытаннямі (пра гэта пішуць шмат, бо пра гэта пісаць лёгка), а над пытаннямі філасофіі жыцця як штодзённага досведу (куды цяжэй укласці ў мастацкі тэкст сваё непрыхарошанае метафарамі існаванне ў канкрэтным месцы і часе).

Жанна КАПУСТА

Кніжны развал

Рэдкія выданні Міцкевіча



Адзін з кірункаў майго кніжнага збору — выданні, што былі ажыццёўлены падчас Вялікай Айчыннай вайны. На сённяшні дзень у маёй калекцыі крыху больш за дваццаць такіх кніг. Сярод іх — і надзвычай цікавыя рарытэты, пра адзін з якіх мне хацелася б расказаць. Гэта невялікая кніга паэм Адама Міцкевіча — "Гражына. Конрад Валенрод". Выйшла яна ў Маскве на польскай мове ў канцы 1943 года ў серыі "Бібліятэчка Саюза польскіх патрыётаў у СССР".

Аказваецца, вясной 1943 года польскімі камуністамі — пісьменніцай Вандай Васілеўскай і дзеячам польскага працоўнага руху Аляксандрам Завадскім — у Савецкім Саюзе была створана антыфашысцкая арганізацыя польскіх эмігрантаў "Саюз польскіх патрыётаў у СССР", арганізатары якога праводзілі і палітасветную работу. Адным з напрамкаў гэтай работы была выдавецкая дзейнасць. Акрамя названай вышэй, Саюз польскіх патрыётаў у СССР выдаў яшчэ адну кніжку Адама Міцкевіча пад назвай "Выбраныя творы", якая выйшла ў верасні 1943 года таксама на польскай мове.

Трэба адзначыць, што на выставе "Кніга сражаецца (1941—1945)", якая адбылася ў Маскве ў 1985 годзе, дзе была прадстаўлена кніжная прадукцыя часоў Вялікай Айчыннай вайны з асабістых зборaў калекцыянераў Масквы, Падмаскоўя і Ленінграда, кніжка паэм Адама Міцкевіча "Гражына. Конрад Валенрод" адсутнічала. Менавіта таму яна і не была ўключана ў каталог выставы "Кніга сражаецца" (Масква, 1987 г.), што дазваляе яе расцэньваць як бібліяграфічную рэдкасць. На жаль, гэтымі сціплымі звесткамі пакуль што і абмяжоўваецца мой пошук.

З гэтай нагоды я хацеў бы прапанаваць бібліяфілам Беларусі ўважліва праверыць свае асабістыя бібліятэкі: магчыма, у іх знойдуцца кнігі, газеты, плакаты ваеннага часу, і тады да 65-годдзя Вялікай Перамогі можна будзе арганізаваць выставу пад умоўнай назвай "Кнігі тых палымяных гадоў". Упэўнены, што гэта будзе цікава не толькі нам — калекцыянерам, але і ўсім аматарам кнігі.

Вячаслаў АФАНАСЬЕЎ

Святасць душы

Хрысціянскія матывы ў сучаснай беларускай паэзіі

Людзі ўсё часцей звяртаюцца да Бога, да веры, аднаўляюць некалі разбураныя святыні, шукаюць шляхі выйсця з духоўнага тупіка, імкнуцца знайсці дарогу да Храма. Ідзе вяртанне да тых спрадвечных каранёў, ад якіх мы былі адарваныя доўгія гады.

Толькі абапіраючыся на спадчыну, на культурныя традыцыі, мы можам агульнымі намаганнямі і адзіным духам зрушыць з мёртвай кропкі практычнае вырашэнне многіх праблем у галіне культуры, духоўным і грамадскім жыцці. І вось тут сваё важкае слова і павінны сказаць нашы айчынныя пісьменнікі і паэты.

Беларускія літаратары жывуць гісторыяй і ў гісторыі і ствараюць свае адмысловыя творы, дзе сцвярджаецца духоўна-чалавечае ў чалавеку.

Можна быць хворым,
Можна быць бедным,
Але жыць добра —
Гора не ведаць.
Калі ёсць вера,
Вера дасць сілу,
Пакажа дарогу —
Бура нахліне.
Яна дапаможа
Быць непахісным.

Гэта радкі з верша беларускага паэта-барда Алеся Камоцкага, аўтара зборнікаў вершаў "Спроба ісці па расе", "Неспадзяванне", "Глыбіня даждж". У некаторых сваіх творах аўтар сцвярджае сілу веры, сілу малітвы.

Але больш яркія радкі ёсць у Валянціны Паліканінай — паэткі, перакладчыцы, журналісткі, якая лічыць, што дарога людскога жыцця — гэта дарога да Бога, да Ісціны, Дабра, Прыгажосці. Пры гэтым мы павінны памятаць пра духоўнасць светлую (Божую) і цёмную ("нячыстую") і іх уплыў на свядомасць чалавека і грамадства.

Живем не так, встречаемся не с теми,
Не то творим, совсем не так горим,
Не те душой затрагиваем темы,
Не те слова друг другу говорим,
Легко бранимся, миримся натужно,
Скитаясь в одиночестве своём,
И лишь о Том, Кто нам и вправду нужен,
За пять минут до смерти узнаём.

Паэт Андрэй Скарынкін упэўнены, што духоўная прыгажосць уратуе свет. Ён засмучаны, што ад нашых дрэнных учынкаў пакутуюць дзеці — гінуць ад цяжкіх хваробаў, у катастрофах, гінуць маральна, седзячы ля тэлевізара, гінуць, яшчэ не пабачыўшы гэты свет. Пра гэта аўтар гаворыць у вершы "Пакаянне".

У адным са сваіх твораў ён задае пытанне і сабе, і нам, чытачам:

Какое счастье — видеть небеса!
В земле такой возможности не будет...
Но почему на землю смотрят люди?
Что ищут на земле людей глаза?

Гэта тэма ёсць і ў творчасці паэткі Людмілы Рублеўскай. Яе зборнік вершаў і эсэ "Шыпшына для Пані" змяшчае шмат твораў на біблейскія сюжэты.

Вера адлюстроўваецца ў рэлігіі, якую народ спавядае, у тым, як гэта духоўнасць увасабляецца ў культуры народа, у спадчынных яе абліччах. А таму нельга абмінаць Божыя храмы. Людміла Рублеўская ў вершы "У царкве" параўноўвае Храм з Каўчэгам, куды хочуць змясціцца ўсе.

Подыхі людскія, свечак дым,
Ладану пранізлівая нота.
Хто мы — тут і на каго глядзім
У тумане незямной самоты?
Так было, напэўна, шмат разоў —
У прадонні буры — зграйка птушак
І надзея, што чыясьці кроў
Выкупіць душу тваю ад сцюжы.
Не дастукацца сюды дажджу.
Паміраць — ці ратавацца ў кучы?
Свечцы проста ў вока я гляджу,
А яна міргае так сляпуча.
Можа быць, спагада і спакой
На мяне, самотную, пральецца?
Кожны застаецца сам сабой,
Як чарга чаргою застаецца.

Паэтэса Людміла Рублеўская шукае супакаення ў малітве і ў ёй яна бачыць выйсце з духоўнай пустаты.

Асноўны вобраз раздзела "Сад храма" — вобраз Хрыста. Гэта мы бачым у вершах: "Пальмая нядзеля", "Выйсце з пусткі", "У час, калі крылом сваім душа", "Ён ішоў па вадзе".

У жыцці кожнага чалавека ёсць момант, калі яму неабходна вырашыць для сябе: жыць з Богам ці існаваць без Яго. Менавіта такая думка закладзена ў вершы нясвіжскай паэткі Наталлі Бордак.

Хрыстос прыходзіць і кажа:
— Даю табе волю і шчасце,
Абедзве даю рукі.
А ты можаш выбраць цвікі
І ўбіць мне іх у запясці.

Шмат вершаў духоўнага плана ў творчасці Віктара Леанені, сябра полацкага літаратурнага аб'яднання "Наддзвінне", аўтара кніг паэзіі "Хто можа схаваць агонь", "Сам сабе грэшны" і інш. Яго вершы ўвайшлі ў зборнік "Там, дзе вежы Сафіі". Вось адзін з іх:

Ты дарогі адвечнай
Не пытайся ні ў кога...
Кожны сам сабе грэшны,
Ну а потым — для Бога.

Чым раней прыйдзе разуменне таго, для чаго мы прыйшлі ў гэты свет, тым лягчэй стане жыць, тым хутчэй можна знайсці свой шлях да Храма.

Валянціна ШЧАРБАКОВА

Са Слоніма — на добрую памяць

«Трывогу нашу я ў сэрцы:
Зрабіў для Айчыны так мала
І сёння гатоў памерці,
Каб толькі яна існавала.»

Алесь БАРСКІ

Кніжкі такога "вузкага" жанру часцей за ўсё пішуцца на аматара, для калег па цэху ды гісторыкаў і краязнаўцаў. Але Сяргей Чыгрын умее пісаць шырэй азначанага жанру. Гістарычна аддалены час у яго тэкстах заўжды звязаны няўвіднай ніткай з сучаснай злабадзённасцю. Адбываецца натуральнае праламленне той ці іншай гістарычнай праблемы скрозь прызму нашай рэчаіснасці. Гэта закальцаванасць надае артыкулам аўтара змястоўную аб'ёмнасць і пэўную завершанасць. Хоць вядома, што гісторыя не мае пэўнасці і канчатковасці.

Зборнік "Беларуская Беласточчына", выдадзены Сяргеем сёлета ў выдавецтве "Кнігазбор", маючы канкрэтныя геаграфічныя абсягі, між тым, не мае межаў лёсавай вызначанасці сваіх герояў. Як піша ў прадмове намеснік галоўнага рэдактара тыднёвіка беларусаў у Польшчы "Ніва" В. Луба: *"Дзесяцігоддзямі замоўчваліся імёны многіх беларускіх дзеячаў, у тым ліку заходнебеларускіх, якія не прызнаваліся ні савецкай, ні польскай афіцыйнай прапагандай. "Ніва" на сваіх старонках паступова вяртала іх з забыцця, узнаўляла іх ідэі і дасягненні ў свядомасці беларускай грамадскасці Беласточчыны. У 1984 годзе да кола ніўскіх аўтараў далучыўся слонімскі журналіст, краязнавец і літаратар Сяргей Чыгрын. У выніку шматгадовага супрацоўніцтва з тыднёвікам "Ніва" з'явілася рубрыка "Родам з Беласточчыны", у якой аўтар знаёміў і знаёміць цяпер ніўскіх чытачоў з беларускімі палітычнымі, рэлігійнымі, культурнымі дзеячамі, таленавітымі літаратарамі, якія нарадзіліся на Беласточчыне або былі звязаны з Беласточчынай і сумежнай Гродзеншчынай. Гэтыя артыкулы, а таксама дапоўненыя, і склалі кнігу "Беларуская Беласточчына". Яна — доказ жывучасці беларускай ідэі не толькі на этнічнай Бацькаўшчыне, але і па-за яе межамі"*.

Імёны, няпростыя лёсы якіх адкрывае альбо па-новаму асвятляе сучаснаму чытачу С. Чыгрын, вельмі рознабаковыя па сферах сваёй дзяржаўнай, грамадскай, навуковай і творчай дзейнасці. Гэта больш як сорак выбітных асоб, сярод якіх ёсць даволі вядомыя (А. Карпюк, З. Верас, П. Макаль, П. Пестрак, Г. Новік, Х. Ільяшэвіч, Я. Міклашэўскі, В. Швед) і пакуль не надта (Я. Дашута, Б. Пачопка, Я. Варонка, М. Дзямідаў, У. Тамашчык, А. Гершун, С. Дубінскі, Б. Грабінскі, Я. Дарашкевіч, А. Неманцэвіч, В. Сакалоўскі, А. Лабовіч, М. Пецюкевіч) і шмат іншых. Да ўсяго дадам, што выданне мае даволі шмат якасных архіўных фотаілюстрацый.

Захоўваючы гістарычныя рэаліі, аўтар "вымалёўвае" сваіх герояў як звычайных людзей з усімі іх зямнымі пагрэшнасцямі. Ён спрабуе "ўладкаваць" іх духоўнасць у адзіны кантэкст вечнасці і не толькі "беларускай" (на гэтым фоне ўражвае спіс *"расстраляных беларусаў Беласточчыны на Бутаўскім палігоне"* пад Масквой у 1937—38 гадах). Я думаю, што літаратурны талент аўтара (а ён як паэт выдаў тры зборнікі вершаў: *"Шчырая Шчара"*, *"Горад без цябе"* і *"Лірыка"*) не звабіў яго ў бок мастацкай праўды, а толькі ўзмацніў вобразы яго герояў метафорыкай адметнага беларускага слова. Ды і літаратурны вопыт С. Чыгрына накладвае адмету пэўнай значнасці і важкасці на яго творы. Цягам свайго паўвекавога (у верасні гэтага года аўтару споўнілася 50 гадоў) жыцця ён выдаў цэлы шэраг літаратуразнаўчых і гісторыка-краязнаўчых кніг (*"Янка Купала і Слонімшчына"*, *"Родам са Слонімшчыны"*, *"Пакліканыя на родны парог"*, *"Чамяры і чамяроўцы"*, *"У пошуках слонімскіх скарбаў"*, *"Тэатр у Слоніме"*). Да таго ж уклаў зборнікі з літаратурнай спадчынай С. Грынкевіча, Ф. Грынкевіча, У. Казлоўшчыка (*"Вяртанне да сваіх"*), а таксама гістарычныя нарысы М. Шкялёнка (*"Беларусь і суседзі"*). Як для аўтара, які жыве і працуе ў правінцыі (Слоніме), С. Чыгрын робіць вельмі многа для захавання нашай духоўнай спадчыны. Калі б такія людзі былі ў кожным беларускім райцэнтры, то зямля наша ў вялікім свеце прырасла б і ўласнай айчыннай годнасцю, і сваёй шматвекавой культурай і гісторыяй.

А здавалася б, аўтар засяроджвае нашу ўвагу на звычайных людзях, якія ніякіх асаблівых гераічных подзвігаў і ўчынкаў не здзейснілі, а ўсяго толькі годна і чалавечна пражылі сваё беларускае жыццё. Нічога для сябе не патрабуючы, але многае са свайго пакідаючы нам. Уражвае артыкул пра доктара-венеролага з Зэльвы Янку Геніюша. Што гэта быў за чалавек, можна здагадацца з успаміну У. Калесніка, які гасцяваў у яго доме ў 1963 годзе разам з У. Караткевічам і Я. Брылём. Вось як неардынарна, у сваім стылі характарызуе яго вядомы берасцейскі крытык: *"Гэта быў задзірысты інтэлігент, прывыклы да асабістага суверэнітэту пад парасонам чэхаславацкай канстытуцыі, дзе пражыў добрыя два дзесяткі гадоў. Любіў ён дражніцца з субяседнікамі, пазіраючы на іх зверху. Свой арышт пасля вайны і ссылку ў Сібір Іван Пятровіч лічыў гвалтам над асобай, парушэннем грамадзянскіх свабод, а ўласныя палітычныя акцыі, якія і ў Еўропе падлягалі крымінальнай, а не маральнай ацэнцы, таксама называў сваёй асабістай справай. (...) Спрачацца з ім было бессэнсоўна, і Брыль першы, а мы за ім, перайшоў да ігнаравання гаспадарових задзірыстых выпадаў. Застаўшыся без апанентаў, Іван Пятровіч перайшоў ад палітыкі да паэзіі і выказаў добрую памятлівасць, знаёмства са зборнікамі беларускіх паэтаў, якія купляў ці не ўсе падрад. Ён меў памяць і на імёны, і на хлёсткія словы, на парадоксы, аксюмараны, гіпербалы. Не дзівіўся я пазней, даведаўшыся, што нашпігаванаму палітыкай і лірыкай урачу не ставала часу, а мо нават і ахвоты на медыцыну"*. С. Чыгрын, аднак, тут жа адзначыўшы "суб'ектыўнасць думкі У. Калесніка", дае слова Міколу Канашу са Жлобіна, каб па магчымасці больш аб'ектыўна ахарактарызаваць героя свайго артыкула (зрэшты, некаторыя тэксты зборніка, як і гэты, могуць прэтэндаваць і на жанр кароткага мастацкага нарыса): *"Іван Пятровіч працаваў лекарам у Зэльвенскай раённай паліклініцы, калі вярнуўся з Варкуты ў 1956 годзе. У яго кабінеце вісеў партрэт Скарыны, таму некаторыя хворыя пыталіся ў яго: "Хто гэта?" З усімі жыхарамі Зэльвы Янка Геніюш размаўляў толькі па-беларуску. Часам чуў, як хворыя, перш чым трапіць на прыём да яго, казалі: "З лекарам гаварыце толькі па-беларуску, бо не дасць асвабаждзення". (...) Іван Пятровіч быў вопытны доктар-практык. Ён добра разбіраўся ў неўралогіі, сексалогіі, венерычных хваробах, быў нядрэнны хірург і тэрапеўт, ведаў лекавыя травы. Зэльвенцы яго моцна любілі і цанілі..."*

І такіх яркіх неардынарных аўтарскіх хадоў у зборніку шмат, таму артыкулы С. Чыгрына чытаюцца з неаслабнай цікавасцю. Адчуваецца, што аўтар мае шырокі досвед у гістарычных і літаратурных аспектах беларускага нацыянальнага жыцця, што ён часты госць архіваў, бібліятэк, вядзе шырокую перапіску з людзьмі, датычнымі да герояў яго даследаванняў і артыкулаў. Да прыкладу, у матэрыяле пра вядомага паэта П. Макаля, нельга без душэўнага надрыву чытаць вытрымку з ліста яго ўдавы Галіны: *"Вось толькі сёння змагла выканаць Вашу просьбу. Мне цяжка пісаць, таму што я ў 1982 годзе перанесла інсульт. Я буду пісаць коратка, бо цяжка: я прыкавана да ложка. Наш сын Слаўка з Афганістана вярнуўся, дзякаваць Богу, жывы. Ён скончыў Белдзяржуніверсітэт, факультэт журналістыкі. Пры жыцці бацькі ў сына выйшла маленькая кніжка вершаў, не такіх моцных, як у Петруся, але хлопец ён добры і здольны. У мяне ўжо ёсць унук Лёшка. Вучыцца ў 7-м класе. Скардзіцца не буду, сын мне дапамагае, а больш ніхто: ні з Саюза беларускіх пісьменнікаў, ні адкуль... А жыццё, вы ведаеце, зараз не вельмі лёгкае. Ну, нічога, дасць Бог цярпенне, вытрымаем..."* Без каментарыяў. Напомню толькі, што П. Макаль — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы.

Вось гэтак склаліся і складваюцца лёсы выбітных беларускіх постацей з абсягаў Беласточчыны. І хіба толькі адтуль?! Добра, што дарэшты не забываем іх. Дзякуй, Сяргей, што ўпарта нам пра тое напамінаеш.

Леанід ГАЛУБОВІЧ

З радаводнай крыніцы

Такога, крынічнага, нельга не адчуць, калі пачынаеш знаёміцца з даследаваннем "Фамилии Калинового края" краязнаўцы Уладзіміра Лякіна – ураджэнца Хойніцкага раёна, былога вайскоўца, настаўніка, а цяпер супрацоўніка Калінкавіцкага краязнаўчага музея.

Зробленае аўтарам кнігі ўступным словам «Пра наш радавод» зычліва ўхваляе мэтр у гэтай справе пісьменнік Уладзімір Ліпскі, верачы, што выданне «ўзбудзіць памяць калінкавічан і яны пачнуць шукаць сябе і свой радавод у бязмежнай прасторы мінулай гісторыі. А значыць, задумаюцца, хто яны на гэтай зямлі, што ім дадзена ад продкаў, з якой місіяй яны прыйшлі ў свет жывых».

Даследаванне Ул. Лякіна складаецца з 9 раздзелаў. У першым («Гісторыя прозвішча») прыгадваюцца вядомыя факты працэсу станаўлення з'явы прозвішча ў многіх краінах свету ад старажытнасці і амаль да XX стагоддзя. На ўсходнеславянскіх землях тэндэнцыю фармавання прозвішчаў на аснове імён і мянушак даследчыкі пазначаюць пачаткам XV ст., калі князі і буйныя феадалы задумалі абфамільвацца па назве нашчадных уладанняў ці па імені заснавальніка роду, у большасці маючы канчаткі на «ович» (значыць, па-беларуску «авіч»). Мо і так, гісторыя не пакінула ж дакладнай даты, калі афіцыйна з'явілася першае прозвішча. Аднак Ул. Лякін, асвятляючы гісторыю ўзнікнення прозвішчаў на аснове старажытных родаў, праяўляе ўласцівую беларусам сціпласць і не агучвае, што род Рагвалодавічаў, заснаваны першым вядомым полацкім князем Рагвалодам, які жыў і дзейнічаў больш як тысячу гадоў таму, існаваў раней за Рурыкавічаў. Альгердавічы ды іншыя на «віч», якіх згадвае аўтар, былі на добрыя тры сотні гадоў пазней.

Адметна тое, што аўтар "выходзіць" з сівой, у многім зацемненай ды легендарнай даўніны на сённяшнюю калінкавіцкую рэчаіснасць і не паўтарае даўно вядомае, а, грунтуючыся на ўласных даследаваннях, падае своеасаблівую "біяграфію" некаторых мясцовых прозвішчаў. Скажам, не абазнанаму ў філалогіі чытачу будзе цікава даведацца, адкуль з'явіліся Рымарчукі (майстры коннай зброі), Палазнікі (спецыялісты па санях), Буднікі (рудакопы, смалакуры і інш.), Кушнеры (апрацоўшчыкі скур). Нават больш — часамі можна і філолага заваражыць. Вось — Салукі. Так і вабіць прыкінуць, што гэта — любіцелі такой смакаты, як сала. Печанага, варанага, прасоленага з рознымі пахкімі дадаткамі, вэнджанага. Ды не зусім так. Аказваецца, на Палессі «салам» называлі і вобмель, астравок на рэчцы ці ўзбярэжжа. Дык вось тых, хто жыў там, і назвалі Салукамі. Не выклікае пярэчання і тое меркаванне, што асобныя непрывабныя, часамі вельмі абразлівыя прозвішчы (асабліва сярод сялян) узніклі з-за "ласкі", гэта значыць, сваволля памешчыкаў (яны мужчынам цэлых вёсак ці давалі свае прозвішчы, ці ўпісвалі абразлівыя мянушкі), царскіх чыноўнікаў, вайсковых пісараў. Апошнія пераробленыя беларускія прозвішчы на рускі лад: скажам, Алейнік пасля сканчэння рэкруцтва дамоў вяртаўся ўжо Алейнікавым, Кухар — Кухаравым і г. д.

У другім раздзеле "Суфіксы-стваральнікі" Ул. Лякін падае таксама цікавыя звесткі: у Калінкавіцкім раёне жыве прыкладна 66, 2 тысячы насельнікаў, якія маюць 6 тысяч розных прозвішчаў. З суфіксаў сталі дамінуючыя на «овіч» («авіч»), «ік», «оў» («аў»), «скі», «энка», «чук», «юк», «еня» (дарэчы, аўтар, мабыць, слушна падкрэслівае, што прозвішчы тыпу Міхаленя лічацца спрадвечна беларускімі і ў іншых народаў не сустракаюцца). Некаторыя прозвішчы дадаліся ад беларуска-ўкраінскага суседства, а таксама ад перасяленцаў з-за межаў Беларусі. У цэлым, на думку даследчыка, на калінкавіцкі арэал прозвішчаў "папрацавала" каля 40 суфіксаў. Гэты раздзел працягвае наступны — «Прозвішчы ад імені». Тут аўтар нагадвае: беларускія лінгвісты падлічылі, што больш як палова нашых прозвішчаў з'яўляюцца вытворнымі ад 240 мужчынскіх імён, што трапілі да нас са шматлікіх замежных моў.

Раздзел «Гонар прозвішча» асабіста я назваў бы рызыкоўным. Хто ж не хоча патрапіць у лік мясцовых (і шырэй) знакамітасцей? Ул. Лякіна цалкам можна зразумець і падтрымаць, калі ён, напрыклад, дае кароткія біяграфіі славутых продкаў, узнагароджаных ордэнамі і медалямі ўдзельнікаў Другой сусветнай вайны, слаўных людзей працы, пяра і пэндзля, хоць, безумоўна ж, гэты спіс можна было б доўжыць і доўжыць. Ды вось мне не зусім зразумела, чаму ў гэты ганаровы рэестр не патрапілі тыя, хто нарадзіўся ў Калінкавічах ці ў раёне, але вядомы і за межамі нашай Беларусі? Маюцца на ўвазе вядомыя пісьменнікі, дзеячы культуры і мастацтва. Сярод іх, да прыкладу, — пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Віктар Казько (яго прозвішча магло з'явіцца ад Кузькі альбо Кузьмы, якіх на калінкавіцкай зямлі было нямала).

Безумоўна, "Фамилии Калинового края" — грунтоўная, значная праца, яна, без ніякага сумнення, — натхняльны прыклад і для іншых даследчыкаў з нашых рэгіёнаў. Пацвярджае гэта і заключны раздзел "Крыніцы і літаратура", прагледзеўшы які можна пераканацца: для працы карпатліва адшукана шмат змястоўных матэрыялаў, у прыватнасці, з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Генрых ДАЛІДОВІЧ

Тамара МАЗУР

Запавет

Не прадаць, не зганьбіць,
не пакінуць
Роднае і крэўнае ў бядзе.
Запавет такі рыхтую сыну,
Каб сабе не здрадзіў між людзей.

Хай паганцы, выродкі, шакалы
Заскуголяць злосна па вуглах.
Мой ты сынку, гэта вельмі мала
Мець іскрынкі добрыя ў вачах.

Мала выпадковую падкову
Над дзвярыма новымі прыбіць.
Сынку, гэта так недастаткова
Не згубіць, не ўкрасці, не ўгнявіць.

Мала не судзіць, не спакушацца,
Не манахі шчаснымі былі.
Так патрэбна вольным называцца
На святой ад прадзедаў зямлі.

Мой ты сынку! Ні сцягі, ні зоркі
Не гартуюць гэтак пачуццё,
Як да родных ніваў і узгоркаў
Хіліцца пяшчотаю жыццё.

Бласлаўляю ў шлях цябе нялёгкі,
Дзе лаўровы не дадуць вянок.
Дый навошта ён нашчадку з вёскі,
Іншы табе трэба, мой сынок.

Той, які каханая жанчына
Жартам пакладзе на валасы.
Мой ты любы,
мой ты родны сыне,
Для цябе —
Радзімы галасы.

Мала на руках не мець аковаў.
Што з той волі, як душа маўчыць?
Трэба сваёй любай роднай мовай,
Як бясцэнным дарам даражыць.

Больш жадаць нічога не бяруся.
Многа —
без граху і без спакус.
Мала нарадзіцца беларусам,
Трэба, сын мой, жыць як беларус.

Існасць

Лермантаў, Купала,
Пастарнак....
Мне душу радком
святарным лечаць.
Я ж сама не вынайду ніяк
Выхад з кола
непатрэбных рэчаў.

Непатрэбны гонар і прэстыж,
Непатрэбны гучныя пасады.
Ёсць сям'я і дом мой... А Парыж
Ці Стакгольм —
часовая прынада.

Ёсць сяброўкі, верныя сябры
Тут, у светлай, чыстай Беларусі.
Тут, дзе думы гушкаюць бары,
Ні на кога з хціўцаў не злуюся.

Кожнаму — сваё,
з усімі — Бог.
І не праўда —
ён пароўну дзеле:
Некаму ж багацце як астрог,
І высокі чын —
вугор на целе.

У мяне — ні грошай, ні чыноў,
Проста так сама ў сабе варуся.
За свайго і за чужых сыноў
Кожны вечар
перад сном малюся.

Важней кахання

А што было важней кахання —
Крынічкі чыстай пачуцця?
Важней за ўсё было чаканне
Народзін новага жыцця.

Важней за ўсё было цвіценне
Пяшчоты ў патаемны час,
Калі прыходзіла натхненне,
Каб памірыць няверных нас.

Важней было не ўпасці духам,
Каб уцалеў, ажыў паэт.
Каб жаль жалобы або скруха
Не зацямнілі белы свет.

Важней за ўсё было маленне
У кут загнанае душы,
І покліч чыйсці
ў час здранцвення:
Ўставай, змагайся і пішы.

Важней было апроч кахання
Пражыць жыццё сваё наўздзіў.
І мець святое дараванне
Да тых, хто ганьбіў і судзіў.

Вольга САКАЛОВА

* * *

Ах ты, вёсачка мая, тры хаціны —
Тры жанчыны, тры ўдавы,
тры слязіны...
Я да кожнае зайду, пасумую.
Добрым словам сэрцы іх пашкадую...

Ты заві мяне, заві, краю мілы —
Прылячу дамоў, лячу,
хоць без крылаў...

Я на вёсачку сваю надзіўлюся.
Ўжо былога не знайду, зажуруся...
Ах ты, вёсачка мая, вёска-знічка,
Наталенне ты маё і крынічка...

Ты заві мяне, заві, краю мілы —
Прылячу дамоў, лячу,
хоць без крылаў...

Дзе ты, вёсачка мая, тры хаціны —
Тры жанчыны, тры ўдавы,
тры слязіны?
Дзе ты, вёсачка мая, сіраціна —
Тры каліны, тры двары,
тры сцяжыны...

Ты заві мяне, заві, краю мілы —
Прылячу дамоў, лячу, хоць без крылаў...

* * *

Я гартаю старонкі мінулага,
Што ізноў паплылі ў мае сны,
Даўніною і сэрцам прачулыя –
То — валошкі, а то — палыны...

То — святочныя, цёплыя, — лецека!
То імжа, халады, туманы...
Успаміны і быль — пераплецены —
Мая доля... Мой шлях... Мае рукі...

На зламанай галінцы пасохлі лісты...
На забытай сцяжынцы чужыя сляды...

* * *

Сукенка белая,
А косы русыя —
Іду, нясмелая,
Сцяжынкай вузкаю...

Калоссе спелае
У паклон схіляецца,
Са мной, нясмелаю,
Яно вітаецца:

Куды красуня, йдзеш?
Куды спяшаешся?
Каму вянок віеш?
З кім сустракаешся?

Каму вянок віла,
Таго не стрэціла...
А доля міма йшла
З касой расплеценай...

Сукенка белая,
А косы русыя...
Іду, нясмелая,
Сцяжынкай вузкаю...

* * *

Як знайсці тыя словы,
Што маглі пра каханне сказаць?
Па гаях ды дубровах
Разышліся яны сумаваць...

Як знайсці тую сцежку,
Што каханне ў мой сад прывяла?
Чаму гэтак паспешна
Ды травою густой парасла?

* * *

Засцілала абрусам,
Паркалём і шаўкамі
Тую сцежку-спакусу,
Што лягла паміж намі.

А мы сцежачку-квецень
Не сумелі адолець,
Разышліся па свеце,
Каб не ўбачыцца болей.



Алесь ЧОБАТ

Лес

адкуль дарога пайшла і знікла?
адтуль дзе канец
і пачатак за краем
круціцца круціцца доўгая нітка
цягнецца вечар і дзень дагарае

спакой — гэта лес
і пясок дарогі
спіць сабе розум —
на Стыксе човен
стракочуць нябачна адны сарокі
свет жоўты зялёны
чырвоны чорны

не заблукае хто пойдзе
ў свет белы
птушцы і зверу
паверыць прарочым
кожны знойдзе
свой дом дзе светла
калі паспее даехаць да ночы

час ляціць — чалавек даганяе
як нітка за голкай
вечна і звыкла
адна дарога ў цемры знікае —
калі яе згубіш як голка нітку

Мікалас Канстанцінас Чурлёніс

сын арганіста з Друскенікаў
хата іх на вуліцы недалёка возера
у самым куце

дзень за днём ствараецца Свет
на дабро і на зло
гучыць у паўторах фугаў
аддаецца рэхам
у санатах сонца і мора
allegro andante scerco finale
адзін чалавек і чатыры пары года —
народзіны лета жыццё і смерць

спачатку было Лета
вужом заснуў у Нёмане розум
і ў сон розуму паўстала
наша Зямля
чалавек на ёй
можа быць а можа не быць —
vita brevis patria aeterna

таму збіраюцца совы
на крыжах Жамойці
і праз сон
уздыхае арган

Скідзель

Не хачу вяртацца нідзе.
Не бывае смерці спакойнай.
А палова жыцця прайшла
і палова душы прапала
паміж "тут бэньдзе Польска
як была пшэд войном"
і "я радзілась вот здзеся,
хоць папа прыехал с Урала".
Гэта Скідзель —
як скудзель, мясціна мёртвых,
якія жывуць, і жывых,
якія даўно паўміралі.
Сюды нават марксізм не прыйдзе.
Не тутэйшая мода.
І няма дзе блукаць —
ад эстэтыкі да маралі.

Па аўторках і чацвяргах
брук таптаць у мястэчку
паміж лужынаў
і зламаных акацый,
на жывых і на мёртвых,
як на сябе ў люстэрку,
з нараджэння да смерці
штодзень натыкацца...

Сасна і бяроза

дзве дачкі аднаго пяску
сасна і бяроза
нехта чужы схаваны
доўга маўчыць
за густой хмарай
так маўчаць на мове мёртвых —
бо лёгка сказаць
але страшна падумаць
бо гэта галодны
думае што ён галодны
а мёртвы думае
а навошта ўсё тое
было так доўга

а тут над кручай
толькі адзін наравісты
вецер шуміць
але далёка шуміць
і ні слова не разабраць

Малітва на кожны год

Божа,
не дай мне веры ў чужы падман —
і так я лішне ласы на словы.

Божа,
не дай мне хваробы розуму —
каб абагнала хваробу цела.

Божа,
не дай мне смерці ніводнай
тых людзей,
каго маю і хто мае мяне.

Фота Кастуся Дробава

Містэрыя ценяў

Яўген МІКЛАШЭЎСКІ

Псіхалагічная навела

Я сядзеў на ніжняй прыступцы каменных сходаў, якія вялі з напаўпадвальнага памяшкання ў двор. Побач стаяў Міхась, які не адыходзіў ад мяне ні на крок. Мікола, падышоўшы хуткім крокам да нас, сказаў: "Хуткая" выехала..." "Давай паспрабуем выйсці ў двор", — прапанаваў Міхась. Да мяне працягнуліся дзве пары рук, каб дапамагчы падняцца і стаць на ногі. "Я паспрабую сам..." Я рэзка падняўся, аднак пранізлівы боль кінуў мяне зноў на прыступку. Праз хвілінудзве пад'ехала "хуткая", і мяне павезлі ў бальніцу. У якую — я не спытаў. Неўзабаве мы спыніліся, і я апынуўся ў прыёмным пакоі. Праз некалькі хвілін прыйшла медсястра і ўзяла ў мяне з пальца кроў. Праз хвілін дзесяць вярнуліся санітары, дапамаглі перасесці на насілкі, і мы паехалі зноў. "У дзевятую?" — спытаў адзін з іх. Другі хітнуў галавой. На гэты раз ехалі доўга. Паўтарылася тая ж працэдура. Праз хвілін дваццаць мяне павезлі далей — дадому. "У вас ёсць нехта, хто мог бы за вамі паглядзець?" — "Няма", — адказаў я.

Па дарозе маўчалі. Я сказаў, як заехаць у двор. Ключы былі ў кішэні курткі (якая неабачлівасць! Я ж мог іх згубіць), я адчыніў уваходныя дзверы, і мы ўвайшлі ў пад'езд (калі больш дакладна, мяне ў яго ўцягнулі). І я адразу ж апусціўся на першую лесвічную прыступку.

— Мы вельмі спяшаем... Хто-небудзь будзе ісці, і вам дапамогуць, — сказалі мне. Я застаўся адзін.

Нечакана дзверы адчыніліся, і ў пад'езд зайшла маладая цыганка. У апошні час некалькі разоў сустракаў яе ў нашым пад'ездзе. Яна заўсёды падкрэслена-ветліва віталася са мной. Інакш бы, магчыма, я і не запомніў яе.

— Добры вечар, — прамовіла яна. — Цяпер мы вам паможам.

Я не паспеў падумаць, хто гэта "мы", як у пад'езд зайшоў таксама малады мужчына. Ён быў вышэй сярэдняга росту, з худым бледным тварам і чорнымі валасамі, якія злёгку кучаравіліся. Ён узяў мяне пад пахі. Я пачаў аднеквацца.

Я адчыніў дзверы, і мяне ўвялі ў кватэру. Пачаў дзякаваць, але мае выратавальнікі сыходзіць не спяшаліся. Я раптам успомніў, што гэтыя людзі два з паловай ці тры гады таму заходзілі да мяне і пыталіся, ці не збіраюся я здаваць ці прадаваць сваю кватэру. "Мы б зрабілі рамонт", — сказалі яны. "Рамонт — гэта добра", — адказаў тады я.

"Можна, мы паглядзім вашу кватэру?" — спытаў незнаёмец. Ці мог адмовіць ім пасля таго, што незнаёмцы зрабілі для мяне?

Канчаткова пераканаўся, што зусім не магу хадзіць. І калі яны пайшлі ў другі пакой, я застаўся стаяць, прыхіліўшыся спінай да сцяны калідора.

— Вы добра іграеце на скрыпцы? — пачуў я голас незнаёмца.

"Дзе ён убачыў скрыпку?" — падумаў я. Потым убачыў, што скрыпка ляжала на крэсле, адразу за дзвярыма ў пакой.

— Іграў "Цыганскія напевы".

Прызнацца, я чакаў, што ён спытае: "Сарасатэ?" Але ён нічога не спытаў і неўзабаве выйшаў з пакоя разам са сваёй спадарожніцай.

Застаўся адзін. "Трэба ж зачыніць дзверы", — падумаў.

Я лёг і хутка заснуў. Спаў я да вечара наступнага дня. Зрэдку прачынаўся і адразу ж засынаў зноў. Памятаю, што снілася адно: увесь час блукаў. Блукаў па нейкіх лабірынтах, пустках, канавах. І ўсё ад нечага ці кагосьці ўцякаў. Разпораз трапляў у безнадзейнае становішча, з якога не было выйсця. І тады прачынаўся, але хутка правальваўся зноў у трывожную бездань з адною і тою ж думкай: а дзе ж выйсце? Аднак неадкладныя патрэбы чалавечага арганізма ўрэшце адарвалі мяне ад пасцелі, і я адразу ж сутыкнуўся з непазбежнай рэальнасцю: я ж амаль не магу хадзіць.

Перасохла ў роце, і смага прымусіла шукаць якое-небудзь пітво. У кухні на стале паўтаралітровая бутэлька малінавай "Дарыды". Успомніў, што святло на кухні ўключаецца з калідорчыка, і, кранаючыся сценкі рукамі, пайшоў да выключальніка. Святло было такое зыркае, што на момант асляпіла. Адразу ж убачыў, што "Дарыды" на стале не было. Замест яе... на чыстай белай паверхні з самага краю стала ляжала скрыпка грыфам да мяне, а на ёй — смычок. Па абодва бакі грыфа стаялі дзве паўлітровыя бутэлькі. Адна, з белай празрыстай вадкасцю, была надпітая. Другая, з напоем колеру марской хвалі — непачатая. Я схапіў яе і, адкруціўшы корак, зрабіў некалькі глыткоў (напой быў прыемны). (Пазней успомніў, што калі адкручваў корак, павінен быў пачуцца абавязковы хруст, але яго не было). "А што, цікава, у гэтай ужо адкаркаванай бутэльцы?" — падумаў я і, доўга не разважаючы, таксама зрабіў глыток. Потым сахапіўся і ледзь устрымаўся, каб не апаражніць яе ўсю. І на адной, і на другой этыкеткі былі на незразумелай мове.

Нават не падумаў, што трэба патэлефанаваць брату. Ён, не дазваніўшыся да мяне на працягу двух дзён, пачне біць трывогу. Не паспеўшы легчы, зноў праваліўся ў чарадзейную бездань сну. Прачнуўся, як прачынаўся звычайна, — у восем гадзін. Мяне не пакідала думка — забраць са стала бутэлькі і куды-небудзь схаваць. Гэты намер з'явіўся, відаць, у сне. І я пайшоў адразу на кухню. Бутэлек на стале... не было. Скрыпка і смычок ляжалі на месцы — там дзе былі і вечарам. А пасярэдзіне стала стаяла "Дарыда". Мне захацелася праверыць, ці зачынены ўваходныя дзверы. Дзверы былі зачыненыя.

Прачнуўшыся, я доўга ляжаў, апанаваны незразумелым страхам. Здавалася, восьвось расчыняцца дзверы і ў кватэру зойдуць няпрошаныя госці. І ў гэты час рэзка зазваніў тэлефон. Гэта быў Павел. У двух словах распавёў, што са мною здарылася і чаму нікому не пазваніў. "Я толькі што гаварыў з Колем... Ён некуды паехаў, але хутка вернецца. Папрасі, каб прыехаў да цябе і прывёз што-небудзь паесці..." Я так і зрабіў. Коля сказаў, што прыедзе гадзін у пяць.

У мяне ўсё балела — і спіна, і ногі, і косці, і мышцы, балела нясцерпным болем, і трываць гэты боль было немагчыма. Здавалася, што ў кватэру прабраліся і затаіліся ў ёй нейкія людзі, і я баяўся, што калі прыедзе Коля і нічога не ведаючы, зойдзе ў кватэру, яны адразу ж нападуць на яго, а я, скаваны болем, нічым не змагу памагчы.

Неўзабаве прагучаў званок. Адчыніў дзверы. Гэта быў Коля. "Ты на лесвіцы ні з кім не сустрэўся?" — спытаў я. "Ні з кім... А што?" — "Мне здалося, што нехта спускаўся з пятага паверха". — "Не, нікога не было".

У якім я быў стане, можна меркаваць па тым, што хацеў папрасіць Колю паглядзець, ці нікога няма ў кватэры. Гэта, бясспрэчна, галюцынацыі — і слыхавыя, і зрокавыя. Яны паўтарыліся праз два дні. А на працягу гэтых двух дзён былі зусім іншыя галюцынацыі. Відовішчныя.

Папрасіў Колю напітак і малако паставіць у халадзільнік, а хлеб і батон пакласці на кухонны стол.

— Ты не заўважыў, у паштовай скрынцы нічога няма?

— Не глянуў. Калі трэба, схаджу...

— Вазьмі ключы.

Ключы, дастаўшы з кішэні курткі, я паклаў на халадзільнік.

Коля збегаў уніз і прынёс другі нумар "Полымя".

— Калі мне прыйсці? — спытаў брат, развітваючыся.

— У панядзелак. Мне павінны прынесці пенсію.

Коля пайшоў, і я адзін застаўся ў кватэры, населенай таемнымі прывідамі.

Сваёй рэзідэнцыяй я вырашыў зрабіць першы пакой. Там, акрамя ложка, насупраць якога стаялі дзве кніжныя паліцы, быў яшчэ і халадзільнік. Часопісны столік і тэлефон знаходзіліся ў другім пакоі.

Сеў на ложак і, уключыўшы святло, пачаў праглядаць "Полымя". Нейкая думка адцягнула ўвагу, і я ўбачыў, як да мяне, павялічваючыся ў памерах, набліжаецца партрэт незнаёмца — мужчыны гадоў трыццаці, з чорнымі валасамі і вусамі. Ён падміргваў і ўсміхаўся. Я глянуў убок і ўбачыў некалькі гэткіх жа партрэтаў, і чым яны былі далей, тым здаваліся меншымі. Раптам адзін з гэтых партрэтаў, на якім на момант затрымаў позірк, крануўся з месца і пачаў набліжацца, ажываючы і жэстыкулюючы. На ім быў той малады мужчына з вусамі. Калі ён перастаў рухацца, я зірнуў убок — там былі такія ж партрэты, на рознай адлегласці і рознай велічыні. І адзін з іх нечакана зрушыўся з месца і паволі паплыў да мяне. Я саскочыў з ложка і глянуў вакол: з усіх бакоў, ажываючы і павялічваючыся ў памерах, да мяне набліжаліся загадкавыя партрэты. Былі сярод іх і жаночыя. Заплюшчыў вочы — партрэты прапалі. А расплюшчыў — з'явіліся зноў...

Наступны дзень выдаўся халодны і змрочны. Па кватэры снаваў прыцемак. Я ляжаў на ложку, дзверы пакоя былі адчынены, і на калідорчыку ў бок другога пакоя прамільгнуў цень, пачуліся дзіцячыя галасы. Потым усё сціхла. "Трэба запаліць святло, і яно будзе асвятляць калідорчык" — падумаў. Потым адзін за адным мільгнулі два цені з другога пакоя, і як быццам пачуўся нейкі смех, але ён умомант абарваўся. А я ляжаў і адчуваў сябе абсалютна бездапаможным.

Мае пакуты спыніў сон, які, як снежная лавіна, невядома адкуль зваліўся на ахопленую трывогай свядомасць...

Калі я праходзіў па калідорчыку, уваходныя дзверы нячутна адчыніліся, і ў кватэру з ключамі ў руцэ зайшоў незнаёмец. Ён быў вышэй сярэдняга росту, усходняй знешнасці, з бледным прадаўгаватым тварам, на шчоках — чорнае шчацінне. Убачыўшы перад сабой мяне, ён на імгненне прыпыніўся, зачыніў за сабою дзверы і, нібыта нічога не здарылася, сказаў:

— Я ўчастковы ўрач, прыйшоў вам дапамагчы...

Убачыўшы, што мой погляд прыкаваны да яго правай рукі, у якой ён трымаў ключы, няпрошаны госць сказаў:

— У мяне ключы ад усіх замкоў...

— А адкуль вы ведаеце, што мне патрэбна дапамога? — спытаў, не адводзячы позірк ад рукі з ключамі.

— Мне паведамілі ў хуткай дапамозе. Давайце, я вас агледжу і прапішу абязбольваючыя ўколы. Думаю, у вашым пад'ездзе знойдуцца жанчыны, якія маглі б зрабіць укол. Ну хоць бы ваша суседка — кінуў у бок суседняй кватэры...

Ён раптам змяніў тэму размовы і спытаў:

— Вас не праследуюць страхі?

— Страхі? — перапытаў я. — Што там страхі? Учора ўвесь вечар па калідорчыку, тут, дзе мы стаім, снавалі дзіцячыя прывіды...

Ён нечакана спытаў:

— Можна прайсці ў гэты пакой?

— Праходзьце.

Мне хацелася прайсці за ім. Аднак я не мог ступіць і кроку, і падтрымлівала мяне толькі перагародка калідора. Аднак у пакоі ён доўга не застаўся, паспешлівым крокам прайшоў паўз мяне і, нічога не сказаўшы, выйшаў з кватэры. І вось тут мяне па-сапраўднаму апанаваў страх — містычны, незразумелы, нерэальны. Я прайшоў у пакой і лёг. І гэтая скрыпка на кухонным стале з дзвюма бутэлькамі невядомага напою, і потым знікненне гэтых бутэлек са стала, і з'яўленне на ім малінавай "Дарыды" — усё гэта пахіснула маю ўстрывожаную псіхіку. І я пакутліва шукаў тлумачэнне ўсім гэтым таямніцам. Адказ быў толькі адзін. Без чалавека тут не абышлося. Можа, дарэмна "не прыпёр" да сценкі гэтага таемнага ўчастковага доктара, у якога былі ключы ад усіх замкоў? Мае думкі перапыніў нейкі шум: здалося, што ціхенька рыпнулі ўваходныя дзверы і ў напрамку іх ледзь прыкметна ўскалыхнулася светлавая гама, як быццам нехта ўвайшоў у кватэру. Я ціха прайшоў да дзвярэй, у калідорчыку нікога не было, але напаўадчыненыя дзверы ў першы пакой варухнуліся, як быццам нехта іх прычыніў ці, калі больш дакладна, адчыніў шырэй: за дзвярыма была вешалка з адзеннем. Я імгненна вырашыў выклікаць міліцыю.

Прыехалі амаль адразу. Чакаў ля дзвярэй, седзячы на табурэтцы. Ахоўнікі парадку зазірнулі ў першы пакой, а потым, папрасіўшы дазволу, у другі. "Прабачце, — сказаў я, — мне цяжка хадзіць. З вашага дазволу прысяду на табурэтку". "Прысядзьце, — прамовіў старшы. — Дык што ў вас здарылася?" Я сказаў: "Дык дзе ён?" Я хацеў сказаць, што ён, мабыць, пайшоў, пакуль выклікаў міліцыю. Тады ахоўнік парадку сказаў: "Ты, стары... з памаракам у галаве ад пісанняе вершаў..." Я быў літаральна ашаломлены, аднак выслухаў яго тыраду да канца і толькі, нібы між іншым, сказаў: "Я цяпер не пішу вершаў..." Ён на гэта нічога не адказаў. Тым не менш, пачатак размовы быў за ім. Я чамусьці праігнараваў абразу. Якая нячыстая ці чыстая сіла, які касмічны інтэлект кіравалі маімі ўчынкамі — не ведаю і цяпер.

Сабраўшыся з думкамі, я сказаў: "Уявіце сабе... бачыў на ўласныя вочы, з адлегласці двух метраў, як перада мной адчыніліся дзверы і без стуку, без званка ў дзверы, у кватэру з ключамі ў руцэ зайшоў незнаёмы чалавек. Ён сказаў мне: "Я... участковы ўрач. Прыйшоў вам дапамагчы..."

Ахоўнікі парадку маўчалі. Старшы, нечакана лагодна прамовіў: "Давайце мы дамовімся з вамі так: вы спачатку пераканайцеся, хто і чаго без дазволу зайшоў да вас у кватэру, і тады выклікайце нас".

Я зачыніў за імі дзверы.

...Маё абуджэнне было невясёлым. Расплюшчыўшы вочы, убачыў, што ляжу на нарах — у клетцы метровай, калі не меншай, шырыні, на голых дошках. Было мулка, і ўсё цела балела, недзе цьмяна пабліскавала лямпачка. Як мог апынуцца тут — у гэтым памяшканні і на гэтых нарах? Усё мне было знаёма, і я пачаў успамінаць, што тут ужо быў. Асабліва запомнілася нябачная цьмяная лямпачка. Няўжо я ў міліцыі? Як трапіў сюды? Добра памятаю, што ахоўнікі парадку, якіх выклікаў, пайшлі, і я зачыніў за імі дзверы. Што адбылося потым? Яны вярнуліся і забралі мяне з сабою? За што? На хвіліну свядомасць мая згасла. Я, відаць, задрамаў. Расплюшчыўшы вочы, убачыў, што ў памяшканні пасвятлела — пачало світаць. Перада мною — белы кухонны стол. Справа, у самым куце, бялела ракавіна, а за ёю — газавая пліта, далей — кухоннае акно... Дык гэта ж мая кухня! Радасць, што дома, надала мне моцы і я, абапёршыся на локці, падняў галаву і агледзеў кухню. І адразу ж паспрабаваў устаць на ногі. Але ўстаць не мог. "Трэба крыху адпачыць і паспрабаваць зноў..." Але хутка пераканаўся, што не толькі не магу стаць на ногі, але і нават зрушыцца з месца. Ад смагі зліпліся губы. Дзе ж халадзільнік? Помніў, што там ёсць кефір і газіраваная вада. Але як да яго дайсці?

Стомлены, я непрыкметна заснуў. Калі прачнуўся, кухню запаўняў вечаровы змрок. Па-ранейшаму ў калідоры мігцела лямпачка, адкідваючы на кухню палоску святла. Свядомасць праяснілася, і я ведаў, куды трэба рухацца. Але дарога з кухні ў мой першы пакой была неймаверна доўгая, і, дабіраючыся туды, аблiваўся ліпкім потам. Змучаны, прысланіўся спінай да кніжнай паліцы і пасля некалькіх спроб адчыніў халадзільнік. Апаражніўшы амаль цалкам бутэльку з газіраванай вадой, дастаў кефір. Я адчуў, што сіла паступова пакідае мяне, і гэта будзе... найхутчэй за ўсё... мая апошняя ноч. Вось і ўсё...

Арт-пацеркі

Народнай артыстцы Беларусі Галіне Арловай споўнілася 80. А ў 2009-м будзе роўна паўстагоддзя, як прыйшла яна ў калектыў купалаўцаў. Пачатак жа яе творчага шляху звязаны з Нацыянальным акадэмічным тэатрам імя Якуба Коласа (дзе, дарэчы, паznаёмілася са спадарожнікам свайго жыцця — акцёрам Мікалаем Яроменкам). Разнапланавыя сцэнічныя вобразы, створаныя Галінай Арловай, заўсёды вызначаліся эмацыянальнасцю і псіхалагічнай глыбінёй. Сярод іх Лідачка ("Вяселле Крачынскага" А.Сухаво-Кабыліна), Афелія ("Гамлет" У. Шэкспіра), Маша ("Жывы труп" Л. Талстога), Ганна Андрэеўна ("Рэвізор" М. Гогаля), Зуйчыха ("Страсці па Аўдзею" М.Бутрамеева)... У ліку іншых работ — ролі ў радыёспектаклях "Рыбакова хата" паводле Якуба Коласа і "Хамуціус" паводле Аркадзя Куляшова, за якія актрыса была адзначана Дзяржаўнай прэміяй Беларусі ў 1984 г. Галіну Арлову павіншаваў з юбілеем Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы яе вялікі ўнёсак у развіццё айчыннай культуры.

Паказ лепшых стужак з праграмы IV Міжнароднага каталіцкага фестывалю хрысціянскіх фільмаў і тэлепраграм "Магніфікат", што прайшоў летам у Глыбоцкім раёне, наладзілі ў Віцебску. На экране тутэйшага Дома кіно дэманстраваліся дзве дакументальныя работы: лепшы фільм фестывалю "Дзяўчаткі, дзяўчаткі" ўкраінскай студыі "Лествица" (сцэнарыст Ігар Сабко, рэжысёр Аляксандр Сталяроў), "Свет простых душой" латышскага рэжысёра Ганны Масленікавай ды мультыплікацыйная стужка на беларускай мове "Свеціць Бэтлеемская зорка" (сцэнарыст Ірына Жарнасек, рэжысёр Юрый Гарулёў). Такая акцыя пад назвай "Рэха "Магніфіката"" праводзілася ўжо трэці раз. Яна адбываецца ў розных гарадах, уваход у кіназалу вольны.

У харэаграфічным калектыве Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі — радасныя навіны. Добра вядомыя гледачам маладыя артысты Кацярына Алейнік і Дзяніс Клімук атрымалі катэгорыю "Вядучы майстар сцэны". А іх малодшаму калегу, улюбёнцу публікі Івану Савянкову (на здымку ён у спектаклі "Бахчысарайскі фантан") нададзена катэгорыя "Саліст балета".

Выстаўку "Краю мой любы" зладкаваў Літаратурны музей Максіма Багдановіча. У экспазіцыю ўвайшлі жывапісныя работы Дзмітрыя Сарокі — майстра рэалістычнага пейзажу, спадкаемцы традыцый І. Ахрэмчыка, Н.Воранава, В. Грамыкі, Х. Ліўшыца. А ў выставачнай зале Дома-музея І з'езда РСДРП экспануецца графіка выкладчыка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Рамана Кароткіна. Пад назвай "Паўза, шчасце, танец" прадстаўлена 30 віртуозных і трапяткіх малюнкаў, натхнёных антычнымі матывамі.

С. ВЕТКА

Акцёрскае крэда Сяргея Жураўля

Імя заслужанага артыста Беларусі Сяргея Жураўля на працягу многіх гадоў застаецца адметным не толькі для калектыву Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра.

Яго акцёрскі талент запатрабаваны і ў кіно, і на радыё, і на тэлебачанні, і ў антрэпрызах. Яго голас гучыць на тэлеканале СТБ. Сяргей Журавель з'яўляецца мастацкім кіраўніком "Альфа − Радыё". Яго ведаюць па ролях у тэлефільмах і серыялах: "Пантэра", "Неба і зямля", "Пайсці і не вярнуцца", "Каменская", "Мужчыны не плачуць", «Скульптар смерці», «Пабочны эфект». А тэатралы захоплена абмяркоўваюць ігру ўлюбёнага акцёра ў спектаклях "Тарцюф", "Прадавец дажджу", "Акадэмія смеху", "Несцерка", "Банкрот", а цяпер і ў нядаўняй прэм'еры — "Прыдуркаваты Журдэн" (пастаноўка М. Абрамава паводле М. Булгакава). Сяргей Журавель пагадзіўся падзяліцца сваімі тэатральнымі назіраннямі, меркаваннямі, прафесійным досведам з чытачамі "ЛіМа".

— Сяргей Барысавіч, віншую вас з прэм'ерай у Маладзёжным тэатры, і з гэтай нагоды ў мяне не зусім звычайнае пытанне. У тэатры змянілася не адно пакаленне акцёраў, рэжысёраў, а вы засталіся. Чым растлумачыць такую адданасць?

— Быў перыяд, калі з'явілася жаданне сысці: не меў новай цікавай работы, але з прыходам у кіраўніцтва тэатра Мадэста Абрамава становішча змянілася. З'явіліся сапраўды добрыя спектаклі, людзі пачалі працаваць. Я адразу ўключыўся ў працэс, калі мы працавалі над спектаклем "Акадэмія смеху". Мадэст Мадэставіч высока прафесійны рэжысёр, які валодае адчуваннем драматургіі і, што вельмі важна, ён умее знайсці падыход да кожнага акцёра.

— У спектаклі "Акадэмія смеху", як і ў апошняй прэм'еры, герояў нельга назваць толькі камічнымі. У іх характарах ёсць нешта трагічнае. Вам сапраўды ўдаюцца трагікамічныя героі. Чым яны блізкія вам? Можа, Абрамаў знайшоў падыход да вас менавіта праз трагікамічнасць?

— Мне падабаецца гэты жанр. У жыцці да ўсяго трэба ставіцца з гумарам, але прымаць і адмоўнае з гонарам. Трагікамедыя спалучае ў сабе і гумар, і трагічнасць таго, што нам не па сілах змяніць ці здзейсніць. Я знаходжу сапраўдную асалоду, калі выношу на сцэну такія вобразы. Камічны герой выглядае проста дурнем, калі не спрабуе разабрацца, чаму ў яго жыцці адбываецца ўсё менавіта так, а не іначай. Толькі спробы нешта змяніць і трагічнасць гэтых спроб робяць яго цікавым і жывым. Трагікамедыя — вельмі глыбокі жанр, які дазваляе мне як акцёру раскрыцца напоўніцу.

— Вы згодны з тым, што на некаторыя спектаклі прыходзяць толькі з-за вас?

— Згодны, мне пра гэта кажуць часта. Але тэатр — гэта не толькі акцёр, а месца, дзе спалучаецца калектыўная праца. Без рэжысёра, партнёраў па сцэне, тэхнічнай часткі спектакль не атрымаецца. Гэта вялікі механізм і вынік вялікай працы кожнага з нас, хто працуе ў тэатры. Калі вырваць з усяго механізма хаця б адзін вінцік, ён можа зламацца. Такі закон тэатра.

— У Маладзёжным тэатры знікаюць спектаклі, якія, на маю думку, былі вельмі каштоўнымі для яго творчасці, для гледача — як, напрыклад, "Трамвай "Жаданне". На вашу думку, ці не страчвае тэатр нешта важнае?

— Я так не думаю. Тэатр павінен змяняцца, як змяняюцца і яго акцёры. Я лічу, што ніводны спектакль не можа існаваць на сцэне болей за той тэрмін, калі ў ім, напрыклад, можа існаваць акцёр. Саракагадовы чалавек не можа іграць падлетка; калі акцёр выходзіць з пэўнага ўзросту ці проста стамляецца, нельга яго трымаць у нейкай ролі. З'яўляюцца новыя абставіны, новыя ролі. Калі казаць пра мяне, то спектакль "Тойбеле і яе дэман" я мушу іграць апошні сезон. Гэтай пастаноўцы 10 гадоў, і мае фізічныя сілы і ўзрост не дазваляюць знаходзіцца на ранейшым узроўні. Будынак Маладзёжнага тэатра неўзабаве закрыюць на рэканструкцыю, і я думаю, што будзе правільным вярнуцца туды з новымі намерамі.

— Але не толькі Маладзёжны тэатр спрыяе раскрыццю вашага таленту. Без тэатра Мікалая Пінігіна ці раскрыўся б Сяргей Журавель як акцёр?

— Безумоўна, знаёмства з Пінігіным для кожнага акцёра — падарунак лёсу. Калі мы сустрэліся, у Маладзёжным тэатры быў крызіс, ад некаторых спектакляў я мусіў адмовіцца. Якраз тады на працягу некаторага часу ў межах праекта "Мікола тэатр" мы з Пінігіным зрабілі пяць спектакляў. Адным з іх стала самая для мяне значная пастаноўка "АРТ", якую Мікалай прапанаваў перад тым, як з'ехаць у Пецярбург. У гэтым спектаклі былі занятыя мае сябры і вялікія акцёры — Віктар Манаеў ды Ігар Забара.

Вельмі важна акцёру знайсці свайго рэжысёра, а рэжысёру — акцёра. Таму з Пінігіным я працягваю кантакты. Мы выпусцілі новы спектакль "Як пасварыліся Іван Іванавіч з Іванам Нікіфаравічам" паводле Гогаля, дзе я іграю ў партнёрстве з Віктарам Манаевым.

Мне вельмі блізкі гумар Пінігіна. Мы разумеем адзін аднаго з паўслова. І я лічу гэтага рэжысёра залатым фондам нашай краіны: ад'езд Мікалая ў Пецярбург — каласальная страта для беларускага тэатра.

— На тэлеканале СТБ вы толькі агучваеце закадравыя тэксты. А ў ролі тэлевядучага выступіць у вас няма намеру?

— Раней я вёў праграму "Лёс чалавека" на тэлеканале "Лад", вопыт у мяне ёсць. Усё залежыць ад цікавых прапаноў і вольнага часу.

— Напэўна, хутка выйдзе на тэлеэкран новы беларускі серыял з вашым удзелам. Мяне вельмі заінтрыгавала назва: "Цень самурая". Гэта фільм пра нейкія падзеі, звязаныя з усходняй краінай?

— Падзеі адбываюцца ў звычайным санаторыі, якіх вельмі многа і ў Беларусі, і ў Расіі. На тэрыторыі санаторыя абвяшчаюць каранцін. Ніхто з яго тэрыторыі выехаць не можа. А тут яшчэ здараецца некалькі забойстваў. Як шукаюць забойцу, я распавядаць не буду: фільм трэба глядзець. Дэтэктыў не можа быць цікавы, калі ты ўсё пра ўсіх ведаеш.

Скажу толькі, што ў мяне роля злачынцы.

— Вы аднойчы сказалі, што выбарча ставіцеся да прапанаваных вам роляў у кіно. Ці не таму, што ад іх патыхае гэткай аднатыпнасцю адмоўнага персанажа?

— Так, мне прапануюць шмат аднастайных роляў. Таму, калі я бачу нешта незвычайнае, як, напрыклад, беларускі мюзікл "Паўлінка new", то згаджаюся. Сёлета тэлеканал АНТ падрыхтаваў чарговы навагодні сюрпрыз з маім удзелам: "Батлейка-2009", таксама мюзікл, у аснове яго байкі Кандрата Крапівы. У галоўных ролях — зоркі беларускай эстрады і тэатра.

— Што вам бліжэй: сцэна тэатра ці здымкі ў кіно?

— Я лічу сябе тэатральным акцёрам, але кінамастацтва мне таксама вельмі блізкае. І тое, і другое ўсё роўна звязана з прафесіяй акцёра. Я многае зразумеў, выходзячы на тэатральную сцэну, і веру, што ў кіно мяне таксама чакаюць ролі, якія зменяць маё ўяўленне пра жыццё.

Андрэй КЛЮЧНІКАЎ

Рыбы плюс люстэркі...

У сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адбылася адметная падзея: два вядомыя беларускія мастакі — магілёўскі жывапісец Ю. Несцярук і мінскі графік-віртуоз Ю. Падолін (абодва Юрыі Міхайлавічы!) прадставілі на суд грамадскасці свае апошнія арыгінальныя мастацка-філасофскія праекты пад назвамі "Рыбны дзень" і "Люстэркі", нязвыкла адзначыўшы такім чынам і свае асабістыя юбілеі-вяхі: кожны мастак справіў сёлета сваё 50-годдзе.

Агульная тэма творчага роздуму ўжо сталых аўтараў — шматаблічны, неабсяжны Сусвет. Нешта яднае, на думку Ю. Несцярука, Чалавека і... Рыбіну. "Чорная рыбіна на цьмяным фоне", "Белая рыбіна ў светлай вадзе", "Бліскаўкі на твары мора", "Супольнасць", "Адценні"... Што нам вядома (акрамя сухой канстатацыі нейкіх абмежаваных навуковых фактаў) пра жыццё акіяна, свет рыб? Наваколле, Рэчаіснасць, як сёння відавочна, наогул не заўсёды ўкладаюцца ў штучныя стандарты...

Фармальна-стылістычная ўмоўнасць вонкавага "аздабленя" мастакоўскай задумы менш уласцівая творчасці Ю. Падоліна. Майстар разнастайных тэхнік афорта, ён прайшоў школу выдатных айчынных і замежных мастакоў-графікаў, неаднойчы наведваў найбуйнейшыя еўрапейскія музеі, выхаваны на класічных узорах і традыцыях. Разам з тым, яго "Люстэркі" — шматзначны, асацыятыўны, напружаны паводле зместу, гуманістычна скіраваны цыкл — вельмі актуальны, сучасны. Жанчына — ідэал майстра і адначасова быццам само "люстэрка быцця": прыгожага, гарманічнага, нязведанага...

Аляксандр РУНЕЦ

Споўнілася 90 гадоў з дня нараджэння заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Іосіфа Абраміса.

"Ён гарэў, як паходня, асвятляючы ўсё навокал", — так гаварылі калегі-музыканты пра Іосіфа Абраміса. Тэатр. Опера. Класічная музыка. Дырыжорскі пульт. Усё гэта былі для яго сінонімы слова "жыццё". Жыццё, якое Іосіф Самуілавіч прысвяціў самаадданаму служэнню вялікай музыцы. Яго шчасце было ў цяжкай, але ўлюбёнай працы, калі няма ніводнай вольнай хвіліны, калі нават ноччу, пасля цэлага дня стараннай працы над музычнымі творамі, трэба рабіць у студыі новыя запісы. Шчасцем было — наблізіцца да ідэалу ў справе, якой прысвяціў жыццё. І важнай часткай формулы шчасця для яго з'яўлялася сям'я. Дзе любяць і заўсёды гатовы падтрымаць.

І музыка становіцца жыццём

Таццяна Якімовіч, дачка дырыжора, з хваляваннем гартае сямейныя фотальбомы. Яна таксама, як і тата з мамай, музыкант, педагог, выкладае ў музычнай школе. Натхнёна расказвае мне пра свайго бацьку. І нібы ажывае мінулае: Мінск, Траецкае прадмесце, невялікі пакойчык, у якім жыла сям'я будучага дырыжора.

— *У таты было складанае дзяцінства,* — пачынае свой расповед Т. Якімовіч. — *Яго бацька меў добры голас і спяваў у хоры опернага тэатра. Але аднойчы ён, нечакана для сваіх родных, пакінуў дом, з'ехаўшы з нейкай гастрольнай аперэтачнай трупай. Мой бацька застаўся адзін з хворай мамай. Але яна заўважыла ў сына музычныя здольнасці, і хлопчык пачаў вучыцца ігры на валторне ў ваенна-музыканцкай школе.*

Далейшая музычная адукацыя Іосіфа Абраміса была вельмі грунтоўная: скончыў музычнае вучылішча, падчас вучобы ў якім працаваў ужо ў аркестры БДТ-1 (цяпер Купалаўскі тэатр), потым паступіў у Беларускую дзяржаўную кансерваторыю і адначасова працаваў у аркестры опернага тэатра.

— *Вось фота, на якім тата з мамай, Ірынай Мікалаеўнай, у 1939-м годзе.Сустрэліся яны падчас вучобы ў музычным вучылішчы. Перад вайной маці з татам, студэнты кансерваторыі, жылі ў маленечкім пакойчыку ў Траецкім прадмесці. Туліліся там усе: мае бацькі, іх мамы, а таксама мамін брат. Калі пачалася вайна, бацькі якраз здавалі выпускныя экзамены ў кансерваторыі. І раптам — вестка, што будзе бамбёжка. Удваіх пайшлі за горад, а назад іх не пусцілі. З вялікімі цяжкасцямі на перакладных дабіраліся да Ташкента, дзе бацьку, нарэшце, узялі ў армію. Усю вайну ён прайшоў сувязістам, за баявыя заслугі быў узнагароджаны медалямі і ордэнам. І толькі пры канцы вайны давялося вярнуцца да музыкі. А маці заставалася ў Ташкенце, працавала ў дзіцячым доме. Тата дасылаў ёй лісты з фронту, у адзін з іх нават уклаў ноты песні з камантарыем, як трэба яе выконваць... Пасля вайны бацькі разам вярнуліся дамоў у Мінск. І аказалася, што маміны родныя жывыя, а бацькаву матулю забралі ў гета...*

♫

Пасля вайны І. Абраміс шмат вучыўся. Другі раз паступіў у кансерваторыю — на дырыжорска-харавое аддзяленне.

— *У яго быў верны тыл — мая маці. Яна аддана чакала бацьку з вайны, а пасля дала мачымасць вучыцца. Хаця ўжо нарадзілася я, і трэба было карміць сям'ю. Дзеля гэтага маці працавала, здаецца, на дзесяці работах! Бацька таксама працаваў вельмі шмат: акрамя вучобы, працы ў аркестры і хормайстарскай работы, ён удзельнічаў у запісах фанатэкі Беларускага радыё (пісалі ноччу, калі ў горадзе ціха). Але, нягледзячы на такі цяжкі рытм, бацька ўсё вытрымаў: вельмі хацеў стаць дырыжорам. Паехаць кудысьці вучыцца і кінуць сям'ю не мог, а яркіх педагогаў у нашай кансерваторыі на той час не было, даводзілася вучыцца на ўласнай практыцы. Яму ніколі не было сумна ў тэатры, ён наведваў чужыя рэпетыцыі, усе спеўкі, сядзеў у балетнай зале... А калі раптам узнікалі нейкія цяжкасці, з парога ўсё расказваў маці — і заўсёды знаходзіў яе падтрымку.*



♫

Таццяна Іосіфаўна ўспамінае свайго бацьку як чалавека вельмі вясёлага, дасціпнага, з маладосцю ў характары — усялякі канфлікт на рэпетыцыі ён мог "разрадзіць" анекдотам, а яго трапныя жарты нават цытавалі музыканты аркестра; любіў "падурэць" з малой дачкою, пайграць з ёю ў бадмінтон...

— *А яшчэ тата быў вельмі смелым і рызыкоўным чалавекам: ёсць нават узнагарода ад міліцыі за тое, што ён затрымаў злачынцу! Заўсёды імкнуўся ўсё рабіць сам і не перакладваць на іншых. Помню, мы ехалі з мора, і да нас у вагон пасадзілі жанчыну з хлопчыкам, у якога была перавязаная галава. Іх цягнік з дакументамі і грашамі ад'ехаў. Увесь вагон слухаў гэтых гаротнікаў і спачуваў, а тата з мамай проста дапамаглі грашамі ды накармілі... А вось у музыцы тата быў кансерватар: ён абагаўляў класічную музыку ва ўсіх яе праявах, усё астатняе называў "джазікі". Самаахвярна любіў оперны тэатр, і, думаю, тое, што яго вымусілі пакінуць любімую працу, скараціла яго жыццё...*

♫

Калі І. Абрамісу пасля сыходу з опернага тэатра прапанавалі ўзначаліць аркестр тэатра музычнай камедыі, ён спачатку жахнуўся, што давядзецца працаваць у лёгкім жанры. Але згадзіўся, і болей як тры гады змагаўся за павышэнне музычнага ўзроўню маладога тэатра. Людзі дасведчаныя зразумеюць, наколькі гэта было складана: несталічная трупа, няўдалы склад аркестра, нервовая атмасфера ў калектыве... Нягледзячы на гэта, пад музычным кіраўніцтвам І. Абраміса тады быў пастаўлены шэраг цікавых твораў, сярод якіх ужо на сцэне новага будынка тэатра з'явіліся і "Несцерка" Р. Суруса, і "Лятучая мыш" Я. Штраўса.

— *Бацька быў здольны вельмі хутка схопліваць новы музычны матэрыял і з лёгкасцю чытаў партытуру з ліста. Гэта рэдкая і вельмі каштоўная прафесійная вартасць, уласцівая далёка не ўсім дырыжорам. Таму ён мог замяніць практычна любога свайго калегу на любым спектаклі. Як добрага дырыжора бацьку не раз запрашалі паехаць у іншы горад і нават у іншую краіну, але такія прапановы ён адразу адмятаў, бо вельмі сур'ёзна ставіўся да сваёй працы ў Мінску. А працаваць даводзілася з многімі вядомымі людзьмі: Вано Мурадэлі, Арамам Хачатуранам, Алегам Маралёвым, Дзмітрыем Смолічам, Зіновіем Бабіем, Нінэль Ткачэнкай, Ігарам Сарокіным, Мікалаем Ворвулевым. Калі, напрыклад, ставілі балет "Спартак", прыязджаў і сам Арам Хачатуран. Сядзеў у нас дома за сталом, потым іграў свой вальс да спектакля "Маскарад". А на прэм'еры "Спартака" кампазітар сам прадырыжыраваў першай карцінай і потым саступіў пульт майму бацьку. Сучасныя кампазітары вельмі добра да яго ставіліся, бо бацька не навязваў сваю канцэпцыю, а імкнуўся зразумець аўтара. Выканаўцы паважалі дырыжора Абраміса за тое, што ён заўсёды рабіў так, каб ім было зручна, каб аркестр не заглушаў спевакоў, каб ансамбль гучаў зладжана. Ён вельмі добра ўмеў прыбіраць чыесьці хібы. А вось нашы сумесныя музычныя заняткі ніяк не атрымліваліся. Калі ён садзіўся побач са мной, праз дзве хвіліны чуліся заўвагі. У мяне на вачах з'яўляліся слёзы, прыходзіла бабуля і разводзіла нас у розныя бакі. Бацька быў катэгарычна патрабавальны ў прафесіі і лічыў, што яго дачка павінна граць бездакорна. Але менавіта за такі дасканалы падыход да выканальніцкай працы яму былі ўдзячныя многія спевакі.*

♫

Чаго ў іх сям'і не было, дык гэта вялікага дастатку і назапашвання. Яны з прыемнасцю адпачывалі на курорце, з радасцю прымалі гасцей і самі хадзілі ў госці. А ў побыце ўсё было надзвычай сціпла.

— *Бацькі імкнуліся, зразумела, каб усе былі нармальна апранутыя, але ніякага золата, ніякай касметыкі. Тата з абурэннем "выгаворваў" мяне за тое, што я пасля 20 гадоў пачала карыстацца памадай. Так, побыт быў вельмі хлебасольны, але просты. Затое які цікавы! Пры магчымасці тата браў мяне з сабой на гастролі. Ніводная тэатральная прэм'ера таксама не праміналася. Мы ўсёй сям'ёй рэгулярна хадзілі на канцэрты класічнай музыкі. Дома была вялікая оперная фанатэка. Спектаклі, якія тата ставіў, ён слухаў у розных выкананнях, а я яшчэ да прэм'еры вывучвала ўсё напамяць...*

♫

Люты 1984-га. Ужо хворы, Іосіф Самуілавіч не здраджваў любімай справе; наколькі мог, працаваў над клавірам "Алека" С. Рахманінава, марыў паставіць гэтую оперу ў канцэртным варыянце...

Іосіф Абраміс нямала часу аддаваў і студэнтам: шмат гадоў выкладаў у Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Сярод яго вучняў нямала вядомых сёння музыкантаў: М. Казінец, М. Фінберг, Л. Іваноў, В. Валатковіч, З. Шаціла... Адным з любімых студэнтаў быў галоўны дырыжор Канцэртнага аркестра "Няміга", якога І. Абраміс нават лічыў сваім "унукам".

Прыгадвае А. Сасноўскі: "У Магілёўскім музычным вучылішчы я вучыўся ў выдатнага педагога, прафесара Леаніда Іванова — вучня Іосіфа Абраміса. Калі паступіў у кансерваторыю, першая сустрэча з Іосіфам Самуілавічам мяне ўразіла: я ўбачыў вельмі маладога і энергічнага, нягледзячы на сівізну, чалавека. Настолькі жывога і яркага! Я акунуўся ў мора гумару і фантазіі, і ўзнікла адчуванне, што мы знаёмыя ўжо даўно. Пазней, на наступнай прыступцы сваёй адукацыі, калі я вучыўся ў Ленінградзе ў геніяльных педагогаў Эдуарда Грыкурава, Ільі Мусіна і Юрыя Цемірканава, мне не давялося нічога ламаць: аказалася, Абраміс з Івановым мыслілі і вучылі так, як гэта было ў вялікай піцерскай школе! Увогуле, Іосіф Самуілавіч за нядоўгае жыццё стварыў і сваю, беларускую, дырыжорскую школу — шкада, што тэарэтыкі нашай музычнай культуры яшчэ не распрацавалі гэтую тэму.

♫

У беларускім музычным мастацтве ён гарэў, як паходня... І ніколі не згасне яркае святло яго творчасці.

Вольга НАВАЖЫЛАВА

На здымках: І. Абраміс з дачкой Таццянай; Р. Пукст, І. Абраміс, А. Маралёў, Э.Агняцвет у час працы над операй "Марынка".

Апетая паэтам

Паміж творчасцю і самазабыццём у жыцці піяністкі Ірыны Шумілінай, напэўна, можна паставіць знак роўнасці: яе вылучае рэдкасная адданасць сваёй прафесіі — і Мастацтву...

Колькі ж дзесяцігоддзяў мінула з таго часу, як яна, выпускніца нашай кансерваторыі, вучаніца прафесара Р. Шаршэўскага, скончыла аспірантуру ў Маскве ды прыйшла працаваць у Беларускую дзяржаўную філармонію... Аднак, не будзем лічыць — колькі. Гадоў мінула, вядома ж, нямала. І падзей за кожным годам багата, хаця б таму, што жыццё саліставі філармоніі само па сабе неспакойнае. Вандроўнае. Што ўжо казаць пра яго нябачную частку — прыхаваную дыялектыку ўнутранага свету, дзе ў няспынным руху душы нараджаюцца мастацкія вобразы, паміж якімі ўзнікаюць няпростыя дачыненні. Жыццё гэтых вобразаў пераўвасабляецца ў ігру, якая так захапляе прыхільнікаў выканальніцкага мастацтва І. Шумілінай.

Інтэнсіўную канцэртную дзейнасць заслужаная артыстка Беларусі І. Шуміліна спалучае з працай над папаўненнем рэпертуару. А ён у піяністкі надзвычай вялікі і адлюстроўвае ўвесь спектр піяністычнай літаратуры: ад манументальных фартэпіянных канцэртаў да камерных мініяцюр. Асаблівая ўвага — да музыкі беларускіх кампазітараў: М. Аладава, А. Клумава, П. Падкавырава, Л. Абеліёвіча, Я. Глебава, І. Лучанка... Заўсёды эфектна і кранальна гучыць у яе выкананні "Мінскі вальс" М. Шуміліна — бацькі Ірыны...

З'явіўся ў рэпертуары І. Шумілінай цыкл Яна Тарасевіча "Музычныя табакеркі", які яна з энтузіязмам прапагандуе ў розных аўдыторыях. Прадставіць гэтую вытанчаную, крохкую музыку, распавесці пра незвычайны лёс кампазітара Яна Тарасевіча піяністку сёлета запрашалі ў сталічны Дом дружбы на сустрэчу, наладжаную Польскім інстытутам у Мінску.

А вось на мінулым фестывалі "Адраджэнне беларускай капэлы" выступленне І. Шумілінай каменціраваў заслужаны артыст краіны прафесар Віктар Скорабагатаў. Многія чыталі ў колішніх лімаўскіх нататках ды манаграфіі В. Скорабагатава пра тое, як у 1993-м яму прапанавалі азнаёміцца з асабістым архівам музыканта, які жыў у Польшчы, вызнаваў сябе беларусам, пісаў творы на беларускія тэксты, выкарыстоўваў беларускія народныя тэмы...

З таго, ужо легендарнага, "чамадана нот" Яна Тарасевіча і выйшлі "Музычныя табакеркі" — узор самабытнага арт-мінімалізму, серыя унікальных п'ес, якія з гэткай ювелірнай дасканаласцю перастварыла Ірына Шуміліна, знайшоўшы асаблівую манеру філіграннай апрацоўкі фартэпіяннага гуку, перадаўшы ірэальны вобраз жывога механізма, "голас" якога выклікае шчымлівыя настальгічныя пачуцці...

Калісьці на канцэрты І. Шумілінай хадзіў паэт Сяргей Грахоўскі. Аднойчы ён прынёс у рэдакцыю "ЛіМа" не паэтычную падборку, а толькі адзін лірычны верш, напісаны пад ураджаннем ад выступлення піяністкі. Гэты ўзнёслы верш, прысвечаны Ірыне Шумілінай, дагэтуль застаецца самай дарагой і яркай рэцэнзіяй на яе выканальніцкую творчасць.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Фота аўтара

№ 50 12 снежня 2008 г. ЛіМ

Мара пра бессмяротнасць

У нашай краіне творчасць лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры ў 2008 годзе французскага пісьменніка Жана-Мары Гюстава Леклезіо вядома нямногім. Ён атрымаў сусветнае прызнанне за развіццё новых напрамкаў, адлюстраванне паэтычных прыгод і пачуццёвага экстазу, даследаванне чалавечай сутнасці па-за межамі існуючай цывілізацыі і ўнутры яе.

Пісьменнік нарадзіўся 13 красавіка 1940 года ў Ніцы. Яго бацька, медык англійскага ўрада ў Нігерыі, паходзіў з брэтонскай сям'і. Продкі пісьменніка пакінулі Францыю ў XVIII стагоддзі, хаваючыся ад праследаванняў арміі рэвалюцыянераў, у якую прадзед Леклезіо не пажадаў уступіць. Па дарозе ў Індыю яны асталяваліся на востраве Маўрыкій. Пасля анексіі вострава Вялікабрытаніяй сям'я стала лічыцца англійскай. Роднасныя і духоўныя сувязі аўтара з гістарычнай радзімай ярчэй за ўсё праявіліся ў яго аб'ядноных у трылогію раманах "Залаташукальнік" ("Le chercheur d'or", 1985), "Падарожжа на Радрыгес" ("Voyage a Rodrigues", 1986) і "Каранцін" ("La Quarantaine", 1995). Апошнія раманы пісьменніка "Рэвалюцыі" ("Révolutions", 2003), "Афрыканец" ("L'africain", 2004) і "Уранія" ("Ourania", 2006) таксама прысвечаны гісторыі яго рода.

Леклезіо вырас у двухмоўнай сям'і (бацька — англічанін, а маці — француженка). Будучы пісьменнік аддаў перавагу французскай мове, выявіўшы такім чынам пратэст супраць каланізацыі вострава Маўрыкій. Праз крэольскі дыялект французскай мовы Леклезіо далучыўся да старажытнай культуры індзейцаў, гвалтоўна перавезеных французамі для працы на цукровых плантацыях. Пастаянныя пераезды ў сувязі з сямейнымі абставінамі і своеасаблівы погляд на грамадства спарадзілі ў ім пачуццё адчужэння ў адносінах да Францыі. Дзякуючы маўрыкійскім і брэтонскім (Брэтань — вобласць на паўночным захадзе Францыі) каранням Леклезіо адчувае сябе астраўлянінам, гэта значыць чалавекам, які займае прамежкавае становішча паміж сушай і морам.

Выдатным творцам напісана каля пяцідзесяці кніг, сярод якіх раманы, творы для дзяцей, а таксама філасофскія эсэ. Беларускаму чытачу гэты аўтар вядомы па рускамоўных перакладах некаторых яго твораў, у тым ліку раманаў "Пустыня" ("Desert", 1980, прэмія Поля Марана) і "Падарожжы па той бок" ("Voyages de l'autre côté", 1975). У часопісе "Иностранная литература" (2000, № 9) была надрукавана яго дакументальная аповесць "Дыега і Фрыда" ("Diego et Frida", 1994). У Беларусі пераклад апавядання Ж.-М.Г. Леклезіо "У пошуках прыгоды" надрукаваў часопіс "Всемирная литература" ў 2007 годзе. Кожны з гэтых твораў цікавы і арыгінальны. Але гэта толькі малая частка таго, што напісана Леклезіо з 1963 года, калі яго літаратурны дэбют — раман "Пратакол" ("Le procus — verbal", 1963) прынёс пачынаючаму аўтару прэмію Рэнадо (у Францыі гэта другая па значнасці прэмія пасля Ганкураўскай) і прызнанне чытачоў. У нашай літаратуразнаўчай навуцы да гэтага часу раманы Ж. -М.Г. Леклезіо не атрымалі належнага крытычнага асэнсавання.

На пачатку творчасці фонам для раманаў Леклезіо служыў горад, да якога аўтар ставіцца дваяка. На думку пісьменніка, у мегаполісе чалавек не можа паўнавартасна развівацца ў асабістым плане, бо яго розум і ўспрыманне павінны адпавядаць перакананням таго ці іншага грамадства. Недахоп эмацыянальных уражанняў выклікае ў яго персанажаў неасэнсаванае хваляванне і штурхае да пошукаў новай маральнай апоры. Такім чынам, блуканне героя рамана ў мегаполісе становіцца метафізічным працэсам пазнання сябе ў гэтым свеце. Леклезіо, іранізуючы над самой формай заходнееўрапейскага ўпарадкавання грамадства, якое бачыць асобу як сукупнасць імя, расы, месца нараджэння і г.д., кідае выклік літаратурнай традыцыі.

Сёння можна сказаць, што думкі крытыкаў, якія яшчэ ў 1967 годзе назвалі пачынаючага аўтара "адчайным хлопцам", не апраўдаліся. У 1980 годзе ён напісаў "песню ва ўслаўленне жыцця і міру" — раман "Пустыня", у якім сучаснай рэчаіснасці супрацьпастаўляюцца вечныя каштоўнасці і чалавецтва набліжаецца да агульнай гармоніі. У вобразе гераіні рамана Лалы мы бачым чалавека, які ўпарта жыве па законах продкаў. Леклезіо лічыць, што ўплыў Еўропы на больш старажытныя цывілізацыі не адназначны. Так, структура рамана "Анічча" ("Onitcha", 1991), прысвечанага старажытнаегіпецкай культуры, адлюстроўвае задумку аўтара паказаць адрозненні ў мысленні, разуменні і мастацкім асэнсаванні прасторы і часу ў Старажытным Егіпце і ў Старажытнай Грэцыі. Леклезіо параўноўвае еўрапейскую культуру з іншымі, разглядаючы два спосабы пісьма як дзве формы стаўлення да свету.

Літаратурны набытак Леклезіо можна лічыць формай крытыкі еўропацэнтрызму як філасофіі пераваг і распаўсюджання еўрапейскай культуры па ўсім свеце. Пісьменнік пашырае жанравыя межы мастацкага твора. У яго адметнай філасофіі, поўнай загадкавасці для еўрапейскай свядомасці, перамяшалася ўсё: Біблія і індзейская міфалогія, будызм і рускі пакланенне перад прыродай, адчуванне абсурднасці быцця і "вецизм" "новага рамана", дасягненні навукі і старажытнае знахарства.

Для нас бясспрэчна цікавы прынцып дыялога Захаду і Усходу, які яскрава прадстаўлены ў творчасці Ж-М. Г. Леклезіо. Для пісьменніка Усход, гэтак жа як і Захад, гэта частка адзінай культуры чалавецтва, а таму менавіта іх крокі насустрач і ўзаемная павага могуць даць перспектыву мірнай будучыні на Зямлі. Творчасць Леклезіо як мастацкае ўвасабленне магчымага дыялога Захаду з Усходам прапаноўвае выйсце з гуманітарнага тупіка, спароджанага неразуменнем чужых сацыяльных устояў. У мастацкай форме пісьменнік адлюстроўвае ідэю ўзаемапранікнення дзвюх ментальнасцяў.

У пазнанні законаў Сусвету Ж-М. Г. Леклезіо прапаноўвае прыбегнуць да пачуццёвага вопыту. Усё, што жыве на Зямлі, існуе ў часе і прасторы, і чалавеку, які знайшоў агульную мову з Сусветам, адкрываецца гармонія светабудовы. Практычна гэта азначае адкрыццё новага свету, невядомага раней еўрапейскаму чалавеку. Аўтар аб'ядноўвае некалькі сюжэтаў, каб легенда і рэчаіснасць "ажывілі" адна адну. У яго творах іншы раз адчуваецца нейкая недаказанасць, бо размова ідзе не аб прадметах быту, а пра тое вечнае, што існуе нязменна — як у далёкія часы міфаў, так і цяпер.

У раманах Леклезіо выяўляецца адна з найбольш характэрных рысаў сучаснай літаратуры — тэндэнцыя да перапрацоўкі і актуалізацыі міфаў. Пісьменнік знаходзіць натхненне ў самых розных міфалогіях — іудзейскай, старажытнаўсходняй, егіпецкай, індыйскай, мусульманскай. Леклезіо выкарыстоўвае міфы як унутраную мову псіхікі, з дапамогай якой усталёўваецца гармонія паміж чалавекам, прыродай і культурай. У тэкстах яго раманаў часта сустракаюцца вобразы птушак, гэта звязана з самымі старажытнымі ўяўленнямі аб здольнасці лётаць як далучанасці да надзвычайнага, боскага. Мара чалавека ператварыцца ў птушку сустракаецца ў егіпецкай міфалогіі, маўрыкійскіх легендах, будызме, мусульманстве, а таксама і ў еўрапейскай культуры. Неадольнасць прыродных законаў параджае жыццесцвярджальны матыў творчасці Леклезіо — мару аб бессмяротнасці і веру ў перасяленне душ і рэінкарнацыю.

Сталы перыяд творчасці Леклезіо (пачынаючы з сярэдзіны 1980-х гадоў і да цяперашняга часу) уяўляе сабой складанае спалучэнне традыцый і наватарства. У прозе гэтага перыяду біяграфія пісьменніка прадстаўлена ў форме моўнай гульні, звязанай з гісторыяй яго сям'і.

Сюжэтная лінія трылогіі (раманы "Залаташукальнік", "Падарожжа на Радрыгес" і "Каранцін") грунтуецца на рэальных фактах: пошуку скарбаў дзедам пісьменніка і магчымай сустрэчы яго продкаў з французскім паэтам Арцюрам Рэмбо. Паказальна, што пачатак трох раманаў адносіцца да аднаго часу — 1891 года.

Раманы Леклезіо маюць два планы прачытання — жыццёва-будзённы і сімвалічны, які з'яўляецца постмадэрнісцкай абалонкай, насычанай міфалагемамі і літаратурнымі алюзіямі. Чытач здзяйсняе ілюзорнае падарожжа праз часавую мяжу ў розных перыядах культурнай рэальнасці. У мастацкую тканіну твора ўплятаюцца вобразы з Біблії, антычныя вобразы, эпохі Сярэднявечча і рамантызму. Паўторнае засваенне такіх сюжэтаў, іх пераплаўка ў новае сэнсавае адзінства вядуць да ўзбагачэння мастацкіх формаў новымі значэннямі.

Пісьменніка хвалюе праблема свабоды асобы. Ён лічыць, што навакольнае асяроддзе дапамагае чалавеку разняволіцца і адчуць уласную моц.

Зусім нядаўна Леклезіо зноў звярнуўся да сюжэтаў сваёй маладосці. У рамане "Уранія" дзеянне разгортваецца ў Лацінскай Амерыцы. Галоўны герой географ Даніэль Сіліто шукае вёску, дзе быццам бы існуе ідэальнае грамадства і пануюць свабода і справядлівасць.

Гэта нагадвае герою дзіцячую кніжку пра Старажытную Грэцыю, у якой напісана, што ва Ураніі, нябеснай краіне, менавіта так і жылі. Ён адшуквае гэта паселішча на захадзе Мексікі, аднак гармонія ва ўтапічнай краіне, якая створана па мадэлі Афін і жыве "па-за часам", будзе нядоўгай. "Радужны (вясёлкавы) народ", які прымаецца многімі за хіпі, падпадзе пад пераслед з-за незвычайнай мовы, якая служыць для спеваў і гукавой гульні, з-за вольналюбівага імкнення жыць як хочацца. Урэшце сюжэт рамана ператвараецца ў дзівоснае падарожжа ва ўласнае дзяцінства.

Прозу Леклезіо адрознівае абвостраная цікавасць да агульначалавечых праблемаў. Яго сталыя раманы можна прызнаць як маральны эксперымент, асэнсаваны ў мастацкай форме. Гістарычная канкрэтыка не з'яўляецца важнай для аўтара. Яго героі чэрпаюць жыццёвыя сілы з прыродных крыніц. У характары чалавека, на долю якога выпалі цяжкія выпрабаванні, адначасова спалучаюцца маральная сіла і адсутнасць волі ў прыняцці рашэння. У працэсе станаўлення герой разумее, што сапраўдная свабода заключаецца ў наяўнасці выбару. Чалавек здагадваецца, што канкрэтны выбар вызначае ўсё яго будучае, калі аказваецца адзін на адзін з прыроднымі стыхіямі і можа параўнаць імгненнасць яго быцця на гэтай зямлі і вечнасць невычарпальнай матэрыі.

Творчасць Леклезіо прыпала на мяжу эпох, на перыяд культурнага крызісу. На думку пісьменніка, пры ўсім багацці стылістычных прыёмаў літаратура з'яўляецца перш за ўсё сродкам пазнання чалавекам самога сябе і навакольнага асяроддзя. Відаць, менавіта таму аснова сюжэтных тэм, характэрных для творчасці Леклезіо апошніх гадоў, — пошук героем сэнсу жыцця і спроба вяртання ў мінулае дзеля яго пераасэнсавання.

Ганна КВАЧЭК

Праведнік — таксама стваральнік

"Жыць спадзявайся, а паміраць рыхтуйся", "Страхаў шмат, а смерць адна", "Што душа прыпасла — на той свет панесла" — некаторыя з упадабаных Аляксандрам Салжаніцыным прымавак, змешчаных у колішніх "АіФ" аўтарскай падборкай — замест інтэрв'ю на маральна-этычныя тэмы... І ў дакументальным фільме Сакурава пісьменнік разважае пра смерць спакойна і проста як пра абавязковае, натуральнае, суладнае (як мае быць) заканчэнне жыцця. Магчыма, таму смерць пісьменніка мела не трагічны, а сурова-мудры настрой і пакінула жаданне падумаць, прыгадаць памерлага — паводле традыцыі, бадай, усіх народаў свету... Прыгадаць як вялікага творцу, як разумную і сумленную асобу, як чалавека, што шчыра любіў сваю радзіму — хай нават радзімы ў нас розныя, адкуль безумоўнае непрыманне асобных тэзаў... Але, у прыватнасці для мяне, Салжаніцын — найперш адзін з найбольш годных прадстаўнікоў сваёй генерацыі, якога сапраўды варта чытаць, пісьменнік, думкі якога штурхаюць да сур'ёзных разваг.

Перачытваючы апавяданні Салжаніцына, разумееш: ягоны Чалавек-Стваральнік — не тыповы ідэалізаваны вобраз будаўніка, характэрны для мінулай эпохі. "Праведник, без которого, по пословице, не стоит село. Ни город. Ни вся земля наша." — гэта хваравітая, трохі неахайная старая Матрона, што скідвала ў час пажару на падлогу ўлюбёныя фікусы, а, галоўнае, заўсёды была здольная дапамагчы вазіць гной, араць суседчын гарод, з даравальнай усмешкай, калі справа тычыцца калгаснай працы, і ўпартым нежаданнем браць грошы ў сваіх... "Матрёнин двор" — твор, па сутнасці, хрэстаматыйны, але пераглядаючы яго, зноў дзівішся ладнай кампазіцыі, не надта пафаснаму, але ўпэўненаму, жыццесцвярджальнаму, нягледзячы на сюжэтную лінію, заканчэнню, трапнай перадачы настрою пры ашчадным ужыванні тропаў. Аўтар абыходзіцца без "згушчэння фарбаў": хай галашэнне сястры па Матроне — "своего рода политика", але ёсць і пляменніца Кіра, што шчыра плача адна ў варыўні. І хаця "жутко было начать ломать ту крышу... даже мне, постояльцу, было больно, что начнут вырывать доски и выворачивать брёвна дома", усё ж прыпыняецца пасля самагонкавага пачастунку кульгавы сын Фадзея, распавядаючы, "как любит тётку Матрёну, и что женился недавно, и вот сын у него родился только что". У вобразе старой няма спрошчанасці ці ідэалізавання: і пра тых самых прусакоў, і пра "не уметши, не варёмши" распавядае аўтар, але разам з тым звяртае ўвагу і на ўспрыманне Матронай радыёмузыкі...

У беларускай літаратуры бабулек-сялянак, вядома, безліч — ад бабы Мар'і з коласаўскай трылогіі "На ростанях" да цёткі Прузыны з "Квадратнай вароны" Ігара Сідарука. Гэты празаічны зборнік вядомага беларускага аўтара падаецца цікавым і вартым з пункта гледжання як праблематыкі, так і своеасаблівага стылю. І галоўны герой найбуйнейшага са змешчаных у ім твораў — "Як цётка Прузына нацыю шукала" — тая ж простая кабета з вёскі Забалаць, што выпраўляецца ў "места наскае, гмах высачэзны", каб забраць міфічную пазыку ў Нацыі. Мы бачым, як традыцыйная ідэя пашаны да простага, але добрага вясковага чалавека робіцца галоўнай і ў постмадэрновым творы, напісаным, як належна, з безлічу ампліфікацый, гіпербал, гратэскаў...

І сапраўды, хай нават вобраз Матроны быў амаль цалкам спісаны з рэальнай жыхаркі вёсачкі Мільцава, для кожнага пісьменніка вельмі істотна глядзець на жыццё без прызмы тэндэнцыйнасці, быць патэнцыйна здольным заўважыць цікавую асобу між самых звычайных людзей і па-майстэрску паказаць яе ў творы.

Яшчэ адзін вобраз чалавека-стваральніка, якога разгледзеў Аляксандр Салжаніцын у далёкім 1965-м — гэта Захар-Каліта, што без сэрвісу і камфорту ахоўвае Кулікова поле, спіць у хляўку ці нават у стозе сена, збірае шклатару і цягае з сабой увесь дзень бутэльку вады з-за адсутнасці студні. Пасмейваючыся з ягонай суровай ваяўнічасці, пісьменнік ставіцца да яго з павагай: "может вправду верит, что без его ночной охраны погибло поле?" і зрэшты разглядае ў Захару-Каліце "Дух поля, стерегущий, не покидавший его никогда". Нашая ж літаратура надзвычай багатая творамі пра Палі, татараў, бітвы, г. зн. творамі гістарычнай тэматыкі, а вось з сучаснымі Захарамі-Калітамі неяк пакуль складана...

Наогул, негулагаўскія апавяданні Салжаніцына 60-х гадоў — гэта тая проза, па якой сучасныя школьнікі знаёмяцца з савецкай эпохай, у значнай ступені таму, што гэтыя творы з'яўляюцца нібыта квінтэсенцыяй прынцыпу ўвагі да простага чалавека. Прынцыпу, характэрнага не толькі для сацрэалізму, але і для безлічы іншых эпох і плыняў. І галоўнае, што ў гэтым сэнсе выручыла Салжаніцына з шэрага пісьменнікаў-сучаснікаў — бадай, ягоная здольнасць да шчырага спачування, павагі, да разумення людзей. Падаецца, гэтыя рысы істотныя для кожнага аўтара, незалежна ад абранага стылю. "Чалавек — гэта цэлы свет" — паводле вядомага выслоўя К. Чорнага. А ў дачыненне да стылю — зноў прымаўка Аляксандра Салжаніцына: "Горек будешь — расплюют, сладок будешь — расклюют", якой вядомы пісьменнік, бадай, кіраваўся як у творчасці, так і ў жыцці.

Алеся ЛАПІЦКАЯ

Гісторыя беларускага эфіру наўпрост звязана з лёсам многіх выбітных асоб Бацькаўшчыны. Іх пастаянная прысутнасць у радыёпрасторы, дзякуючы жанрам радыйнай дакументалістыкі, а таксама фондам мастацкага вяшчання, дазваляе гаварыць пра адзіны духоўны мацярык беларушчыны, пра відавочны ўплыў слова, якое не толькі напісана, але і гучыць штодня, — на свайго слухача.

Уладзімір Караткевіч і Беларускае радыё

У сувязі з абранай тэмай, першая паралель, якая напрошваецца адразу: 26 лістапада споўнілася 78 гадоў знакамітаму беларускаму пісьменніку Уладзіміру Караткевічу, а 15-га — 83 гады Беларускаму радыё. І гэтае непрыдуманае супадзенне яшчэ раз пацвярджае жаданне прасачыць лінію кантактавання мастака слова са сваім чытачом праз радыёэфір. У нашым выпадку — занятак даволі ўдзячны. Таму што ў фондах Беларускага радыё захоўваецца шмат праграм, звязаных і з самім пісьменнікам, і з яго творамі. А больш праўдзіва было б сцвярджаць, што гэта — унікальны выпадак у гісторыі Беларускага радыё адносна такой высокай запатрабаванасці творчай спадчыны аўтара.

Агульнае гучанне ўсіх радыёзапісаў (і дакументальных, і мастацкіх) — больш як 50 гадзін! Першая работа датавана 1959-м годам — радыёспектакль "Млын на Сініх Вірах". Апошнюю дату нават цяжка вызначыць, таму што мастацкі фонд У. Караткевіча пастаянна папаўняецца, прынамсі, для такіх сучасных рубрык, як "Літаратурная анталогія", "Паэтычны радыётэатр", "Тэатр Беларускага радыё".

На жаль, асабіста мне як радыёжурналісту не давялося сустрэцца з пісьменнікам Караткевічам ля мікрафона. Працаваць на радыё я прыйшла праз год пасля адыходу Уладзіміра Сямёнавіча ў вечнае жыццё. Але калі гаварыць пра дакументальны радыёфонд, то, на шчасце, у нас ёсць тры праграмы з яго голасам. У 1965-м годзе ў выкананні аўтара былі запісаны раздзелы з рамана "Каласы пад сярпом тваім" (у рубрыцы "За рабочым сталом пісьменніка"). Я нездарма падкрэсліла "ў выкананні аўтара", бо сапраўды, гэтая магнітная стужка не толькі нагадвае нам пра цудоўную прозу Караткевіча, але і сведчыць пра яго акцёрскі талент. Бліскучая выканальніцкая імправізацыя!

1969-м годам пазначана выступленне пісьменніка "Ты жывеш на гераічнай зямлі". Гэта прыклад радыёпубліцыстыкі, якая хутчэй звернута да маладога слухача, каб ведаў і любіў сваю Бацькаўшчыну, шанаваў памяць продкаў, працягваў лепшыя беларускія традыцыі: "...Уся наша прыўкрасная зямля трымаецца не на трох слонах, а на касцях воінаў, якія складалі і спявалі дзівосныя песні, і на касцях паэтаў, што трымалі меч. І ўрэшце — сталі зямлёю, з якою і ў жыцці былі адным... А кніга? Хіба не была гераічнай кніга нашай зямлі? Слабенькая, папера так лёгка гарыць у агні, яна стагоддзямі стаяла і выстаяла супраць магутных страшных ворагаў. І ў асобе Скарыны першы нарадзіўся сярод усходніх славян гуманізм, які таксама — гераіка, пакуль існуюць на зямлі моцныя мярзотнікі і сумленныя людзі, прыгнёт і зняволенне, бессаромная хлусня, падман і стойкая чалавечая праўда..."

І, нарэшце, самы характэрны для эфіру — жанр дыялога. У радыйных фондах захавалася гутарка каментатара У. Мехава з пісьменнікам У. Караткевічам запісу 1981 года. Перад намі — вобраз сталага мастака, Майстра гістарычнай прозы, жыццёвы і творчы досвед якога цікавы слухачу любога ўзросту. Да таго ж, сам жанр радыёгутаркі выклікае субяседніка на спавядальную і даверлівую інтанацыю. Адну з думак Караткевіча хочацца працытаваць: "Чалавеку трэба быць дужа выхаваным у філасофскім сэнсе, каб сачыць за водарам ідэі. Але кожны чалавек тую самую ідэю ўспрыме, калі яна будзе пададзена з абвостраным, нечаканым сюжэтам. Гэта значыць, што ідэя можа быць "горкай". Пакрыйце яе зверху невялічкім слоем цукру. Ён растворыцца, а думка ў галаве ў чытача застанецца".

Вось такія тры, абсалютна розныя па характары і надзвычай аб'ёмныя па змесце, дакументальныя запісы з удзелам пісьменніка У. Караткевіча. Па сённяшнім часе, не пабаюся заведчыць, — найкаштоўны матэрыял у галіне айчыннага караткевічазнаўства.

Калі ж працягнуць далей гэтае даследаванне адносна радыйнай дакументалістыкі, тут варта сказаць і пра "эфірныя" ўспаміны сучаснікаў У. Караткевіча. Яны запісваліся мною ўжо, можна сказаць, праз адлегласць расстання, у 90-я гады і пазней. Часцей былі прымеркаваны да юбілейных праграм, прысвечаных пісьменніку, але ўсе разам гэтыя матэрыялы як бы "даствараюць" вобраз мастака, які стаўся духоўным сімвалам, знакам нашага часу, выпрабаваннем нас, сённяшніх, на сумленнасць і беларускасць. У фондах радыё захоўваюцца ўспаміны пра У. Караткевіча яго сястры Н. Кучкоўскай, студэнцкіх сяброў кіяўлянкі М. Сняжко і прафесара з Варшавы Ф. Няўважнага, народнага паэта Беларусі Р. Барадуліна, мастака П. Драчова, рэпартаж з адкрыцця выставы "Быў. Ёсць. Буду", якая экспанавалася да 65-годдзя пісьменніка ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, а таксама інтэрв'ю-ўспаміны з нагоды 75-годдзя У. Караткевіча — з кампазітарамі С. Картэсам, Д. Смольскім, А. Залётневым, мастакамі А. Кашкурэвічам, У. Басалыгам, артысткамі Т. Мархель, Г. Дзягілевай.

Што тычыцца мастацкага вяшчання, то радыё пашанцавала з такім багатым літаратурным матэрыялам, як спадчына У. Караткевіча. Паводле яго твораў зроблена столькі, што можна без перабольшання гаварыць сёння пра асобны радыётэатр У. Караткевіча на Беларускім радыё. Рэпертуар яго ўключае ў сябе звыш 30-ці назваў. Гэта і шматчасткавыя (двух- і трохгадзінныя) радыёспектаклі, і больш кароткія па форме радыёпастаноўкі, і інсцэніраваныя казкі, і пастановачнае чытанне асобных празаічных твораў, і кампазіцыі паводле вершаў, і нават монаспектакль, як квінтэсенцыя творчасці аўтара. Фактычна, прысутнічае ўся магчымая палітра радыёдраматургічных жанраў. Прычым, кожны з іх мае свайго адрасата: як дарослых, так і маленькіх слухачоў.

Да радыйных перастварэнняў спадчыны У. Караткевіча звярталіся рэжысёры розных пакаленняў: В. Анісенка, С. Гурыч, І. Лапцінскі, А. Вавілаў, В. Кернажыцкая, З. Паўлоўская. Кожнаму з іх уласціва свая аўдыёстылістыка, свой рэжысёрскі вопыт. Тут можна гаварыць пра рэжысуру мужчынскую, якая адрозніваецца большай стрыманасцю, нават суровасцю, і жаночую — прасякнутую лірычнасцю, мяккасцю, ціхім роздумам.

Да радыйных перастварэнняў спадчыны У. Караткевіча звярталіся рэжысёры розных пакаленняў: В. Анісенка, С. Гурыч, І. Лапцінскі, А. Вавілаў, В. Кернажыцкая, З. Паўлоўская. Кожнаму з іх уласціва свая аўдыёстылістыка, свой рэжысёрскі вопыт. Тут можна гаварыць пра рэжысуру мужчынскую, якая адрозніваецца большай стрыманасцю, нават суровасцю, і жаночую — прасякнутую лірычнасцю, мяккасцю, ціхім роздумам.

Бясспрэчны майстар эпічных радыёпалотнаў Валерый Анісенка. Ён паставіў такія радыёспектаклі, як "Каласы пад сярпом тваім", "Чорны замак Альшанскі", "Нельга забыць". Гэта шматчасткавыя работы, з вялікай колькасцю дзеючых асоб, з вытрыманым сюжэтам, выразна прадуманымі сцэнамі, цудоўным музычным афармленнем. Можна лічыць, класічны прыклад рэжысёрскага прачытання хрэстаматыйных раманаў пісьменніка.

Непераможным гімнам каханню гучыць радыёспектакль В. Анісенкі "Нельга забыць" (інсцэніроўка Т. Абакумоўскай, гукарэжысёры Л. Латушкіна і В. Лешчанок, рэдактар У. Мехаў, год запісу 1985-ы.) Гістарычны пасыл — сямейнае паданне. Галоўныя героі — нашчадкі паўстанцаў 1863 г. Ніякіх лішніх дэталяў, што адцягваюць увагу слухача. У ролях Андрэя ды Ірыны — выдатны дуэт народнага артыста СССР В. Тарасава і артысткі Г. Кухальскай. Вельмі ўражвае Віктар Тарасаў. Яму, несумненна, удаецца перадаць найтанчэйшыя адценні стану свайго героя: ад глыбокага сардэчнага ўзрушэння да філасофска-цвярозых разваг.

Настальгічнай радыёпрыпавесцю атрымалася пастаноўка "Сіняя-сіняя" — паводле аднайменнага апавядання (аўтар інсцэніроўкі і рэжысёр А. Вавілаў, гукарэжысёр А. Гіль, рэдактар М. Базарэвіч, год запісу 1979-ы). Рэжысёрам скарыстаны два гукавыя планы. Першы — маналог-асэнсаванне галоўнага героя Петрака Ясюкевіча тых падзей, што з ім адбыліся, у таленавітым выкананні народнага артыста Беларусі Ю. Сідарава. І другі — дыялог-дзеянне Петрака (Л. Крук) з дзяўчынкай Джаміляй (Р. Дамброўская) — эмацыянальны, жывы, балючы. Тром акцёрскім галасам і верыш, і суперажываеш.

Уражанне вытанчанай радыёмініяцюры пакідае пастаноўка "Краіна Цыганія", створаная паводле аднайменнага апавядання (аўтар інсцэніроўкі А. Уладамірскі, рэжысёр С. Гурыч, гукарэжысёр Л. Латушкіна, год запісу 1979-ы). Адчайная пранізлівасць адчуваецца ў дуэце галоўных герояў: Раман — народны артыст СССР В. Тарасаў, цыганка Яня — народная артыстка Беларусі Л. Давідовіч. Непадробная раскоша цыганскай волі і беларускіх краявідаў, вечная тэма руху, дарогі, жыцця і кахання: "Вазьмі маю душу і нясі па свеце..."

У 1993-м годзе быў пастаўлены радыёспектакль "Ладдзя Роспачы", на якім таксама хочацца спыніцца больш падрабязна (аўтары інсцэніроўкі для радыё С. Булыга і С. Кавалёў, рэжысёр В. Кернажыцкая, музыка кампазітара С. Хвашчынскага, гукарэжысёр Л. Гаршунова, рэдактар Г. Шаблінская). Духоўная атмасфера 90-х гадоў відавочна адбілася на агульным настроі названай працы. Вызваленне асобы "ад путаў сярэднявечча" (у выпадку з Вылівахам) трансфармавалася ў сучасную радыёлегенду пра беларуса гожага, свабодалюбівага, самадастатковага, які нават у самыя безвыходныя хвіліны жыцця здольны на пераможны ўчынак. Ролю Гервасія Вылівахі бліскуча выконвае заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь А. Жук. З уласцівай яму эмацыйнай харызмай ён робіць гэта пераканаўча яркa і тэмпераментна.

Увогуле, у 90-я гады было пастаўлена нямала цікавых радыёспектакляў паводле твораў Караткевіча: "Калядная рапсодыя" і "У снягах драмае вясна" (рэжысёр В. Кернажыцкая), "Парыж на свеце ёсць?" (рэжысёр З. Паўлоўская), "Кацёл з каменьчыкамі" (рэжысёр І. Лапцінскі), монаспектакль "Дабравесце ад Уладзіміра" (рэжысёр У. Матросаў). Цалкам запісана аповесць "Чазенія" ў выкананні заслужанага артыста Беларусі І. Кургана — майстра мастацкіх радыёчытанняў, а таксама кампазіцыя паводле вершаў "На Беларусі Бог жыве" ў непаўторным выкананні артыста А. Уладамірскага. У цыкле праграм "Нанава" (перачытанне класікі) прагучалі фрагменты многіх твораў пісьменніка з каментарыем літаратуразнаўцаў. Прыклады можна працягваць. Усё гэта — неацэнны фонд Беларускага радыё.

Кожная гістарычная эпоха, пазначаная сваімі дамінантнымі падзеямі і з'явамі, фарміравала новага героя. Мацярык беларускай гісторыі па Караткевічу дакладна ўвасобіўся праз асноўныя выразныя сродкі радыётэатра: слова і гук, музыку і шумавое адлюстраванне дзеяння. Бо слова ў спектаклях прамаўляюць лепшыя майстры артыстычнага цэху, гэта сапраўдны тэатральны букет: народныя артысты СССР В. Тарасаў (заняты ў 7-мі работах!), С. Станюта, Г. Аўсяннікаў, народныя артысты Беларусі Л. Давідовіч, М. Захарэвіч, Г. Гарбук, В. Клебановіч, В. Філатаў, П. Дубашынскі, А. Памазан, заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь М. Федароўскі, У. Рагаўцоў, А. Жук, В. Манаеў, З. Белахвосцік і г. д. Музыка да многіх пастановак пісалася спецыяльна (так званае арыгінальнае кампазітарскае рашэнне), над афармленнем працавалі высокакласныя гукарэжысёры. Радыёвобразы літаратурных герояў У. Караткевіча — рознапланавыя, запамінальныя, пераканаўчыя.

У межах мастацкага вяшчання Беларускага радыё паводле спадчыны пісьменніка асобна трэба вызначыць музычныя жанры (што можа быць, дарэчы, тэмай яшчэ аднаго артыкула). Найперш гэта буйныя формы, сярод якіх — дзве оперы. Спачатку з'явілася "Сівая легенда" кампазітара Д. Смольскага, лібрэта У. Караткевіча (1984 г.) У галоўных ролях: Кізгайла — народны артыст СССР А. Саўчанка, Ірына — народная артыстка Беларусі І. Шыкунова, Раман — народны артыст Расіі А. Дзеждзік. Задзейнічаны хор і аркестр Беларускага радыё і тэлебачання, дырыжор Б. Райскі. Другая опера пастаўлена паводле аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха" ў тэатры оперы і балета Беларусі. Кампазітар У. Солтан, аўтар лібрэта С. Клімковіч. Запіс спектакля зроблены падчас гастроляў беларускай оперы на сцэне Вялікага тэатра СССР у 1990 годзе. Дырыжор А. Анісімаў. У ролях А. Беларэцкага і Н. Яноўскай — заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь В. Скорабагатаў і Н. Кастэнка. Разам з Дзяржаўным камерным хорам і акадэмічным сімфанічным аркестрам у 1995 годзе ў выкананні заслужанага артыста Беларусі М. Жылюка запісана араторыя Р. Глебава "Быў. Ёсць. Буду". У музычных фондах — шмат песень, рамансаў на вершы У. Караткевіча ў выкананні розных спевакоў. І спіс гэты пастаянна папаўняецца.

Сёння можна аргументавана канстатаваць, што пісьменнік У. Караткевіч прысутнічае сярод нас не толькі дзесяццю тамамі выдадзенай спадчыны, але і больш як пяццю дзесяткамі мастацкіх і дакументальных радыёпраграм, якія, дзякуючы Беларускаму эфіру, таксама ўваходзяць у кожны дом. І калі б мы пажадалі пачуць іх усе запар, то дзеля гэтага спатрэбілася б як мінімум двое сутак. А гэта значыць — аўдыёпрачытанне спадчыны класіка адбылося. І слова яго працягвае гучаць.

Галіна ШАБЛІНСКАЯ

Цэнтр Зямлі – у Зэльве

Жыццё паселішча вымяраецца часам тысячагоддзямі. Гарадскі пасёлак Зэльва красуе на карце Беларусі ўжо тры чвэрці веку. Калісьці Вялікая і Малая Зэльва, а цяпер — просты ўтульны гарадок на рацэ Зальвянка. "Зялёны горад", як назваў яго паэт Уладзімір Мазго, святкаваў свой пачэсны юбілей. У кастрычніку ў Зэльве праходзіла свята, прысвечанае 750-годдзю з дня першага ўпамінання яе ў Іпацьеўскім летапісе. На свята сабраліся ўсе мясцовыя жыхары, шмат было і гасцей — з раёна і вобласці, завіталі пісьменнікі, творцы, ганаровыя госці. Упершыню сёлета заснавалі тут званне — Ганаровы грамадзянін Зэльвенскага раёна. Сярод першых уганараваных і літаратар Уладзімір МАЗГО.

— Уладзімір Мінавіч, прыміце віншаванні!

— Мяне вельмі радуе тое, што і пісьменнікам таксама надаюць такое званне. І гэта сведчыць пра ўвагу да мастацкага слова з боку мясцовых улад. На маю думку, вельмі важна, што якраз да свята выйшла новая кніжка — першы паэтычны зборнік "Зоры над Зальвянкай". Аднайменнае мясцовае літаратурнае аб'яднанне, якое існуе шмат гадоў, правяло вялікую працу. Аб'яднаннем раней кіраваў Пётр Марціноўскі, краязнаўца і настаўнік, ён, на жаль, пайшоў ужо з жыцця, і цяпер працягвае яго справу Яніна Шматко. Дзякуючы гэтым двум людзям і таму, што райвыканкам падтрымаў ідэю, кніга "Зоры над Зальвянкай" з'явілася. І загучалі імёны: добра знаёмыя ў краіне, і новыя, якія толькі заяўляюць пра сябе. Між іншым, усе на свяце добрым словам узгадвалі "ЛіМ", які на пачатку гэтага года надрукаваў цэлую паэтычную старонку з "Зораў..." Вельмі вялікая падзяка вашаму рэдакцыйнаму калектыву за падтрымку пачынаючых літаратараў!

— Якія пачуцці абудзіла ў вас чарговае, "святочнае" наведванне малой радзімы?

— Ведаеце, у мяне такое трапяткое пачуццё... Справа ў тым, што мой бацька родам з Віцебшчыны. А маці са Смаленшчыны. А я нарадзіўся ў Зэльве. Для мяне гэта мястэчка дарагое і святое на ўсё жыццё. Я ўжо гадоў 30 як мінчанін, але цягне сюды. Тут мае вытокі, тут скончыў школу, тут надрукаваў першы верш — у раённай газеце "Праца". У Зэльву прыязджаю кожны год. Мне прапанавалі весці літаратурнае свята — Зэльвенскія сакавіны (ад слова "сакавік"). І кожны год мы з пісьменнікамі, паэтамі, кампазітарамі, спевакамі прыязджаем у школу №2 і праводзім цікавыя сустрэчы. Быў сёлета сярод гасцей і загадчык аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама Анатоль Грэкаў, наш зямляк. Апошні раз сакавіны доўжыліся два дні, пашырылася іх геаграфія — далучылася і США №3.

Справа такая, безумоўна, вельмі патрэбная для людзей. Таму што гэта і для пісьменнікаў хвалюючыя сустрэчы з чытачамі, ды не проста з чытачамі, а са сваімі землякамі. Калі людзі блізкія, дарагія табе, тады і словы пранікнёныя знаходзяцца.

— Такія святы звычайна ўвязваюць з эканамічнымі, гаспадарчымі перамогамі. А ці можна сказаць, што яно сталася і літаратурным?..

— Адназначна: увага літаратуры была нададзена належная. Асобным пунктам у праграме свята значылася прэзентацыя ў цэнтральнай бібліятэцы кнігі "Зоры над Зальвянкай", быў і тэатралізаваны пралог свята з удзелам калектываў з Мінска "Літвінскі хмель", "Княжыч", "Яварына", тэатра У. Кустава. А на дзіцячай пляцоўцы каля Дома культуры праходзіў канцэрт дзіцячай творчасці. Прысутнічала кіраўніцтва вобласці. І тое, што было дадзена слова пісьменнікам, азначала: кіраўніцтва раёна з павагаю ставіцца да творчых людзей і да роднага слова. Нават магу сказаць: намеснік старшыні Зэльвенскага райвыканкама Валянцін Семянюка — сам піша вершы. Па адукацыі фізік, а ў душы лірык. Цікавіцца літаратурай.

— А пачыналі мы гаворку з таго, што Зэльва ўпаміналася ў Іпацьеўскім летапісе...

— Так, і гісторыя пасёлка таксама багатая. Згодна звестак, якія да нас дайшлі, яшчэ ў сярэднявеччы ў Зэльве ладзіліся штогадовыя кірмашы. Так званы Анненскі кірмаш і права яго арганізоўваць атрымалі калісьці ўладальнікі Зэльвы князі Сапегі прывілеем вялікага князя літоўскага і польскага караля Аўгуста II Моцнага. Кірмаш, між іншым, не губляўся і сярод расійскіх кірмашоў і з'яўляўся якраз тым звяном, якое злучала Расію з замежжам. У Зэльве гандлявалі купцы з Украіны, Францыі, Саксоніі, Баварыі, Прусіі, Швецыі... — утвараўся, так бы мовіць, наш уласны Лейпцыг.

З архітэктурных помнікаў Зэльвенскага раёна назаву найперш Сынковіцкую царкву-крэпасць. У Зэльве цікавы, прыгожы, велічны касцёл святой Тройцы пачатку XX ст. Калі едзеш сюды — з захаду, усходу, поўдня ці поўначы, першае, што адкрываецца ў далягляды — дык гэта той самы касцёл. Калісьці я напісаў такія радкі — *"Расшпілена нясмела двухшпілевым касцёлам"*. Сапраўды, падаецца, што неба расшпілена яго двума шпілямі. А ў Зэльвенскай Троіцкай праваслаўнай царкве XIX ст. я хрышчоны. Захаваўся ў Зэльве млын — дзейнічаў да сярэдзіны мінулага стагоддзя!

У Зэльве доўгі час жыла Лариса Геніюш. Лёсам звязаныя з Зэльвеншчынай Леў Сапега, Напалеон Орда, тут нарадзіўся беларускі генетык і селекцыянер, акадэмік АН БССР, вядомы грамадскі дзеяч Антон Рамановіч Жэбрак ды многія іншыя... Зэльвенскі край — зямля багатага мінулага.

— А чаму "Цэнтр Зямлі — у Зэльве"? Так названыя нататкі пра вашу сустрэчу з чытачамі ў газеце "Праца".

Таму што для мяне, сапраўды, цэнтр Зямлі — на малой радзіме. Туды заўсёды хочацца вярнуцца, там прыгожа, светла, утульна!

Гутарыла
Ірына ТУЛУПАВА

На здымку: старшыня Зэльвенскага райвыканкама Л. Эльяшэвіч (цяпер дэпутат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь) уручае ўзнагароду У. Мазго.

Забытае імя

Родам з Капыля

Пра тое, што быў такі пісьменнік Абрам Паперна, я ўпершыню даведаўся больш як дзесяць гадоў таму. Тады акурат працаваў над складаннем гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць" Капыльскага раёна і стараўся сабраць як мага больш звестак пра тых, хто ў розны час нарадзіўся на Капыльшчыне ці звязаў з ёй свой лёс. Неяк і патрапіла мне на вочы прозвішча Абрам Паперна. Здаецца, знайшоў яго ў адным з матэрыялаў, у якім расказвалася пра жыццё Капыля ў XIX стагоддзі. Аднак канкрэтных звестак пра гэтага А. Паперну знайсці мне так і не ўдалося.

Тады вырашыў запытацца пра А. Паперну ў беларускага літаратара Уладзіміра Мехава, які сам адкрыў для літаратуры нямала імёнаў. На жаль, Уладзімір Львовіч пра А. Паперну таксама нічога не ведаў, але падказаў, дзе пашукаць пра яго звесткі, — у «Еврейской энциклопедии». На свой сорам, я на той час і не ведаў, што такая выходзіла ў Расіі ў дарэвалюцыйны перыяд, з'яўляючыся «сводом знаний о еврействе и его культуре в прошлом и настоящем в 16 томах».

З «Еврейской энциклопедии» я даведаўся, што А. Паперна нарадзіўся ў Капылі ў 1840 годзе. Паколькі дзед яго быў равінам, гэта не магло не паўплываць на выхаванне ўнука. У маленстве А. Паперна атрымаў рэлігійную адукацыю, што заключалася ў дасканалым вывучэнні Талмуда. Рана ажаніўся, але гэта не перашкодзіла яму паступіць у равінскую вучэльню ў Жытоміры. Вучобу прадоўжыў у Віленскім равінскім вучылішчы, якое скончыў у 1867 годзе.

З 1868 года пачалася яго выкладчыцкая дзейнасць. Спачатку працаваў у гімназіях, выкладаючы асновы іудаізму, затым стаў загадчыкам яўрэйскага вучылішча і знаходзіўся на гэтай пасадзе да 1870 года. Гэта не замінала яму займацца літаратурай, схільнасць да якой выявіў яшчэ ў юнацтве. З першымі вершамі А. Паперна выступіў на старажытнаяўрэйскай мове ў 1862 годзе. Адначасова спрабаваў свае сілы ў крытыцы, літаратуразнаўстве, пішучы на ідыш і па-руску. У 1867 асобнай кніжкай выйшаў яго літаратурна-крытычны эцюд, у якім Абрам Ізраілевіч даволі крытычна паставіўся да твораў яўрэйскай літаратуры, што публікаваліся ў той час.

Высокія патрабаванні А. Паперны да прыгожага пісьменства — зусім не жаданне павучаць іншых. Як літаратар ён выхоўваўся на лепшых традыцыях рускай класічнай літаратуры, цудоўна ведаў рускую мову, таму хацеў, каб і родная яму літаратура не знаходзілася на літаратурных задворках. Дзеля гэтага клапаціўся аб адукацыі яўрэйства, стварыў шэраг падручнікаў ідыша і ідыша, што, безумоўна, стала ўкладам у яўрэйскую педагогіку.

У свой час вялікай папулярнасцю карысталіся, дый цяпер не страцілі свайго значэння (найперш, як багаты пазнавальны матэрыял) гістарычныя нарысы А. Паперны. У асноўным яны тычыліся жыцця яўрэйскіх абшчын на тэрыторыі Польшчы і былі змешчаны ў «Книжках «Восхода» ў 1901 годзе. А ўжо ад гэтых нарысаў А. Паперна і праклаў масток да ўспамінаў пад назвай «Пережитое», у якіх праўдзіва, па-майстэрску апісана жыццё яўрэйства, у тым ліку, і капыльскага.

А. Паперна памёр у 1919 годзе ў Адэсе. Дарэчы, гэтая інфармацыя ўзята ўжо з «Российской европейской энциклопедии».

На жаль, у беларускіх энцыклапедыях гэты пісьменнік не згадваецца.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Дзеўка-паэт, ці «Веру ў каханне-дранік!»

У кастрычніку ёй споўнілася 24 гады. Але яна ўжо — аўтар трох кніг паэзіі ("Кроў Сусвету", "Каб неба сагрэць...", "Тамсама"), магістр мастацтвазнаўства, рэдактар выдавецтва "Мастацкая літаратура"... Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці кінадраматургія, яна вагалася, што абраць: кінематограф, тэатр, філасофію ці літаратуразнаўства? Абрала кіно. Сёлета абараніла дысертацыю на тэму «Увасабленне архетыпічных вобразаў і матываў у экранізацыях твораў Уладзіміра Караткевіча». Наперадзе аспірантура... З паэтам Валерыяй, Валярынай, ці — лепш — Валерушкай, як пяшчотна называе яе маці, Куставай мы сядзім у яе паэтычна-ружовым пакоі, п'ём зялёную гарбату і размаўляем пра літаратуру.

— Чаму ты называеш сябе «дзеўка-паэт», а не паэтка?

— Гэта Ясенін — паэтка *(жартаўліва)*. У мяне нават ёсць рэйтынг заняпаду: спачатку паэт, пасля паэтка, а потым — зусім паэтэса *(смяецца)*. Я пачала пісаць *(а адбылося гэта ў 3-гадовым узросце. — А.П.)* свае першыя творы ад імя чалавека ў мужчынскім родзе. Я заўсёды пачувалася не паэтам-асобай ці паэтам-жанчынай, а менавіта паэтам-чалавекам. Бывае, што мужык, але паэтка, а бывае, дзеўка, але паэт. Гэта той стрыжань, які адчуваю ў сабе.

— Ты даволі часта выступаеш. Як публіка рэагуе на тваю паэзію?

— Мне вельмі падабаецца выступаць у тэхналагічным універсітэце. Там заўсёды збіраецца шмат студэнтаў. Усталёўваецца такая цішыня, што можна пачуць, як пралятае муха, і толькі твой голас у гэтай цішыні... Уваходзіш у экстаз і атрымліваецца надзвычай станоўчы абмен энергіяй. Мне ўвогуле падабаецца выступаць. І ў школах таксама.

Так атрымліваецца, што кожны мой выступ — дыялог са слухачамі. Калі бяру з сабой гітару, то мы спяваем народныя песні, гарадскія рамансы, я выконваю і свае творы пад музычнае аздабленне. Старшакласнікі часта задаюць пытанні не толькі пра літаратуру ды літаратараў, а пытаюцца і наконт абрання далейшага шляху, будучай прафесіі, просяць парады... Даводзіцца распавядаць і пра нашы навучальныя ўстановы... Вельмі часта просяць расказаць пра каханне. Паэзія літаратурная пераходзіць у паэзію жыцця і само жыццё.

— Сёлета ў рамках трэцяга міжнароднага фестывалю сучаснай паэзіі «Парадак слоў» адбыўся першы беларускі слэм, у якім ты ўдзельнічала. Падзяліся ўражаннямі.

— На вуліцы выпадкова сустрэліся з Андрэем Хадановічам, і ён прапанаваў прыйсці і тры хвіліны пахуліганіць. Мяне здзівіла: чаму тры, а не пятнаццаць? *(смяецца)*. На той момант я абсалютна не ведала, што такое слэм, у якім фармаце ён адбываецца. Нават вершы на памяць не вывучыла. Ну, павыдурняцца дык павыдурняцца. У мяне ёсць верш «Каханне-дранік». Пачынаецца ён так: «Не веру ў моркву-каханне, // веру ў каханне-дранік, // веру ў каханне-бульбу, // веру ў бульбоўнік кахання!» Я ўсё думала, што можна такога зрабіць, каб ён сапраўды па-хуліканску глядзеўся. Думала-думала і вырашыла выкарыстаць моркву і бульбіну ў сваім нумары... На жаль, не хапіла часу на дранікі, якія я хацела прыгатаваць ды прынесці...

Слэм — неблагі спосаб для папулярызацыі літаратуры. Ёсць, праўда, небяспека загуляцца альбо зацыкліцца на напісанні вершаў выключна ў фармаце слэму.

— Ты закранула актуальную тэму папулярызацыі літаратуры...

— Мне раней здавалася, што калі людзі патрапяць на нейкую вясёлую, сцёбную вечарыну, то яны пасля пойдуць шукаць штосьці больш сур'ёзнае і такім чынам далучацца да літаратуры. Думалася, што гэтая весялосць у літаратуры будзе толькі штуршком для чытачоў і гледачоў пайсці далей... Але я памылялася. Насамрэч, людзі, якія не маюць дачынення да літаратуры, трапіўшы на такую вечарыну, на гэтым і спыняюцца, думаючы, што гэта літаратурная вышка. Такія імпрэзы, вядома, таксама папулярызацыя, але пытанне, у якой ступені і якой літаратуры. У нас няма літаратурных агентаў, што вельмі блага. Бо калі ў цябе ёсць талент, так бы мовіць, прасоўвання, ты можаш быць нашмат больш папулярным літаратарам, чым калі маеш літаратурны талент. Сёння, акрамя непасрэднай творчасці, трэба быць і менеджэрам, і піяр-агентам...

Цяпер іншыя прыярытэты. Нельга сказаць, што літаратура прыйшла ў заняпад. Яна існуе, і я адчуваю, што неўзабаве мусіць з'явіцца выбуховы твор. І ўжо некалькі такіх твораў (паэм) з'явілася, але так і не атрымала розгаласу. І гэта вельмі нядобра. Дзіўна, што самім беларускім літаратарам «у лом» хваліць добрыя творы сваіх калег, калі тыя не з'яўляюцца іх сябрамі, суседзямі ці супрацоўнікамі... Гэта замкнёнае кола. Беларусы звыкліся недаацэньваць сябе і сваіх. А калі сам сябе не пахваліш, то хто тады пахваліць?.. Нікому мы не будзем патрэбныя. Але ўсё ў нас будзе добра.

Ася ПАПЛАЎСКАЯ

Калектыў РВУ "Літаратура і Мастацтва" выказвае шчырыя спачуванні сваёй пастаяннай аўтарцы Вользе Васільеўне Казловай у сувязі са смерцю МУЖА Валянціна Міхайлавіча Сударыкава.

Акцёрскае пастаянства

Камаржынскі Язэп *(Іосіф Францавіч) (1899, Дзвінск (Даўгаўпілс) — канец 1970-х гг., Даўгаўпілс, Латвія), артыст, рэжысёр, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Латвіі.*

Акцёрскія здольнасці выявіў у пастаноўках трупы дзвінскага чыгуначнага тэатра пад кіраўніцтвам М. Канстанцінава. У час эвакуацыі ў Расію працаваў у Рабочай драматычнай дружыне (Рослаўль) і Вайсковай драматычнай дружыне. У 1919—1920 гг. — акцёр драмы, член Смаленскага аддзялення Усерасійскага прафесійнага саюза работнікаў мастацтва. Вярнуўшыся летам 1920 г. у Дзвінск, паступіў на Беларускія настаўніцкія курсы, дзе арганізаваў Беларускую драматычную дружыну, якая ажыццявіла шэраг тэатральных пастановак у Дзвінску і навакольных вёсках, населеных беларусамі. Восенню 1929 г. Беларускі аддзел пры Міністэрстве асветы Латвіі запрасіў Я. Камаржынскага ў Рыгу. Спачатку ён працаваў у Беларускай пачатковай школе на Маскоўскім фарштаце, а потым быў прызначаны дырэктарам Беларускага народнага тэатра ў Рызе. Выступаў як артыст і рэжысёр, ставіў п'есы як беларускіх, так і латышскіх аўтараў. Я. Камаржынскі многа зрабіў для арганізацыі Таварыства беларускага тэатра ў Латвіі. Беларускія асяродкі Латвіі шырока адзначылі 20-годдзе яго творчай дзейнасці (1938).

Пасля выхаду на пенсію ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці Даўгаўпілскага гарадскога Дома культуры (тэатральныя сезоны 1961—1965 гг.). Загінуў у час аварыі на вуліцы.

Сяргей ПАНІЗНІК

Спяваў увесь СССР

Фрадкін Марк Рыгоравіч *(4.5.1914, Віцебск — 4.4.1990, Масква), расійскі кампазітар, народны артыст СССР (1985), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1979).*

М. Фрадкін у 1937 годзе скончыў Беларускую студыю пры Цэнтральным тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе. У 1938—1939 гг. вучыўся ў Беларускай кансерваторыі (клас М. Аладава). З 1937 года працаваў акцёрам, загадчыкам музычнай часткі ў Беларускім тэатры юнага гледача ў Мінску. У 1941—1943 гг. — дырыжор франтавога ансамбля. У 1944 годзе пераехаў у Маскву.

Першыя песні М. Фрадкіна загучалі ў час вайны: "Песня пра Дняпро" (1941), "Выпадковы вальс" (1942), "Бранская вуліца" (1944) — усе на словы Я. Далматоўскага, "Песня пра волжскага асілка" (1943, на ўласныя словы), "Кружыцца, кружыцца вея над намі" (1945, словы Л. Ашаніна). Пра вайну напісаў таксама песні "Эскадрылья «Нармандыя-Нёман»" (1957, словы Я. Далматоўскага), "За таго хлопца" (1972, словы Р. Раждественскага, 1-я прэмія на Міжнародным фестывалі ў Сопаце). Адна з самых папулярных песень М. Фрадкіна — "Цячэ Волга" (1960, словы Л. Ашаніна). Напісаў музыку больш чым да 50 кіна- і тэлефільмаў і адмыслова песні да іх "Мы жылі па суседстве" (1956), "За фабрычнай заставай" (1958), "Камсамольцы-дабравольцы" (1958), "А гады ляцяць" (1958) — усе на словы Я. Далматоўскага, "Бывайце, галубы!" (1960, словы М. Матусоўскага). Аўтар кнігі "Мая біяграфія" (1974).

Аксана СПРЫНЧАН

Паўнамоцны прадстаўнік

Гарбачоў Міхаіл Васільевіч *(24.3.1921, в. Бесцвіна Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Сенненскі раён Віцебскай вобласці — 7.3.1981, Масква), расійскі літаратар, перакладчык, заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1971).*

У 1951 годзе скончыў Маскоўскі паліграфічны інстытут. Працаваў у часопісе "Славяне", на Усесаюзным радыё, у апараце Саюза пісьменнікаў СССР. Міхаіл Гарбачоў пераклаў на рускую мову творы беларускіх пісьменнікаў. Сярод іх — раманы "Людзі на балоце" І. Мележа, "Вецер у соснах" і "Сорак трэці" І. Навуменкі, "Плач перапёлкі" І. Чыгрынава, "Чужая бацькаўшчына" В. Адамчыка; аповесці В. Быкава "Альпійская балада", "Трэцяя ракета", "Мёртвым не баліць", а таксама асобныя творы П. Галавача, У. Карпава, А. Кулакоўскага, М. Лупсякова, І. Пташнікава, А. Савіцкага, Т. Хадкевіча, І. Шамякіна і іншых аўтараў.

Ларыса ЯЗЫКОВІЧ

Вядучы рубрыкі — доктар філалагічных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Адам МАЛЬДЗІС.

Выпуск 10.

Пошукі працягваюцца...

Мастацкая скарбонка Вілейшчыны папоўнілася яшчэ адным прозвішчам — Уладзімір Гулецкі. Пра жывапісца і графіка няма ні слова ў гісторыка-дакументальнай хроніцы "Памяць. Вілейскі раён". Выходзіць, што адшуканы зямляк дагэтуль заставаўся асобай невядомай на сваёй малой радзіме.

Уладзімір Васільевіч нарадзіўся 25 сакавіка 1895 года ў Вілейцы. Пра яго пачатковую адукацыю нічога невядома. Можна выказаць здагадку, што пасля заканчэння пачатковай школы ён вучыўся ў трохкласным гарадскім вучылішчы. Апошняе, між іншым, скончыў і пісьменнік-аднагодак Гулецкага Леапольд Родзевіч, які паходзіў з Вілейскага павета.

Гулецкі прымаў удзел у Першай сусветнай вайне. У час баявых дзеянняў ён апынуўся на тэрыторыі Расіі, дзе і застаўся на ўсё жыццё. Пра міжваенны перыяд жыцця захавалася, відаць, найбольш звестак. Пасля прыходу да ўлады бальшавікоў Уладзімір Васільевіч быў палітработнікам. Але яго цягнула да мастацтва. У 1919 годзе ў Разані ён на працягу года вучыцца ў мастацкіх майстэрнях Якава Калінічэнкі і Піліпа Малявіна. У 1921—1925 гг. — у Омскім мастацка-прамысловым тэхнікуме імя Урубеля. У год заканчэння тэхнікума Гулецкі прымаў удзел у Міжнародных выставах у Парыжы і Фларэнцыі. Калі маладому мастаку выпаў такі гонар, значыць узровень яго майстэрства быў сапраўды высокі.

Захаваліся звесткі, што ўвосень 1928 года Уладзімір Гулецкі ўвайшоў у Камісію па абследаванні гістарычнай і мастацкай каштоўнасці Васкрасенскайваеннай царквы (у 1895 годзе перайменавана ў Омскі кафедральны сабор). У камісію былі ўключаны таксама інжынер Шухман, архітэктар Ігнатовіч, мастак Трафімаў, прадстаўнік Омскага таварыства краязнаўства Вінаградаў, сакратар Заходне-Сібірскага музея Харчэўнікаў і іншыя. Пасля абследавання камісія прыйшла да высновы, што сабор уяўляе сабой вялікую гістарычную каштоўнасць. Было адзначана ўнутранае ўбранства храма. Члены камісіі вырашылі, што як помнік мастацтва і даўніны сабор павінен быць выкарыстаны для музея, кнігасховішча ці нечага падобнага, але не для ваеннага клуба, як планавалася. Толькі абавязковай умовай павінна быць захаванне знешняга і ўнутранага выглядаў. Але 27 кастрычніка 1928 года Акрвыканкам зацвердзіў пастанову гарсавета аб перадачы сабора ваеннаму ведамству для арганізацыі клуба. Заключэнне камісіі папросту было праігнаравана. У апошнія гады існавання сабор выкарыстоўваўся як склад картаграфічнай фабрыкі. Знеслі храм у канцы 1950-х.

У міжваенны перыяд выставы Уладзіміра Васільевіча прайшлі ў Омску (1928, 1930), Іркуцку (1939, 1941 — персанальная). У 1936 годзе ён уступіў у Саюз мастакоў СССР. Як арганізатар праявіў сябе пры стварэнні Іркуцкага аддзялення гэтай арганізацыі.

Падчас Другой сусветнай вайны служыў у Цэнтральным штабе партызанскага руху. У 1942 годзе палотны мастака былі выстаўлены ў Іркуцку на выставе, прымеркаванай да 25-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1944 годзе пасля ранення Уладзіміра Гулецкага накіравалі ў Растоў-на-Доне. Мастак пісаў віды разбуранага горада. Пасля заканчэння вайны выкладаў у Растоўскім мастацкім вучылішчы імя Грэкава.

У Беларусі карціны Гулецкага выстаўляліся, наколькі вядома, толькі аднойчы. Было гэта ў Мінску ў 1945 годзе на выставе беларускіх мастакоў, прысвечанай 25-годдзю БССР.

Памёр Уладзімір Васільевіч у Растове-на-Доне ў 1948 годзе. Пасля смерці яго спадчынай апекаваліся дочкі Ніна і Святлана. Творы мастака захоўваюцца ў музеях Омска, Чыты, Томска, Іркуцка, Краснаярска, Новасібірска, Масквы, Растова-на-Доне. Яму належаць дзесяткі эцюдаў, пейзажаў, малюнкаў алоўкам, пяром, акварэлі, гравюры...

Мала звестак і пра сям'ю Уладзіміра Васільевіча. У сям'і было чацвёра дзяцей. Старэйшая — дачка Ніна. Нарадзілася яна 22 студзеня 1922 года. У 1938 паступіла ў аэраклуб Таварыства па садзейнічанні ў абароне Іркуцка. З красавіка 1942-га і да канца вайны Ніна Гулецкая была лётчыкам-інструктарам. Спачатку вучыла лётнай справе ў 82-й вучэбнай авіяэскадрыллі (г. Тулун), а затым — у Ісыккульскай школе пілотаў. Падчас вайны загінуў жаніх Ніны. Яна настолькі кахала маладога чалавека, што замуж за іншага не выйшла. Так і пражыла ўсё жыццё адна.

Пасля вайны Ніна Гулецкая скончыла ў Растове музычнае вучылішча. У 1953 годзе яна прыехала ў Петразаводск, дзе на працягу дзесяці гадоў іграла на кантрабасе ў сімфанічным аркестры Карэльскага радыё і тэлебачання пад кіраўніцтвам Леапольда Цяпліцкага. Не забывалася і на свой любімы занятак. У 1950 — 60 гг. удзельнічала ў спаборніцтвах па планерызме і скачках з парашутам, на якіх займала нават прызавыя месцы. З 1966 года працавала ў аркестрах Кабардзіна-Балкарскай і Луганскай філармоній, у Краснаярскім тэатры музкамедыі. У 1970-х вярнулася ў Петразаводск — свой любімы горад. Але прыйшлося пераехаць на пэўны час ў Растоў-на-Доне: даглядала паралізаваную сястру. А пасля яе смерці Ніна Уладзіміраўна вярнулася зноў у Петразаводск. Там неўзабаве і сама памерла.

Вось, бадай, і ўсё, што ўдалося высветліць пра мастака з Вілейкі і яго сям'ю. Вядома ж, недзе ў архівах захоўваецца куды багацейшая інфармацыя. На жаль, мы да тых архіваў пакуль не дабраліся. Але пошукі працягваюцца.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

На здымках: Ніна Гулецкая; карціна Уладзіміра Гулецкага "Жыта" (алей, 1937).

Зорка з Жабінкі

Кожны кавалачак вялікай Зямлі Бог адорвае яркімі зоркамі — таленавітымі людзьмі, што тут нараджаюцца... Часам, здараецца, апынаюцца яны над іншымі мясцінамі і свецяць іншым людзям. Аднак іх бляск аказваецца настолькі магутным, што не застаецца незаўважаным і на месцы нараджэння і нават распаўсюджваецца на яшчэ больш далёкія прасторы, нагадваючы пра сваё існаванне...

Паэтэса Алена Жабінкоўская (сапраўднае прозвішча Ахматава) — адна з такіх зорачак. Нарадзілася Алена і зрабіла першыя крокі ў беларускім горадзе Жабінка Брэсцкай вобласці. Ужо тут дзяўчынка пачала праяўляць любоў да прыгожага — музыкі, жывапісу, літаратуры, тут жа з-пад яе яшчэ маленькай рукі выйшлі першыя вершы. У васемнаццацігадовым узросце, у 1979 годзе, Алена пакінула Беларусь і пераехала ў Ленінград.

Спробы паступіць у Ленінградскае вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча імя Мухінай скончыліся няўдачай, пасля якой, аднак, Алену чакаў поспех — у 1981 годзе яна паступіла на дзённае аддзяленне факультэта журналістыкі ЛДУ. Пасля заканчэння універсітэта працавала карэспандэнтам шматтыражнай газеты, літаратурным рэдактарам часопіса. Дарэчы, літаратурным рэдагаваннем, толькі ўжо мастацкай літаратуры, Алена Жабінкоўская займаецца і сёння (выдавецтвы "Библия для всех", "Измерение", "Северо-запад", "Петрополь", "Культура"). У 1993 годзе ў Алены з'явілася магчымасць праявіць яшчэ і здольнасці мастака — яна дэбютавала як кніжны графік. На сённяшні дзень ёю праілюстравана больш за трыццаць кніг. Але ў першую чаргу Алена — *паэт*. Яркі, цікавы, неардынарны...

Першая публікацыя Алены з'явілася яшчэ ў 1989 годзе ў зборніку "Молодой Ленинград" пад псеўданімам Жабінкоўская, па назве малой радзімы. Потым былі яшчэ публікацыі вершаў і апавяданняў, удзелы ў канферэнцыях маладых літаратараў і як вынік — першы зборнік вершаў "Улитка-слеза" (1993). Затым — яшчэ адзін зборнік "Сердечная юдоль" (1998) і яшчэ — "Отсвет любви небес" (1999). У 2000 годзе Алена Жабінкоўская, ужо шматдзетная маці "паэтычных дзяцей", прынята ў Саюз пісьменнікаў Расіі.

А ў 2005 годзе — яшчэ адно "дзіця", такое непадобнае да папярэдніх, такое новае і нечаканае, такое адкрытае і асабістае — зборнік "Свет мой, зеркало". Менавіта за гэту кнігу Жабінкоўская была ўдастоена Царскасельскай мастацкай прэміі ў 2006 годзе, разам з актрысай Чулпан Хаматавай, акцёрам Сяргеем Мігіцка, паэтэсай Бэлай Ахмадулінай і іншымі.

"Свет мой, зеркало"... Так і хочацца прадоўжыць словамі "скажи да всю правду доложи". Але Алена Жабінкоўская не злая мачыха з казкі, якую турбуюць румянасць шчок ды белізна твару, яе клапоціць зусім іншае — тайна яе ўласнай душы. Чалавечая душа нібы крыжаванка з ключавым словам, адгадаць якое неймаверна складана, але на шляху да якога чалавек знаходзіць шмат цікавых дапаможных адказаў. Адказаў на тое, хто ён ёсць і з чаго складаецца... Часам яны атрымліваюцца нечаканымі і невытлумачальнымі, кшталту таго, што ў адной душы ўжываюцца "огонь и лёд", страшнымі (*Я совсем озверела, / так волки голодные рыщут./ Я готова пойти на убийство / за ласковый взгляд*), прасвятляючымі (*Не так жила, не тем была горда, / Но время усмиряет души наши*), але ўсе яны без выключэння — патрэбныя для разумення свайго "я".

"Свет мой, зеркало" — гэта не проста зборнік вершаў, а лірычны дзённік паэтэсы. *Это никакая не поэзия. / Это просто душу я порезала,/ И теперь из раны кровь течет*, — піша пра сваю творчасць Алена. Мабыць, таму яе вершы такія шчырыя, адкрытыя і, у большасці, сумныя (*Привычней проливать потоки слез, / Чем радоваться жизни — без кавычек. / Сломался в сердце маленький насос / Веселья, он фырчит, но не фурычит*).

У "люстэрку" Жабінкоўскай жыццё, аказваецца, — шахматная гульня са складанымі правіламі, а свет — апельсін, падзелены на часткі, які не так проста з'есці... Зноў расчараванні, душэўныя раны і "*сердце как поляна выжжено с прошлогоднею травой*"... Зноў — сумненні: (*О Господи, Ты милостив и свят, / Так не томи, ответь мне: почему / Ищу в себе Тобой зажженный свет, / А нахожу сомненья, ложь и тьму*...). У пэўныя ж моманты жыццё здаецца поўным цяпла, святла і кахання, каштоўнасцю, якую зусім не хочацца губляць (*Словно воск на огне, жизнь все меньше становится, тает, / Но зато каждым днем — и дождливым, и ярким / Я любуюсь, как неоценимым подарком. / Я пишу, и пеку пироги, и гостей принимаю... Жизнь прекрасна — теперь-то уж я понимаю!*).

Якія рознакаляровыя пачуцці! Тут вера і нявера, радасць і расчараванне, любоў і нянавісць, крыўда і дараванне, пачуццё страты і здабыцця... Як на палітры жывапісца змяшчаюцца дзесяткі колераў, так і ў зборніку Жабінкоўскай "жывуць" дзесяткі, сотні пачуццяў і перажыванняў...

Людміла МІНКЕВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта

Аляксей ЧУБАТ. Нарадзіўся ў 1979 годзе ў Вілейцы. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ (аддзяленне піяру). Вывучаў эканоміку і кіраванне вытворчасцю ў БДЭУ. Працаваў журналістам у газеце "Мінская праўда", часопісе "Дырэктар", упраўленні інфармацыі ААБ "Беларусбанк". У 2004 годзе заснаваў з паплечнікамі першы ў Беларусі PR-партал APRэль, на базе якога было створана аднайменнае PR-агенцтва.

Першы верш надрукаваў у 1996 годзе. Меў публікацыі ў часопісах "Першацвет", "Маладосць", "Крыніца", у газетах "ЛіМ" і "Голас Радзімы". Адзін з аўтараў калектыўнага зборніка "12+1". Заяўляўся і як празаік у газеце "Звязда".

Толькі што пабачыў свет яго першы паэтычны зборнік "ГЛІНЯНЫ ЧАЛАВЕК" (выд-ва "Галіяфы", прадмова А. Вярцінскага, рэдактар Н. Кучмель, 75 стар., 500 асоб.)

"Усе вершы, якія я мог напісаць, але прыдушыў у сабе з-за недахопу здольнасцей ці з-за любові да прозы, раптам заяўляюць свае правы на жыццё, выплюхваюць сваю незадаволенасць і накрываюць мяне з галавою".

Эміль ЧАРАН

Часцей за ўсё людзі ў літаратуры запамінаюцца сваімі неардынарнымі паводзінамі і творчай манерай... Так у мяне было з Разанавым, з Асташонкам, з Сысам, з Глобусам, з Дубаўцом, з Федарэнкам, з Купрэевым... Запомніўся мне сярод шматлікай чарады маладых літаратараў, што калісьці наведвалі рэдакцыю часопіса "Крыніца", і пачынаючы паэт Аляксей Чубат. Нешта ў яго вершах было не зусім так, як у іншых, ды і ў самім характары паэта зрэдчас праяўлялася штосьці няўлоўнае, што нярэдка прадвызначае рысы будучай выбітнай асобы... Што? Ды вось хоць бы такія пасажы пра свайго лепшага сябра ў вершы, які ўключаны і ў гэты яго першы паэтычны зборнік:

...Бэйбусы дурнаватыя,
Рагочам,
хоць бы хто рот залатаў.
Не сварыліся ж ніколі —
Вось дзіва!
Разам не плакалі.

Праўда ж, ёсць у гэтых нязмушаных радках (асабліва ў апошнім) не па гадах мудрая прастата (а на той час паэту было каля дваццаці) і няма гэтага сённяшняга рафінавана-рыфмаванага "ляля"...

Больш за тое, пасля такіх "прамаўленняў" пранікаешся даверам да аўтара і чаканнем паэтычнай навізны. Асабліва прачытаўшы непадалёк і гэткія радкі з намёкам на аўтапартрэтнасць:

Я набраў атраманту ў лёгкія —
Рознага колеру:
Сіні, жоўты, чырвоны —
Я мастак-лесавік,
Я пакінуў поле даўно —
Сын яцвягаў, унук Перуна —
Малюю іконы.

Таеміцца ў гэтых словах нейкая паганская магія і рублёва-шагалаўская зачараванасць. Цікава, што ўрэшце пераважыць...

Аўтар прадмовы да яго зборніка Анатоль Вярцінскі — таксама творца з разраду нешараговых, знакавых (нездарма ў яго і верш і нават цэлая кніжка гэтак сімвалічна названыя — **"Чалавечы знак"**). Хоць чытаючы яго напісаную ў адметна-адмысловым стылі прадмову, адчуваеш недагаворанае шкадаванне аўтара рукапісу і як бы нават наўмыснае ("навыраст") завышэнне адвольнай адзнакі яго вершаванага плёну... Анатоль Ільіч, спасылаючыся на свой колішні мастацкі вопыт, кажа пра А. Чубата так: *"...вершы, за асобным выключэннем, адпавядаюць тым падыходам і крытэрыям, пра якія вышэй ішла гаворка і якім, прызнаюся, я застаюся верным і па сённяшні дзень. (...) ...адно з уражанняў, якое пакідаюць вершы Аляксея Чубата — тое, што мы маем справу з аўтарам-шукальнікам. Пра гэта, дарэчы, сведчыць і яго імкненне па-свойму інструментаваць фанетычна і інтанацыйна вершаваны радок, пазбягаць, у прыватнасці, банальнай, беднай рыфмы. Ён шукае новыя сугуччы..."* Праўда, зроблена кароткая і малазаўважная, але істотная агаворка: *"Хаця, дапускаю, і не ўсё ў іх бясспрэчнае"*.

Напраўду, спрэчнага і, шчыра скажам, недасканалага ў вершах маладога паэта хапае. Але не-не, ды пераважвае яго душэўная беларуская цэльнасць. На ёй, як на непахісным стрыжні альбо ствале дрэва, трывала і надзейна трымаецца зялёна-шумная крона ўсёй гэтай паэтычнай кніжкі.



"Малая радзіма", —
гаворым;
Ды толькі чамусьці яна
Займае большую частку
Нашага сэрца.

Просты чалавек, звычайная зямная праца, традыцыйныя родавыя адносіны, якія ўкладваюцца ў вечнае жыццё і складаюць сутнасць **лю**дскага існавання... Менавіта з гэткага "матэрыялу" "выбудоўваецца" паэтычны зруб А. Чубата:

Пілавінне жалезнае горкай расце
На падлозе майстэрні;
Аб наждачны камень
ходзіць нож —
Чалавечыя рукі
спраўна працуюць;
Гэта справа святая,
Яна пачынае свет з ранку
і месяц саджае на неба;
Міхасёк —
ён дажыў да сівой галавы,
Да ўнукаў, ён на пенсіі, з жонкай
жыве і гадуе карову;
Ён заняты — ён точыць свой
нож кожны дзень.

У гэтым жа радзе ўзорны верш "Моц", пра зроблены яшчэ дзедам з ліпы *"стары аблуплены ложак" — "цэнтр жыцця", галоўны яго элемент"*... Але сустракаюцца, на першы погляд, і дзіўныя рэчы, як у вершы "Мінская тэлевежа":

Неба гэта — тваё і маё,
І такія ж плывуць аблокі,
І ў кожным ты зробіш раллю...

Карціна, недалёкая ад абсурду, але гэты *заземлены* намёк на раллю ў аблоках, пагадзіцеся, уражвае, бо зноў напамінае свету, што беларус будзе араць свой надзел і падняўшыся ў неба.

Даволі часта вяртаецца паэт да некаторых тэм, мабыць, палічыўшы іх незавершанымі, ці каб удакладніць яшчэ раз сваё стаўленне да іх, як тое здарылася з *каштанамі, трамваямі і элетрычкамі*... Агулам, тэма **шляху** (у тым ліку і творчага) вельмі часта ўзнікае ў вершах А. Чубата. (Тут і ўпомненыя ўжо электрычкі, цягнікі, трамваі, аўтобусы і простыя сцежкі-дарогі аўтара).

Добра памятаю яго *разанаўскі* верш у прозе "Гліняны чалавек", які ён некалі прапаноўваў часопісу "Крыніца", і вось гэты радок адтуль: *"Чалавек замыкае сабою сябе і стварае сябе, нібы гліна."* Зрэшты, спрабаваў сябе А. Чубат і як празаік, нават быў колькі гадоў таму лаўрэатам конкурсу на лепшае кароткае апавяданне ў газеце "Звязда". Што ж, і сам Пушкін выбачаўся за свой *"ненужный прозаизм"*, у Чубата ж ён увогуле закладзены ў яго творчай прыродзе і з'яўляецца асновай мастацкага бачання свету... Нездарма, відаць, і на вокладцы зборніка намаляваны два баксёры-сапернікі (гліняныя чалавекі: чалавек *зямны* і чалавек **вечны**) з адным пазнавальным аблічам... Пэўна, асновы дыялектыкі не лішнія і ў літаратурнай творчасці.

Трэба адзначыць, што ў маладога паэта добрая зрокавая памяць і яснае метафарычнае мысленне:

У Смалявічах пыляцца дошкі
Аж да Загор'я...
Гэй, чыгунка, павярніся ты шчэ
Да Балтыйскага мора!
Там салёныя людзі
Носяць каўшамі ваду,
І там салёная хваля
Змывае нуду.

Нярэдка ў яго звычайны сілабатанічны рыфмаваны верш раптам пераходзіць у белы альбо і ўвогуле ў верлібр... Прычым нярэдка — арганічна, як вось у гэтым выпадку...

Такі халодны дзень,
Зямля пад шкарлупой...
Давай з табой падзекаем
Насычана, па-свойму.

А такія вершы як "Футурыстычнае" і "Першае вымярэнне" даюць падставы для параўнання творчасці А. Чубата з карцінамі мастакоў-прымітывістаў (у холдынгу, памятаецца, выдавалася кніжка пра **інсітнае** мастацтва, і "ЛіМ" пра гэта пісаў). Але разам з тым адчуваецца і спроба пэўнага пераймання стылявой манеры Хармса і ранняга Забалоцкага ("Столбцы"):

Пры дзвярах механічных
Ахоўнік са стрэльбай
Глядзіць:
Баба доіць карову,
За пазухай Буда
Сядзіць.

Сустракаюцца вершы, выбудаваныя на алюзіях і рэмінісцэнцыях класічнай беларускай паэзіі... Аднак яны да твораў мастацтва, на жаль, не дацягваюць, хоць аўтар і намагаецца наблізіцца да падобных узораў, за што яму чытачом шмат чаго выбачаецца, як і мной вось у гэтым выпадку:

Цемната, агарнуўшы і шыю,
і плечы,
Стала колерам
вельмі насычаным.
Не стрымаць, не спыніць,
а смяяцца і бегчы
Сем стагоддзяў таму
і сёння увечары.

І ўсё ж чытаючы ёмкія радкі і нават строфы, як, скажам, у вершы "Ноч зімовая вэльмам зямлю ахінула...":

Абымшэлая кладка
змярцвела над плынню,
Спарахнелыя дошкі цалуе вада.
Ступіш крок
і сустрэнешся з воднаю сінню:
На ўспамін застанецца
толькі жуда —
непрыемна натыкацца поруч на
такія неадшліфаваныя словы і выразы, як "вэльмам" (замест "вэлюмам") і *"мацункавы клёк"* (што гэта такое?)... Нярэдкія выпадкі падобных хібаў і ў іншых вершах: *"белыя плямы кефіру на дарозе"*, *"**сярпянкай** няўлоўнай **кусок** цэлафану гуляе з сабакам"*, *"уверх галавою неслася твая душа"*, *"адпраўлю яго ў маршрут"*, *"лёцьма едзе машына па ворыве"*... Апошні няўдалы выраз, дарэчы, папярэджвае выдатная страфа:

Камбайнёры нажамі-брытвамі
Залатое бязмежжа дояць:
У паласу густую ўблытацца б
І плыць па ёй, непаголенай!

Ці не праўда, размова пра *ворыва* (на жніве!) мяне, вяскоўца па нараджэнні, дужа здзіўляе. Гэткая ж неспадзеўка для мяне, жыхара сталічнай хрушчоўкі, з'яўленне ў вершы "Просьба зруйнаванага дома" ліфта ў трохпавярхоўцы... Адчуваецца ў недасканаласці такіх вершаў спадзеў паэта на "авось", поўны давер апантанасці паэтычнага натхнення, калі радкі ў істоце выспяваюць самі па сабе, інстынктыўна, як бы падказаныя Звыш... да якіх ён пасля ўжо не вяртаецца... Таму натуральнасць і нязмушанасць яго паэзіі (пры яе душэўнай выпакутаванасці), пры такім творчым падыходзе ўсё ж застаецца не пазбаўленай каструбаватасці і версіфікацыйнага браку...

Ды як бы там ні было, але ў творчасці нярэдка перамагае натуральная *шурпатасць* душэўнай аўтарскай шчырасці:

Ўвалюся аб'інелы пад Каляды.
Дом зварухнецца
і лагодна крэкне,
Матуля вылеціць у калідор.
Абдымкі.
Бацька за руку патрэпле.
Гаворым.
На патэльні пыршча здор.

Прабачым паэту гэтае бацькоўскае *"трапленне рукі"*, бо, уласна кажучы, мяне як чытача найбольш уразіла і "канчаткова дабіла" (у добрым сэнсе) **пыршчэнне здору на патэльні**... Ужо і не прыпомню, у каго і як даўно я мог чытаць нешта падобнае? Гэта такі яркі, забытанечаканы, але характэрны вобраз яшчэ не так даўняга беларускага жыцця... Я з малалецтва страшна не любіў і гідзіўся ад гэтага свінога тлушчу, не пераносячы ўсе стравы, звязаныя са здорам, аднак і гэтым ён урэзаўся ў маю свядомасць і застанецца там да астатку маіх дзён...

І вось кніжка на зыходзе, і што як чытач і рэцэнзент магу сказаць я напрыканцы гэтай гаворкі вусцішна застыгламу ў чаканні прысуду аўтару, які напісаў нібы мне асабіста:

Ну не глядзі з тугой,
не маўчы!!!
Не апускай у магілу жывога —
Так невыносна!
Верыш?
Калісь паляцім удалячынь мы —
Толькі б нам крылы,
а гэта трывога
Будзе як коска.

Што ж, калі Аляксей Чубат напраўду чакае ад мяне нейкай крытычнай ацэнкі сваёй творчасці альбо павучальнага рэзюме, то я замест гэтага "адсылаю яму, як рэха" апошнія тры перафразаваныя радкі з вышэй працытаваных:

Верш? Калісьці паляціць
удалячынь і ён —
Толькі б крылы яму,
а гэта трывога
Будзе як коска.

ЛеГАЛ

Літ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЕДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19
Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73
Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у Інтэрнеце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3387
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 10.12.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 6800

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686